Сямейная газета



## Вяселле з выкраданнем… жаніха!

**ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**18 кастрычніка 2013 года ў 10.00** у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 9) адбудзецца **пасяджэнне трэцяй сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання**.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Зыгмунд ВАЛЕВАЧ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па нацыянальнай бяспецы:**

***«Пераходзіць цалкам на прынцып камплектавання арміі па кантракце, як гэта вырашыла зрабіць Украіна, на маю думку, Беларусі не варта. Палавінны прынцып камплектавання — найбольш аптымальны. Утрымліваць цалкам кантрактную армію накладна. Кантрактніку, як афіцэру, трэба прадаставіць жыллё, годную зарплату. Калі Украіна сапраўды мае такія магчымасці, то хай пераходзіць. Але галоўнае пытанне — гэта нават не столькі фінансы, колькі менавіта падрыхтоўка рэзерву. Людзям трэба прайсці армію, каб авалодаць ваеннымі спецыяльнасцямі».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.10.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9170,00 | ▲ |
| Еўра | 12390,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 284,50 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1119,52 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 12° |
| Віцебск | + 10° |
| Гомель | + 12° |
| Гродна | + 12° |
| Магілёў | + 11° |
| Мінск | + 10° |

ISSN 1990 - 763X

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 КАСТРЫЧНІКА 2013 г. ЧАЦВЕР № 196 (27561) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Фота БЕЛТА.



# СТО ГАДОЎ. І ГЭТА ТОЛЬКІ ПАЧАТАК...

**Гэтымі днямі святкуе стагадовы юбілей адна з найстарэйшых беларускіх ВНУ — Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова.**

**За перыяд сваёй дзейнасці ВНУ падрыхтавала дзясяткі тысяч спецыялістаў, якія працуюць у розных сферах народнай гаспадаркі.**

■ Адкрый Беларусь!

# ВОЎЧЫН І ЯГО ВАКОЛІЦЫ

**Воўчын каля Брэста — радзіма апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, былая рэзідэнцыя яго маці Канстанцыі Чартарыйскай — атрымаў рэальную надзею на адраджэнне як культурны і турыстычны цэнтр.**

## Касцёл

Воўчынскі касцёл, галоўная тутэйшая славутасць, перажывае рэстаўрацыю. Тое, што названы помнік архітэктуры позняга барока хоць неяк захаваўся — наогул цуд. Не менш за тры дзясяцігоддзі тут знаходзіўся склад мінеральных угнаенняў і ядахімікатаў. Сцены папсаваліся, патрэскаліся, заплеснелі, але выстаялі. Відаць, продкі будавалі на вякі.



Галіна Качаноўская дэманструе рэшткі маёнтка.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Касцёл Святой Тройцы быў узведзены ў 1733 годзе князямі Чартарыйскімі. Праз некалькі дзясяткаў гадоў яны грунтоўна перабудавалі храм, і замест драўлянага касцёл стаў каменным, сцены якога стаяць і цяпер. Культавы будынак значна пацярпеў падчас апошняй вайны. Ну а пасля яго выкарыстання ў якасці склада пачаў актыўна разбурацца. Гадоў з дзесяць таму абрынуўся дах разам з гадзіннікавай вежай.

СТАР. 6

■ «Зялёная» гаспадарка

# ДЗЕ НАРАДЖАЮЦЦА ПАРКІ?

**...А таксама бездакорныя газоны і дэкаратыўныя хмызнякі, што ўпрыгожваюць ландшафт гарадскіх вуліц і прыватных падворкаў? Задацца гэтым пытаннем прымусіла восень, калі самы час «папоўніць рады» зялёных насаджэнняў. У бліжэйшы месяц толькі ў сталіцы высадзяць каля 7 тысяч дрэў і 3 тысячы хмызнякоў. Карэспандэнты «Звязды» з'ездзілі ў месца, дзе ўсе вышэйзгаданыя расліны «з'явіліся на свет», — унітарнае прадпрыемства «Броўкі Мінскзеленбуд». Там давялося пабачыць клёны ў кадках, даведацца, што такое скумпія, а яшчэ — «сустрэцца» з лебедзямі і ласямі ў... пункце продажу дэкаратыўных дрэў і хмызнякоў.**

СТАР. 3



Хутка гэтыя клёны ў кадках «пераедуць» на сталічныя вуліцы.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК ПАВІННА ПРАЦАВАЦЬ НА ПАВЫШЭННЕ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ЭКАНОМІКІ

**Аб гэтым у час пасядження Прэзідыума НАН, прысвечанага назначэнню на пасаду старшыні Прэзідыума НАН Уладзіміра Гусакова, заявіў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Андрэй Кабякоў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Фота БЕЛТА.

«Прэзідэнт пасля жнівеньскай нарады вызначыў, што да 1 лістапада 2013 года павінна быць распрацавана праграма развіцця Нацыянальнай акадэміі навук. Засталося роўна паўмесяца. Я ўпэўнены, што распрацоўка гэтай праграмы пачалася адразу ж пасля нарады ў кіраўніка дзяржавы, таму мы разлічваем, што праграма будзе гатова ў тэрмін, таму што Адміністрацыя кіраўніка дзяржавы плануе ўнесці ў графік Прэзідэнта правядзенне агульнага сходу Нацыянальнай акадэміі навук, каб гэту праграму абмеркаваць на агульным сходзе, а пасля зацвердзіць яе. І гэта будзе ўжо ваша пуцяводная зорка, праграма дзеянняў па развіцці і ўдасканаленні навуковай сферы ў краіне», — сказаў Андрэй Кабякоў, звяртаючыся да Уладзіміра Гусакова.

Ён павіншаваў Уладзіміра Гусакова з назначэннем на пасаду старшыні Прэзідыума НАН і пажадаў яму доўгай прысутнасці на ёй, паколькі, як адзначыў Андрэй Кабякоў, «гэта адна з пасад, працягласць знаходжання на якой сазейнічае адпаведным дасягненням».

У сваю чаргу Уладзімір Гусакоў падзякаваў кіраўніку дзяржавы за аказаны давер і праінфармаваў кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта аб тым, што актыўная работа над праграмай вядзецца: «Да 1 лістапада яна будзе на стале ў Адміністрацыі, а ў бліжэйшыя дні мы вынесем яе на разгляд Савета Міністраў».

Прэзідэнтам перад НАН пастаўлены задачы па павышэнні эфектыўнасці, інтэграванасці ў эканоміку, што мусяць павялічыць запатрабаванасць навуковых распрацовак, якія павінны даваць краіне рэальны эканамічны эфект. Неабходна таксама ўмацоўваць сувязі навукі з вытворчасцю. «Гэта павінна праяўляцца ў выбудоўванні тэхналагічных ланцужкоў ад фундаментальных, у тым ліку прыкладных, даследаванняў да практычных вынікаў і выхаду на шырокую вытворчасць», — сказаў Уладзімір Гусакоў.

У сувязі з гэтым НАН патрэбна арганізацыйнае ўдасканаленне, паляпшэнне кадравага патэнцыялу. Размова ідзе аб амаладжэнні кадраў, павышэнні матывацыі працы. Паводле слоў Уладзіміра Гусакова, усе гэтыя пераўтварэнні павінны павысіць эфектыўнасць функцыянавання эканомікі.

Аляксандр РАДЗЬКОЎ:

# «СУПРАЦОЎНІК МІЛІЦЫІ ПРАДСТАЎЛЯЕ ЎЛАДУ»

**Супрацоўнікі органаў унутраных спраў павінны паводзіць сябе так, каб быць прыкладам для насельніцтва. Аб гэтым учора заявіў журналістам першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Радзькоў, размаўляючы з журналістамі перад сустрэчай з начальнікамі розных тэрытарыяльных падраздзяленняў МУС, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Прадстаўнік міліцыі — гэта заўсёды адзін з самых непасрэдных і аўтарытэтных ідэолагаў, таму што ён прадстаўляе ўладу», — адзначыў Аляксандр Радзькоў. Ён станоўча ацаніў забарону на курэнне ў грамадскім месцы для супрацоўнікаў міліцыі. У дадатак да гэтага міліцыянер павінен быць яшчэ прыкладам паводзін на дарогах і ў быце.

Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта лічыць, што міліцыянеры павінны выкарыстоўваць розныя формы стасункаў з насельніцтвам, у тым ліку праз інтэрнэт. Аднак нельга забываць і пра непасрэдныя сустрэчы з людзьмі. «Прадстаўнік улады прыходзіць, напрыклад участковы, і чалавек бачыць па яго вачах, інтанацыі, ці верыць ён сам у тое, што гаворыць. Гэта вельмі важна, таму што прадстаўнікам міліцыі даводзіцца размаўляць з рознымі людзьмі: ад прафесара да крымінальнага элемента. Безумоўна, у супрацоўніка павінна быць высокая культура і падрыхтоўка», — сказаў Аляксандр Радзькоў.

«Калі міліцыянер паказвае прыклад паводзін і яго паважаюць, то гэта спрацоўвае. Я сам з міліцэйскай сям'і. У мяне бацька служыў участковым. Помню, наколькі ён быў аўтарытэтны ў пасёлку. Ён сабой прадстаўляў уладу», — прадоўжыў Аляксандр Радзькоў.

Акрамя таго, ён нагадаў аб такіх новых выкліках, як кіберзлачынствы, раскрыццё якіх патрабуе высокай інтэлектуальнай падрыхтоўкі.

У сваю чаргу намеснік міністра ўнутраных спраў па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні Аляксандр Кобрусеў паведаміў, што на базе Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў МУС ужо на працягу некалькіх дзён праходзіць вучэбна-метадычны збор для начальнікаў тэрытарыяльных падраздзяленняў міліцыі, а таксама аддзелаў унутраных спраў на транспарце і ўпраўлення ўнутраных спраў па ахове Мінскага метрапалітэна. Праводзяцца сустрэчы з кіраўніцтвам МУС. Для ўдзельнікаў збору распрацавана культурная праграма. Яны наведваюць музеі, больш пазнаюць пра важнейшыя для Беларусі гістарычныя падзеі.

## Ва ўрадзе

# ПРАГРАМУ ЖЫЛЛЁВАГА БУДАЎНІЦТВА — ПАД ЖОРСТКІ КАНТРОЛЬ

**Урад Беларусі крытыкаваў выкананне праграмы жыллёвага будаўніцтва на 2013 год. Ход яе выканання быў разгледжаны ўчора на пасяджэнні Прэзідыума Савета Міністраў, перадае БЕЛТА.**

Як было далажана прэм'ер-міністру Міхаілу Мясніковічу, за 8 месяцаў гэтага года ў рэспубліцы ўведзена ў эксплуатацыю 3 млн 151,7 тыс. кв.м агульнай плошчы жылых дамоў, што складае 48,5 працэнта ад гадавога задання. Найбольш нізкія паказчыкі маюць Віцебская і Гомельская вобласці, якімі даведзенае заданне выканана толькі на 29,6 працэнта і 35,7 працэнта адпаведна. Па выніках дзевяці месяцаў выкананне задання прагназуецца толькі ў Мінскай вобласці. Усяго ж чаканы ўвод за студзень-верасень складае 3 млн 954 тыс. кв.м, або 60,8 працэнта.

Згодна з пастановай Савета Міністраў № 1023 ад 6 лістапада 2012 года «Аб мерах па выкананні заданняў на 2013 год па будаўніцтве жылых дамоў» аблвыканкамам і Мінскаму гарадскому выканаўчаму камітэту даведзена заданне па ўводзе ў эксплуатацыю агульнай плошчы жылля ў аб'ёме 6,5 млн кв.м. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і ажыццяўляюць будаўніцтва жылля з дзяржаўнай падтрымкай, заданне па ўводзе ў эксплуатацыю жылля складае 2 млн 500 тыс. кв.м.

Як адзначыў намеснік міністра будаўніцтва і архітэктуры Сяргей Ластачкін, па даручэнні прэм'ер-міністра на мінулым тыдні аб'ектыўнасць інфармацыі аблвыканкамаў у рэгіёнах правяралі рабочыя групы. Таксама імі былі адпрацаваны пытанні верагоднасці ўводу жылых дамоў і праведзена ацэнка іх гатоўнасці.

Згодна з данымі праведзенага маніторынгу, адзначыў намеснік міністра, за кастрычнік-снежань гэтага года чакаецца ўвод у эксплуатацыю 1 млн 312,3 тыс. кв.м жылля. За 2013 год, паводле даных рабочых груп, чакаецца ўвод у эксплуатацыю агульнай плошчы ў аб'ёме 5 млн 59,9 тыс. кв.м, або 77,8 працэнта гадавога задання.

На пасяджэнні Прэзідыума таксама былі разгледжаны пытанні фінансавання будаўніцтва жылых дамоў і аб'ектаў інжынернай і транспартнай інфраструктуры да іх. Як падкрэсліў Сяргей Ластачкін, «агульная сітуацыя паказвае, што для забеспячэння выканання запланаваных да ўводу ў эксплуатацыю жылых дамоў неабходна ў самы кароткі тэрмін забяспечыць планавае фінансаванне аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва 2013 года, а таксама аб'ектаў, якія пераходзяць на наступны год з мэтай выканання задання па жыллёвым будаўніцтве 2014 года».

Па выніках пасяджэння адзначана недастатковая работа аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама па асваенні планавых аб'ёмаў ільготных крэдытных рэсурсаў, прадугледжаных графікамі фінансавання будаўніцтва (рэканструкцыі) жылых дамоў, зацверджаных прэм'ер-міністрам. Асобна крытыкавалася работа Віцебскага і Гомельскага аблвыканкамаў па выкананні праграмы жыллёвага будаўніцтва.

Прэм'ер-міністр даручыў Міністэрству фінансаў, Мінэканомікі, а таксама Мінбудархітэктуры распрацаваць праект праграмы жыллёвага будаўніцтва на 2014 год.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ: НІ КРОКУ НАЗАД, НІ КРОКУ НАПЕРАД...

**Стаўку рэфінансавання захаваюць на ўзроўні 23,5% гадавых і ў кастрычніку. Рашэнне аб гэтым было прынята на чарговым пасяджэнні праўлення Нацыянальнага банка.**

«Бягучы ўзровень стаўкі рэфінансавання адпавядае антыінфляцыйнай накіраванасці грашова-крэдытнай палітыкі, — каментуюць рашэнне ў Нацбанку. — Нягледзячы на паскарэнне інфляцыі ў верасні да 1,7%, прырост спажывецкіх коштаў, які выключае змяненні цэн на асобныя тавары і паслугі, што рэгулююцца дзяржавай, а таксама на тавары сезоннага характару (базавай інфляцыі), склаў 0,6%». Далейшая дынаміка стаўкі рэфінансавання будзе вызначацца, зыходзячы з сітуацыі ў эканоміцы і грашова-крэдытнай сферы.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

## ЗАЛАТЫ МЕДАЛЬ ВЕТЭРАНА

**Трэнер віцебскай дзяржаўнай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы № 3 Анатоль Дамашнёў заваяваў залаты медаль на чэмпіянаце свету па грэка-рымскай барацьбе сярод ветэранаў. Чэмпіянат праходзіў у Босніі і Герцагавіне.**

Анатоль Іванавіч прадстаўляў нашу краіну ў вагавой катэгорыі да 63-х кілаграмаў. У фінале турніру ён спачатку атрымаў перамогу над чэмпіёнам мінулага года з Венгрыі, а потым — над прадстаўніком Украіны.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

## МАНІТОРЫНГ БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

**Колькасць шматкватэрных жылых дамоў, якія не былі здадзены ў эксплуатацыю ў нарматыўныя тэрміны, змяншаецца, паведамілі ў прэсслужбе Камітэта дзяржкантролю Гомельскай вобласці, але ж не так хутка, як хацелася б.**

На пачатак кастрычніка такіх дамоў на Гомельшчыне застаецца 36. Большасць з іх не ўведзены ў верасні з-за невыканання графікаў фінансавання і невыканання падраднымі арганізацыямі сваіх абавязкаў па будаўніцтве, пастаўцы будматэрыялаў. Работы па ўнутранай апрацоўцы 28-кватэрнага дома ў вёсцы Улукаўе Гомельскага раёна працягваюцца пасля заканчэння вызначанага тэрміна ўводу ў эксплуатацыю.

Камітэт дзяржкантролю вобласці прапанаваў Гомельскаму аблвыканкаму прыняць захады, каб ліквідаваць недахопы і здаць у эксплуатацыю жылыя дамы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

## ЗАГІНУЛА ШМАТ РЫБЫ...

**Факт гібелі рыбы на вадаёме ў вёсцы Раванічы Чэрвеньскага раёна зафіксавалі работнікі Бярэзінскай міжрайінспекцыі. Падчас агляду было знойдзена амаль 4,5 тысячы асобін сярэбранага карася.**

На месцы дзяржінспектары ўстанавілі, што на размешчанай паблізу каналізацыйнай помпавай станцыі выйшла са строю помпа, сцёкі выцякаюць на зямлю і па натуральным схіле трапляюць у вадаём. Мяркуецца, што гібель рыбы адбылася з-за павышэння колькасці ў вадзе арганічных рэчываў. Для правядзення экспертызы ўзялі пробы вады. Як удакладнілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, навакольнаму асяроддзю нанесена шкода ў памеры 115 мільёнаў рублёў.

У гэты ж дзень факт гібелі рыбы на возеры Глубокім у вёсцы Галошава Талачынскага раёна зафіксавалі і работнікі Аршанскай міжрайінспекцыі. Зона пашкоджання акваторыі склала больш за 50 гектараў. Вада мела цёмна-шэры колер і нулявую празрыстасць. Назіралася вялікая колькасць мёртвай рыбы. На заездзе бетоннай прыстані возера меліся сляды пратэктараў трактара. Мяркуецца, што гібель рыбы абумоўлена трапляннем у ваду невядомага забруджвальнага рэчыва.

Сяргей РАСОЛЬКА.

## ПАЧАЎСЯ СУД НАД ЭКС-КІРАЎНІКОМ БУДАЎНІЧАЙ ФІРМЫ «АБЛІЧЧА»

**Калегія Брэсцкага абласнога суда прыступіла да разгляду справы ў дачыненні да былога гендырэктара брэсцкага прадпрыемства «Абліччa» Мікалая Клімука.**

Пацярпелымі па справе прызнаны 435 грамадзян, удзельнікі долевага будаўніцтва, якім прычынены ўрон на агульную суму 60 мільярдаў 685 мільёнаў рублёў. Экс-кіраўнік фірмы абвінавачваецца ў злоўжыванні ўладай і службовым становішчам, выкраданні грашовых сродкаў, незаконным прысваенні дывідэндаў кампаніі, а таксама ва ўхіленні ад пагашэння крэдытнай запазычанасці.

Следства праводзіла галоўнае ўпраўленне па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Следчага камітэта РБ. Матэрыялы справы налічваюць 113 тамоў. З мая мінулага года М. Клімук знаходзіцца пад вартай. Чакаецца, што прысуд можа быць вынесены не раней за канец лістапада.

Яна СВЕТАВА.

■ Здаровыя прысмакі

# ЗЕФІР
## па тэхналогіі паскоранага тыпу

**Ці ведаеце вы, што дзве палавінкі зефіру «склейваюцца» ў адну прыгожую форму толькі ўручную? Чалавецтва не вынайшла такой машыны, якая б ашчадна магла справіцца з падобнай задачай! Так што, калі ў наступны раз будзеце ўжываць зефір, памятайце, што гэта часткова вынік ручной работы.**

Больш за 140 гадоў у нашай краіне, на прадпрыемстве, якое сёння называецца адкрытае акцыянернае таварыства «Чырвоны харчавік», выпускаецца зефір — ласунак з ліку самых каштоўных. Завод выпускае некалькі відаў прадукцыі — мармелад, халву, ірыс, дражэ, цукеркі з пасціла-мармеладнымі начынкамі, аднак зефір, што называецца, усяму галава. Бо ён не звычайная смаката, а карысная! Да таго ж даступная любому. Нездарма мадэрнізацыю вытворчасці на «Чырвоным харчавіку» пачалі менавіта з устаноўкі новай лініі для вырабу зефіру.

— Зефір у нашай краіне вырабляе літаральна пара вытворцаў, аднак у Расіі і ва Украіне рынкі проста перанасычаны падобнай прадукцыяй, — кажа **дырэктар ААТ «Чырвоны харчавік» Мікалай ЧЫСЛОЎ**. — Але, блізказамежны зефір і зефір нашага «Харчавіка», як той казаў, дзве вялікія розніцы. Наш усё яшчэ застаецца цалкам натуральным прадуктам, тэхналогія вырабу якога не мянялася, бадай, з канца 1920-х — пачатку 1930-х гадоў. У нашым прадукце — не менш за 30 працэнтаў яблычнага пюрэ. Пекцін, агар і жэлацін набываюцца ў лепшых вытворцаў.

Літаральна з 3 мая гэтага года ў продаж пачаў паступаць зефір пад новай гандлёвай маркай «Лефірелль». Ён выраблены на новай лініі, па тэхналогіі паскоранага тыпу — да дзвюх гадзін замест «класічных» трох сутак. Яблычнага пюрэ тут — да 20 працэнтаў, а наогул рэцэптура фактычна тая самая. Усё тыя ж цукар, яечны бялок, кіслата лімонная, патака, натуральныя араматызатары і фарбавальнікі. Да канца года ў продажы можна будзе сустрэць не толькі «Лефірелль» ванільны, бела-ружовы, са смакам вяршкоў, але і са смакам капучына і арэхавага крэму.

Для вырабу ўсіх відаў зефіру прадпрыемства выкарыстоўвае цукар, яечны бялок, лімонную кіслату, яблычнае пюрэ, патаку беларускіх вытворцаў. Хоць яечны бялок і патаку даводзіцца яшчэ і завозіць, паколькі іх недастаткова для патрэб «Чырвонага харчавіка». Пекцін, жэлацін, агар завозяцца цалкам. Усё гэта адпавядае той якасці, каб у выніку атрымаць прадукт паводле дзяржаўнага стандарту.

На наступны год на «Чырвоным харчавіку» запланавана мадэрнізацыя лініі па вытворчасці жэлейных і жуйных мармеладаў. На 2015-2016 гады — лініі мяккай карамелі і яшчэ адной лініі для вырабу зефіру па тэхналогіі паскоранага тыпу.

У зефіры мала калорый. А адзін з яго «складнікаў» — пекцін — дапамагае арганізму зніжаць узровень артэрыяльнага ціску, халестэрыну і нават змяншае рызыку захварэць на рак. Гэты прадукт падыходзіць і дзецям, і дарослым, паколькі стымулюе разумовую дзейнасць.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ

## Пра халву і кадмій

Сёння ў гандлі можна сустрэць халву айчынных, расійскіх і ўкраінскіх вытворцаў. Спецыялісты звяртаюць увагу аматараў гэтага ласунку на вырабы менавіта айчыннай вытворчасці. Семачкі сланечніку, неабходныя для вырабу халвы, закупляюцца нашымі прадпрыемствамі ў той жа Расіі і абавязкова правяраюцца на адпаведнасць патрабаванням якасці і бяспекі. Паколькі вядома, што сланечнік і яго насенне даволі актыўна назапашваюць такі цяжкі метал, як кадмій, то менавіта колькасць гэтага элемента табліцы Мендзялеева правяраецца ў першую чаргу. Такія праверкі ажыццяўляюць і непасрэдна ва Украіне і ў Расіі, аднак там вынікі аналізаў кадмію ў насенні адрозніваюцца ад беларускіх патрабаванняў у бок больш высокіх допушчальных лічбаў. А значыць, у падобнай прадукцыі ўкраінскай ці расійскай вытворчасці можа быць больш кадмію, чым у прадукце беларускім.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

# ДЗЕ НАРАДЖАЮЦЦА ПАРКІ?

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

...Ехаць у вёску Броўкі, дзе і знаходзіцца гадавальнік дэкаратыўных раслін, — адно задавальненне. Праязджаеш Мінскае мора, любуешся кранутым восенню лісцем дрэў... Але яшчэ больш захапляешся, калі бачыш перад сабой... плантацыі туі ці пляцоўку, застаўленую маладымі клёнамі ў кадках.

— Нашы супрацоўнікі вырошчваюць усё з маленькіх чаранкоў і насення. У год мы прадаём да 60—80 тысяч дрэў — расказвае дырэктар Андрэй Мінкевіч. — На тэрыторыі прадпрыемства ёсць дарослыя расліны, ад якіх і «вядуць свой род» усе тыя дрэвы і хмызнякі, што ідуць на азеляненне горада і на продаж. Можна быць упэўненым: кожны саджанец ад першага свайго дня прывыкае да нашага клімату і глебы. Гэта, дарэчы, вельмі важна.

Па словах Андрэя Мінкевіча, нават расліны, прывезеныя з суседняй Польшчы, не заўсёды могуць прыжыцца на беларускім участку. Неяк у Броўкі прыязджаў чалавек, што азеляніў даволі вялікую тэрыторыю такімі вось замежнымі хмызнякамі, а яны чамусьці расці «не захацелі». Вось і давялося набываць новыя, але ўжо ў Беларусі.

**Шлях будучага клёна ці ясеня, пад якім гадоў праз трыццаць будуць шукаць ценю наведвальнікі якога-небудзь гарадскога сквера, пачынаецца ў дэндрапарку. Так называецца месца, дзе бяруць чаранкі і збіраюць насенне для расады.**

Шлях будучага клёна ці ясеня, пад якім гадоў праз трыццаць будуць шукаць ценю наведвальнікі якога-небудзь гарадскога сквера, пачынаецца ў дэндрапарку. Так называецца месца, дзе бяруць чаранкі і збіраюць насенне для расады. Пасля матэрыял нясуць у невялічкія цяпліцы, у якіх ён высаджваецца і вырошчваецца да пэўнага часу. Дарэчы, каб «з нуля» выгадаваць саджанец дрэва, патрэбна прыкладна восем гадоў.

— Мы цяпер імкнёмся шмат вырошчваць і прадаваць раслін у кантэйнерах, — распавядае Андрэй Мінкевіч. — Гэта зручна і для пакупнікоў, і для «зялёнага тавару». Нават навагоднія елкі ў кантэйнерах вырошчваюць, а высаджваюць іх туды яшчэ па вясне.

...Мінуўшы пляцоўкі, дзе стаяць дрэвы ў кадках і цягнуцца даўгімі радамі маленькія парнічкі, трапляем на сапраўднае «саджанцавае поле». Тут у гэты час на выкапцы раслін працуе некалькі жанчын. Пачуўшы пра неабходнасць фатаграфавацца, яны сціпла адмаўляюцца. Маўляў, капалі, змучыліся... Пакуль наш фатограф настойліва рабіла сваю працу, я стала цікавіцца ў дырэктара прадпрыемства, ці не вырошчваюць тут раптам сярод звыклых нам клёнаў і ясеняў якой экзотыкі.

— Увогуле, шмат якія інтрадуцэнты (расліны, што выраслі за арэалам свайго натуральнага распаўсюджвання) цудоўна адчуваюць сябе ў Беларусі, — запэўніў Андрэй Мінкевіч. — Напрыклад, ёсць такая расліна, як скумпія — хмызняк з прыгожымі пухнатымі кветкамі. Нават я, калі пабачыў яе ў першы раз, быў вельмі ўражаны.

Што ж, інтрадуцэнты дык інтрадуцэнты! Шкада, што восень. Вось бы зараз паглядзець на квітнеючыя дэкаратыўныя хмызнякі...

...Пункт продажу, дзе за смешныя, у параўнанні з цэнамі на рынку, грошы можна набыць для свайго ўчастка новага «зялёнага жыхара», звонку ўяўляе сабой звычайную бетонную агароджу, але ўнутры ўсё па-іншаму. Каляровыя малюнкі на агароджы зрабіла Ірына Мацулевіч, якая працуе тут прадаўцом:

— Я раней у іншым месцы працавала, у рэанімацыі. Зараз вось «рэанімую» тут, — расказвае жанчына. — Адчуваю сябе цудоўна, сплю добра. А малявала я раней толькі дома, алоўкам на паперы. Калі прыйшла сюды, жахнулася, што прыйдзецца сядзець у голых сценах. Тады і папрасіла ў дырэктара дазволу крыху памаляваць, а то «страшнавата» неяк было.



**Гэта — дарослыя расліны, ад якіх і «вядуць свой род» усе тыя дрэвы і хмызнякі, што ідуць на азеляненне горада і на продаж.**

Так на агароджы з'явілася цэлая гісторыя: спачатку сажалка з лебедзямі і качкамі, пасля лось і ласіха з дзіцяткам, далей — сцены і брамы замкаў.

Крыху расказаўшы пра «мастацтва», Ірына пачынае распавядаць нам і пра расліны:

— Тыя, што ў кантэйнерах, зразумела, даражэйшыя. Танней набываць, як кажуць, «з прыкопу», калі расліну выкопваюць з зямлі і адразу будуць перасаджваць у іншае месца. Дарэчы, дрэва ў кадцы можна купіць і проста паставіць на ўчастку, — гаворыць жанчына.



**Прадавец Ірына Мацулевіч.**

Чым жа ў беларусаў зараз папулярна ўпрыгожваць паркі, скверы і ўласныя падворкі? Аказваецца, для гарадскіх пасадак найбольш часта замаўляюць ліпу, каштан ці ясень. А вось «прыватнікі» любяць не проста дрэва пасадзіць — хочуць, каб яно было незвычайным. Зараз у ландшафтным дызайне вельмі папулярныя так званыя прышчэпленыя дрэвы: клёны, бярозы, рабіны, ясені, вязы і інш. Многія, відаць, бачылі бярозкі, у якіх галінкі нібыта «прычасаныя» пад адзін капыл. Камель такога саджанца павінен дасягнуць пэўнай вышыні. Пасля, каб стварыць форму кроны, на камель прышчэпліваюць галінкі. Яны могуць расці ўніз ці патрэбным чынам нахіляцца.

Такія дрэвы, безумоўна, прыгожыя, але хмызнякі «здзівілі» больш. У Беларусі, аказваецца, надрэнна прыжываюцца экзэмпляры, якія, мяркуючы па выглядзе, павінны расці ў якім-небудзь Крыме. Разлапістыя, з яркімі кветкамі на галінках. Ірына Мацулевіч паказвае нам папку, па здымках у якой можна меркаваць пра будучую «квяцістасць» хмызняку, які зараз, восенню, сціпла зелянее ў кадцы... Вегела, дуброўка, барбарысы, дэйцыя, кветкі якой падобныя да званочкаў, брызгліна, спірэя чырвоналістая (яе лісты маюць такі колер не толькі восенню, а, уявіце, у цёплую пару года вырастаюць яшчэ і кветкі), бружмель, акацыя... Ну вельмі захацелася лета пасля размоў пра яркія кветкі.

...Трэба сказаць, што прадпрыемства «Броўкі Мінскзелянбуда» займаецца не толькі вырошчваннем дрэў і хмызнякоў. Саджанцы гадуюцца крыху больш чым на 400 гектарах, уся ж тэрыторыя — 1100 гектараў. Што робяць на астатняй плошчы? Вырошчваць рулонныя газоны і насенне траў.

...Едзем па звычайнай палявой дарозе. З нязвыклага для такога пейзажу — хіба што калонкі, да якіх падключаюць шлангі для паліву. Выходзім, а навокал... футбольнае поле. Прынамсі, такое адчуванне ўзнікае, калі бачыш перад сабой кіламетры зялёнай, кораценька пастрыжанай травы. У будучым з яе зробяць рулонны газон

— Гэтую траву мы пасадзілі не так даўно, а вось тыя ўзараныя палі, якія мы толькі што праехалі, у мінулым годзе «па частках» раскупілі на газоны. Яны апынуліся ў самых розных кутках горада і нават краіны, — распавядае дырэктар прадпрыемства Андрэй Мінкевіч.

Своеасаблівы «эксперымент» — нядаўна пасеяная трава пад назвай «палявіца»: падстрыгаць такі газон не патрэбна ўвогуле.

Травы на насенне — асобная справа. Іх гадуюць, убіраюць, а

**Выходзім, а навокал... футбольнае поле. Прынамсі, такое адчуванне ўзнікае, калі бачыш перад сабой кіламетры зялёнай, кораценька пастрыжанай травы.**

пасля фасуюць у пакеты і адпраўляюць на продаж. Сёлета, дарэчы, вельмі шмат прадалі ў Маскву. Насенне збіраецца вельмі падобна да таго, як збіраюць збожжа: «зярняты» прасейваюцца, сушацца, а пасля часова ссыпаюцца ў вялікія горы ў спецыяльных амбарах.

Падарожнічаць па такіх «футбольных палях» можна вельмі і вельмі доўга. Зелень у тандэме з прасторам і туманам, што скараціў далягляд прыкладна метраў да дзесяці, проста зачароўвае, і на імгненне нават можна забыцца, дзе ты знаходзішся: на беларускім лузе ці на англійскім полі для гольфа. Такія абставіны чамусьці спрыяюць успамінам. Прыгадваецца, напрыклад, малы хлопчык, што быў суседам у адным з дамоў, дзе давялося жыць. З нядаўна пасаджанага каля навабудоўлі тонкага дрэўца ён захацеў выламаць сабе прут. Мама нават не пярэчыла. Альбо вось яшчэ: цэлая алея маладых ліпак, якія невядомы «супергерой» зламаў колькі гадоў таму ў самым цэнтры Брэста. А нехта ж гадаваў гэтыя саджанцы з малюсенькага зярнятка...

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**
*Мінскі раён.*



**У гадавальніку дэкаратыўных раслін.**

# 20 МІЛЬЁНАЎ БЕЛАРУСАЎ: МАРА ДАСЯГАЛЬНАЯ

**У людзей майго пакалення пры адказе на пытанне аб колькасці насельніцтва Беларусі заўжды ў памяці ўсплываюць знаёмыя лічбы — 10 мільёнаў 300 тысяч чалавек, вядомыя яшчэ з курсу школьнай геаграфіі паводле перапісу 1989 года.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## Менш на два абласныя цэнтры

У пабытавых размовах беларусы таксама прызвычаіліся казаць: «Нас 10 мільёнаў». Насамрэч гэтыя даныя даўно не адпавядаюць рэчаіснасці, а пытанне дэмаграфічнай бяспекі ў наш час стаіць надзвычай востра. Рэальная колькасць насельніцтва Беларусі зараз складае 9 мільёнаў 461,5 тысячы чалавек, гэта значыць, за апошнія 25 гадоў беларусаў стала менш на 800 тысяч. Гэта больш, чым два Віцебскі.

Між тым, тэрытарыяльныя магчымасці рэспублікі, патэнцыял сельскагаспадарчага і прамысловага комплексу патрабуюць, каб на тэрыторыі Беларусі пражывала не менш за 20 мільёнаў чалавек. Толькі ў гэтым выпадку сучасная эканамічная мадэль будзе здольная захаваць сваю сацыяльную скіраванасць і забяспечыць яксны рост вытворчасці. У адваротнай сітуацыі беларускі ўрад ужо бліжэйшым часам будзе вымушаны пайсці на такія непапулярныя меры, як запрашэнне працоўных мігрантаў з краін Цэнтральнай Азіі ды павелічэнне парогу працоўнага ўзросту за кошт пенсіянераў.

Дарэчы ўжо зараз Беларусь сутыкаецца з праблемай недахопу працоўных рук у прамысловасці, а сістэма сярэдняй спецыяльнай прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі перажывае перыяд павольнай дэградацыі. Напрыклад, за апошнія 7 гадоў колькасць абітурыентаў, абраўшых установы прафесіянальна-тэхнічнай адукацыі, зменшылася амаль на 35%. Паказальна, што на 10 тысяч чалавек насельніцтва Беларусі прыходзіцца ўсяго 161 навучэнец тэхнікумаў, вучылішчаў і каледжаў, у той час як колькасць студэнтаў ВНУ складае аж 453 чалавекі. Вядома, што побач з дэмаграфічным складнікам важную ролю тут адыгрывае таксама развіццё спажывецкай культуры, калі рост заробкаў і ўзроўню жыцця насельніцтва адпаведным чынам адбіваецца на спецыфіцы сацыяльных паводзін асобы. Так, бацькі-рабочыя робяць усё магчымае дзеля таго, каб уладкаваць уласнае дзіця ў ВНУ з выбарам спецыяльнасці, не звязанай з фізічнай працай, а праца на прамысловасці ці ў сельскай гаспадарцы выглядае сацыяльна непрэстыжнай сярод беларускай моладзі.

**Спецыялісты ў галіне дэмаграфічнай бяспекі нават пачалі казаць, што Беларусь пакрысе выходзіць з дэмаграфічнай катастрофы, у якой наш народ апынуўся падчас 90-х гадоў мінулага стагоддзя.**

Гэтак жа на другі план адыходзяць каштоўнасці сям'і і мацярынства. Традыцыйна кансерватыўныя ў пытаннях сям'і і шлюбу беларусы паступова мяняюць свае жыццёвыя ўстаноўкі на сумнеўныя каштоўнасці індывідуалісцка-эгаістычнага кшталту, калі галоўнай мэтай жыцця становіцца дасягненне ўласнага камфорту. Пры гэтым асаблівa прыкра, калі пад дахам падобнай самарэалізацыі чалавека насамрэч адбываецца духоўная дэградацыя асобы, а разуменне камфорту зводзіцца да прымітыўнага лозунга «Бяры ад жыцця ўсё!», што часта прыводзіць як да занепаду інстытуту сям'і ў грамадстве, так і да фактычнай сацыяльнай гібелі асобных грамадзян, люмпенізацыі часткі айчыннай моладзі.

## Сумная статыстыка

Напрыклад, на 100 родаў у нашай краіне адбываецца 29,5 выпадку абортаў, гэта значыць, як слушна заўважае спецыяліст кансерватыўнага цэнтра NOMOS Любоў Баркун, «амаль кожны трэці зачаты чалавек будзе забіты». Гэтаксама даволі сумна выглядае і статыстыка суадносін шлюбаў і разводаў: у 2012 годзе разыціся пажадалі 39 тысяч пар, прытым на заключэння 1000 шлюбаў прыходзіцца ажно 512 разводаў.

Калі такую складаную сітуацыю дапоўніць негатыўнымі лічбамі, што сведчаць аб павелічэнні долі грамадзян з асацыяльным тыпам паводзін (нарканія, алкагалізм) у структуры беларускага грамадства, то забеспячэнне дэмаграфічнай бяспекі ўвогуле становіцца найважнейшым пытаннем не толькі далейшага развіцця, але і выжывання беларускай нацыі. У якасці практычнай ілюстрацыі няпростага становішча, адзначым, што колькасць нарказалежных павялічылася за апошнія 25 гадоў у 23 разы па Беларусі, а ў горадзе Мінску — у 56 разоў. На афіцыйным уліку знаходзіцца каля 14 тысяч наркаманаў, аднак сусветныя практыкі з улікам паказчыкаў латэнтнасці кажуць, што такую лічбу трэба памнажаць прыкладна на 10. Гэта значыць, колькасць беларускіх наркаспажыўцоў складае каля 140-150 тысяч чалавек — менавіта такімі лічбамі карыстаюцца ў сваіх ацэнках МУС і Генеральная пракуратура. Калі ўлічваць, што сацыяльны партрэт беларускага нарказалежнага — гэта ін'екцыйны наркаман: маладыя нежанаты беспрацоўны мужчына 20-35 гадоў, а працягласць жыцця пастаяннага спажыўца наркотыку опійнай групы — 5-7 гадоў, то і яшчэ адзін з аспектаў дэмаграфічнай ямы, у якой апынулася Беларусь, становіцца цалкам зразумелым.

Яшчэ больш складаная сітуацыя склалася з пытаннямі алкагалізму. Згодна з інфармацыяй Міністэрства аховы здароўя, на ўліку ў сувязі са злоўжываннем алкаголем знаходзіцца каля 270 тысяч чалавек, пры гэтым 180 тысяч маюць дыягназ «хранічны алкагалізм». Аднак многія эксперты лічаць, што і гэтая лічба далёка не поўная, а рэальная колькасць алкаголікаў дасягае 500 тысяч чалавек. Вельмі непрыемны тэндэнцыяй бачыцца таксама той факт, што алкагалізацыя ахоплівае ўсё больш шырокія колы грамадства. Падлеткавы і жаночы алкагалізм больш не з'яўляюцца незвычайнай з'явай. Згодна з данымі Белстата, толькі за апошнія 5 гадоў колькасць зарэгістраваных алкаголікаў-жанчын вырасла на 37%.Такі рост праяў алкагалізацыі прама адпаведны статыстыцы гандлю спіртнымі напоямі: зараз на адну душу насельніцтва рэалізуецца прыкладна 12,5 літра чыстага спірту, пры гэтым яшчэ ў 1970 годзе такі паказчык складаў усяго 6,4 літра. Патрэбна адзначыць, што згодна з данымі Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, крытычная адзнака, пасля якой адбываюцца незваротныя дэмаграфічныя наступствы, — 8 літраў на душу насельніцтва.

## Ці ёсць у нас шанц?

Аднак, нават з улікам вышэйазначаных даных, шанц для Беларусі і яе народа не толькі выжыць і захавацца, але і развівацца, безумоўна, ёсць. Названыя лічбы, вядома, не надта аптымістычныя, аднак на статыстыку можна паглядзець і з іншага боку: напрыклад, яшчэ у 1995 годзе колькасць абортаў на 100 родаў складала 188 выпадкаў (а зараз 29), з 2008 года стаў назірацца рост колькасці нараджальнасці пры змяншэнні смяротнасці. Скажам, у студзені—ліпені гэтага года ў рэспубліцы нарадзілася 66,9 тысячы дзяцей, што больш на 2,5 тысячы за аналагічны перыяд 2012 года, значна знізілася дзіцячая смяротнасць і павялічылася колькасць паўторных родаў у жанчын.

Падобная сітуацыя з'яўляецца сведчаннем паспяховасці дзяржаўнай палітыкі па заахвочванні мацярынства і падтрымцы інстытута сям'і. Некаторыя спецыялісты ў галіне дэмаграфічнай бяспекі нават пачалі казаць, што Беларусь пакрысе выходзіць з дэмаграфічнай катастрофы, у якой наш народ апынуўся падчас 90-х гадоў мінулага стагоддзя. Аднак патрэбна разумець, што нават дасягнутыя вынікі з'яўляюцца недастатковымі, бо ўсяго толькі даюць узнаўленне насельніцтва на 70%, а Беларусі для забеспячэння планаемага індустрыяльнага рыўка патрэбна нават не поўнае ўзнаўленне, а моцны дэмаграфічны рост.

У гэтым становішчы вельмі разумным і неабходным бачыцца рашэнне дзяржаўнага кіраўніцтва па стварэнні практыкі выплаты «мацярынскага капіталу» ў рамках праекта «Вялікая сям'я». Пры гэтым, мяркую, што грошы для вырашэння найважнейшага пытання нацыянальнага выжывання мог бы прадаставіць сацыяльна адказны беларускі бізнес. Нагадаем, што ў Беларусі пражывае каля 11 тысяч доларавых мільянераў, а праект «Вялікая сям'я» быў прапанаваны Прэзідэнту адным з айчынных банкіраў. Аднак разам з матэрыяльным заахвочваннем мацярынства неабходна праявдзенне больш яскраваней інфармацыйнай і ідэалагічнай палітыкі з апорай на традыцыйныя каштоўнасці нашага народа, а таксама прыняцце рэальных захадаў па супрацьдзеянні алкагалізму і наркаманіі.

Калі матэрыяльныя стымулы для насельніцтва будуць крочыць у дзяржаўнай палітыцы поруч з духоўным выхаваннем грамадства і эфектыўнай нарматворчай практыкай, то будучыня нацыі ўсё ж бачыцца аптымістычна, а лічба ў 20 мільёнаў беларусаў не здаецца такой недасягальнай.

**Аляксандр ШПАКОЎСКІ,**
**палітычны аналітык.**

■ Выезд без «прыгод»

# У РАСІЮ — ПРАЦАВАЦЬ, У ТУРЦЫЮ — СЯМ'Ю СТВАРАЦЬ

**Менавіта такая тэндэнцыя назіраецца апошнім часам сярод беларусаў і беларусак, што выязджаюць у вышэйзгаданыя краіны. Пра гэта расказала старшыня грамадскага аб'яднання «Клуб дзелавых жанчын» Ларыса ІСТОМАВА.**

— На інфалінію 113 па пытаннях бяспечнага выезду і знаходжання за мяжой, пачынаючы з 2011 года, па кансультацыю звярнуліся больш за 4 тысячы чалавек. Сярод краін, куды выязджаюць нашы грамадзяне ў першую чаргу, — Расія, Польшча, Германія і Турцыя. Прычым, напрыклад, у Расію часцей збіраюцца мужчыны з мэтай працаўладкавання, а па Турцыі звычайна хочуць атрымаць кансультацыю жанчыны, што едуць туды для знаёмства, заключэння шлюбу ці пошуку працы. Падобная сітуацыя назіраецца і ў дачыненні да Італіі, — адзначыла Ларыса Істомава.

Праваахоўнікі на гэты конт маюць сваю статыстыку. Як расказаў намеснік начальніка 2-га аддзела ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Уладзімір Емяльянаў, сёлета перакрыта 20 каналаў вывазу беларусаў за мяжу з мэтай эксплуатацыі. Людзі збіраліся выязджаць у Расію, Германію, Францыю, Кіпр, Польшчу, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты. Але ў параўнанні з 2004 годам маштаб такіх злачынстваў як сутэнёрства, гандаль людзьмі, выкраданне з мэтай эксплуатацыі і выкарыстанне нявольніцкай працы скараціўся ў 10 разоў. Так, калі ў 2004 годзе было зарэгістравана 555 такіх злачынстваў, то за пару месяцаў гэтага года — усяго 56. У асноўным беларусы сутыкаюцца з такімі формамі гандлю людзьмі, як працоўная і сексуальная эксплуатацыя, таксама маюцца выпадкі гандлю людзьмі з мэтай адабрання ўнутраных органаў. Прычым, з 4 тысяч 970 нашых суайчыннікаў, якія, пачынаючы з 2002 года, сталі ахвярамі гандлю людзьмі, 4 тысячы 386 чалавек падвергліся менавіта сексуальнай эксплуатацыі.

— Апошнім часам вельмі шмат «неадназначных» прапаноў беларускія жанчыны і дзяўчаты атрымліваюць з Кітая. Ім праз сацыяльныя сеткі прапаноўваюць працу мадэлі ў клубе, — адзначыла кіраўнік інфалініі па бяспечным выездзе і знаходжанні за мяжой праграмы «Ла Страда» Ірына Пацановіч. — Але такое проста немагчыма: дастаткова лёгка здагадацца, што праца будзе звязаная як мінімум з танцамі ці эскортам. Прычым працадаўцы прапаноўваюць выехаць у Кітай па турыстычнай візе, абяцаючы праз некаторы час зрабіць і працоўную. Ужо толькі гэты факт павінен насцярожыць. Большасць беларусак не ведае, што з нядаўняга часу ў гэтай краіне дзейнічае новы закон, які прадугледжвае вялізныя штрафы за такое вось нелегальнае працаўладкаванне.

Як сцвярджаюць прадстаўнікі дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС Беларусі, яны праводзяць працу па стварэнні цывілізаваных умоў па экспарце і імпарце працоўнай сілы. Працаўладкаванне нашых грамадзян за мяжой, як правіла, ажыццяўляецца арганізацыямі, што маюць на гэта ліцэнзіі (такіх арганізацый у Беларусі — каля 79). Беларусы, што звяртаюцца туды, маюць мінімальную рызыку стаць ахвярамі гандлю людзьмі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ** ■

■ Вызваленне

# ХОЦІМСК БРАЛІ «РУКАМІ»

## А здзяйсняючы гераічныя ўчынкі, пра ўзнагароды не думалі

**Свабода гэтага раённага цэнтра не азначала ўсталявання міру, але давала надзею на магчымасць заканчэння вайны. Моладзь доўга не радавалася. Хлопцы разумелі, што яшчэ ваяваць і ваяваць. Таму ішлі нават непаўналетнімі на прызыўныя пункты ўжо вольнай зямлі, каб узмацніць наступ сваёй арміі. Ішлі, каб было куды вяртацца...**

### Горад вызваляла марская пяхота?

Вызваленне Хоцімска, якое адбылося 26 верасня 1943 года, было даручана 108-й стралковай дывізіі палкоўніка П.А. Церамава і асобным танкаваму і мінамётнаму палкам. Уяўляю, як страшна было воінам па абодва бакі фронту: працаўнікі добра ўсведамлялі, што для любога з іх кантроль над Беларуссю будзе перамогай, а значыць, ніхто не збіраўся здавацца — толькі жорсткі бой. Для нас вызваленне Беларусі адкрывала шляхі ў Прыбалтыку, Польшчу і Усходнюю Прусію. Вядома, што ў верасні 1943-га беларускі напрамак прыкрывала каля 70 дывізій вермахта, чатыры з якіх і былі сканцэнтраваны пад Хоцімскам.

Наша наступленне пачалося без артпадрыхтоўкі, каб не разбурыць гарадок і не дазволіць фашыстам падпаліць яго. Танкавыя групы з дэсантам знішчылі варожыя сілы на подступах да Хоцімска. Аднак супраціўленне ворага ў самім гарадку было такім моцным, што наступленне ўзмацнілі сіламі яшчэ адной дывізіі, 110-ай. Дарэчы, яна была сфарміравана на базе дывізіі марской пяхоты, таму байцы называлі сябе «марскімі пехацінцамі». Яны і вырашылі лёс горада: імклівa, як віхор, уварваўшыся ў яго з трох бакоў, знішчылі фашысцкі гарнізон. Як сведчаць ваенныя хронікі, да 18 гадзін горад быў вызвалены. У палон тады здаліся больш за 100 гітлераўцаў. Адзін з іх паведаміў, што літаральна перад самым уступленнем у Хоцімск савецкіх войскаў з горада пад нямецкім канвоем было выведзена больш за трыста мясцовых жыхароў, у тым ліку шмат дзяцей. І тады сорак аўтаматчыкаў на чале з камандзірам роты Міхаілам Яворскім на брані танкаў кінуліся наўздагон і праз некалькі кіламетраў адбілі сваіх. Кароткай, але якой цёплай была сустрэча вызваліцеляў з гарадской плошчы, куды неўзабаве пад'ехалі і тры «Т-34» з дзецьмі, якіх яшчэ гадзіну назад вялі ў няволю...

Неўзабаве ў гарадок прыехаў і кіраўнік кампартыі Беларусі П.К. Панамарэнка. У той памятны вечар у гонар вызваліцеляў Хоцімска, які 770 дзён пакутаваў ад акупацыі, салютавала Масква. Аднак самы запамінальныя, самы ўрачыстыя і моцны, хаця і сціплы, салют гучаў у самім гарадку: з воінскімі ўшанаваннямі ў брацкіх магілах хавалі герояў, што палеглі за яго вызваленне...

> **Ходзячы ў медсанбат на перавязкі, пазнаёміўся там з цяжкапараненым снайперам, які аднойчы падарыў яму... сваю снайперскую вінтоўку.**

Сёння ў невялікім Хоцімскім раёне пра мужнасць воінаў-вызваліцеляў сведчаць больш за 40 помнікаў і абеліскаў. На сайце райвыканкама размешчаны і яшчэ адзін своеасаблівы помнік: гэта карта воінскіх пахаванняў з іх электроннымі пашпартамі. Гэтыя дакументы маюць апісанні месцаў пахавання, прозвішчы пахаваных. І ў кожным такім пашпарце, што вельмі важна, пазначаны тыя, хто нясе адказнасць за ўтрыманне і догляд: гэта і прадпрыемствы раёна, і школы, і органы ўлады. Шкада, але на многіх магілах замест прозвішча ўсё яшчэ пазначана «невядомы».

### Тры ордэны і два медалі — у адзін дзень!

Васіль Іосіфавіч Ячнеў — чалавек у Хоцімску вядомы і паважаны. Баявых і працоўных узнагарод, як той казаў, хапіла б на трое грудзей. «На фронт, — жартуе ён, — трапіў з другога заходу: як толькі родныя мясціны вызвалілі, падаўся на прызыўны пункт у суседнюю вёску, але адтуль адправілі дадому, бо ўзрост быў яшчэ непрызыўны. Тады пайшоў у раённы камісарыят у Клімавічы, дзе назваўся ўжо 18-гадовым. Адтуль і трапіў ў школу кулямётчыкаў, а затым — і на перадавую, пад Віцебск».

Яго першы бой мог стаць і апошнім: агнявы пункт накрыла варожым снарадам, другі нумар загінуў, Васіля параніла. Ходзячы ў медсанбат на перавязкі, пазнаёміўся там з цяжкапараненым снайперам, які аднойчы падарыў яму... сваю снайперскую вінтоўку. «Паказаў і навучыў, як карыстацца аптычным прыцэлам, расказаў пра тое, што найперш трэба ведаць снайперу», — распавядае ветэран. А неўзабаве кулямётчык Васіль Ячнеў ужо на практыцы асвойваў новую зброю і снайперскае рамяство. Франтавая газета «За Радзіму» праз некаторы час пісала, што «кулямётчык ручнога кулямёта камсамолец Ячнеў, маючы снайперскую вінтоўку, прабраўшыся на нейтральную паласу і абсталяваўшы там агнявую пазіцыю, знішчыў чатырох фашыстаў». Праз некалькі месяцаў тая ж газета паведамляла, што на рахунку маладога снайпера — больш за трыццаць ворагаў.

«Ваяваў, як і ўсе, — лічыць Васіль Іосіфавіч. — Неаднойчы хаваў тых, з кім побач ляжаў у акопе, ішоў у атаку. Даводзілася і мінамётчыкам пабыць, і ў разведку хадзіць, і па «язык».

Неаднойчы адважнага воіна прадстаўлялі да ўзнагарод, але, успамінае Васіль Іосіфавіч, атрымацьіх усё неяк не атрымлівалася: то раненні і шпіталі, то пераводы ў іншыя часці. Ды і не пра ўзнагароды думалася, бо яшчэ грымела вайна. Пасля 9 мая 1945 года з медалём «За Перамогу над Германіяй» яшчэ пяць гадоў праслужыў у той Германіі. І вось перад самай дэмабілізацыяй адзін з яго аднапалчан атрымлівае не ўручаны раней медаль. Ён і параіў Васілю звярнуцца ў штаб і расказаць пра свой баявы шлях і пра тое, што некалькі разоў яго прадстаўлялі да ўзнагарод. Літаральна праз некалькі тыдняў гвардыі сяржант Васіль Ячнеў быў выкліканы ў штаб брыгады, дзе атрымаў адразу тры ордэны Чырвонай Зоркі і медалі «За адвагу» і «За ўзяцце Кёнігсберга».

Вось з гэтым багаццем, ды яшчэ з баянам, і прыехаў салдат дадому. І так склаўся яго лёс, што і дагэтуль з музыкай не развітваецца. Ад самай дэмабілізацыі крочыць ветэран па жыцці з музыкай: працаваў музычным работнікам і фізруком у дзіцячых дамах, а апошнія без малога 20 гадоў з'яўляецца баяністам-акампаніятарам народнага ветэранскага хору пры Хоцімскім раённым цэнтры культуры.



Васіль Іосіфавіч ЯЧНЕЎ — вядомы і паважаны чалавек.

### Ваяр духоўнасці

Сёння Хоцімск — звычайны беларускі гарадок. Чысценькі, дагледжаны, з прыгожымі скверамі і паркам адпачынку, ёсць нават кола агляду, утульныя кавярні, дзе вас пачастуюць выключна смачнымі абаранкамі. Незвычайна многа дрэў і мноства кветак. Некалькі брацкіх магіл і помнікаў у цэнтры пасёлка.

І яшчэ ёсць у Хоцімску храм — Свята-Троіцкі сабор. Усе, з кім даводзілася пагаварыць, раілі абавязкова наведаць яго. І абавязкова падкрэслівалі, што служыць там архімандрыт Кірыл, які пачаў несці свой пастарскі абавязак з 1958 года ў маленькай капліцы, што і дагэтуль існуе пры гарадскіх могілках. Сапраўды, сабор — гэта ўпрыгожанне горада. Пабудаваны ён быў у 1861 годзе, у памяць пра адмену прыгоннага права. Лёс яго падобны на лёсы многіх сабораў і цэркваў: храм быў пашкоджаны ў часы вайны, было тут і збожжасховішча, а з 1960-ых — раённы Дом культуры. У 1990 годзе, калі будынак сабора аддалі вернікам, яго выгляд не выклікаў нічога, акрамя жалю... Вось тут і знайшлася справа айцу Кірылу: толькі за першыя дзесяць гадоў былі адноўлены вежы купалоў, пабудаваны дзве капліцы, гаспадарчыя пабудовы. І з тых часоў нястомны пастыр збірае ахвяраванні, заняты не толькі на духоўнай ніве, але і на будаўнічай і педагагічнай. Паводле яго слоў, яшчэ многае трэба зрабіць. Клопату патрабуе і нядзельная школа, дзякуючы якой саборны двор часта поўніцца дзіцячымі галасамі і ў якую дзеці прыходзяць і для заняткаў жывапісам і разьбярствам. Апякуецца архімандрыт Кірыл велізарнымі клумбамі ў саборным двары, расаду для якіх рыхтуе асабіста і ўважліва сочыць, як прыхаджанкі разбіваюць кветнікі.



Помнік воінам-вызваліцелям Хоцімска.

Яшчэ ў гонар 50-годдзя вызвалення Хоцімска пабудаваў ён Свята-Праабражэнскую царкву, у якой кожную пятніцу служыць паніхіды па палеглых воінах. Часта можна пабачыць яго і ў горадзе. Нягледзячы на свае 80 з гакам, бадзёры і энергічны, ён усё некуды спяшаецца па справах. Таму і такой павагай карыстаецца гэты па-манаску сціплы і па-чалавечы шчодры душою чалавек. А храм — гэта сімвал яшчэ адной перамогі — духоўнай.

**Пятро РАМАНЧУК**

# «МАРСКІ СТАЛІНГРАД» БЕЛАРУСКІХ ПЕХАЦІНЦАЎ

**Міжнародны грамадска-патрыятычны праект «Марское братэрства — непарушна!» аб'ядноўвае ветэранаў ваенна-марскога флоту з Беларусі і Расіі. Пра многія маштабныя акцыі праекта мы ўжо расказвалі. У рамках адной з іх — «Марскі Сталінград» — былыя маракі сабраліся ў беларускай сталіцы і ўзгадалі подзвігі нашых землякоў.**



Аўтар і кіраўнік праекта «Марское братэрства — непарушна!» Арсеній КРЫЦКІ перадае партрэт Героя Савецкага Саюза Георгія Халасцякова на яго малую радзіму — у Баранавічы.

— Галоўная мэта акцыі — вярнуць гісторыі забытыя імёны яе герояў, — зазначыў **аўтар і кіраўнік праекта «Марское братэрства — непарушна!» Арсеній КРЫЦКІ.** — Мала хто ведае, што Беларусь — радзіма 47 адміралаў. Цэнтральнай падзеяй праекта стане адкрыццё помніка-мемарыяла ваенным маракам-беларусам: марскім пехацінцам, падводнікам, лётчыкам, якія неслі баявую вахту на марскіх прасторах ад Калінінграда да Уладзівастока.

Сапраўды, у Беларусі дагэтуль няма ніводнага помніка, які нагадваў бы пра багатую флоцкую гісторыю нашай краіны. А між іншым, амаль 200 тысяч беларусаў служылі ў савецкім ваенна-марскім флоце. У бліжэйшыя гады сітуацыя будзе выпраўлена: у Мінску з'явіцца манумент маракам-беларусам. Акрамя таго, нашы ветэраны ваенна-марскога флоту ў хуткім часе плануюць стварыць уласную арганізацыю. У перспектыве і больш маштабныя задумы — будаўніцтва вучэбнага флоту Саюзнай дзяржавы і магчымасць марской адукацыі як для расійскай, так і для беларускай моладзі.

— Безумоўна, акцыя, якая праводзіцца ў рамках праекта «Марское братэрства — непарушна!», важная і вельмі неабходная, — падкрэсліў **намеснік кіраўніка прадстаўніцтва Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы ў Мінску Анатоль КАМІСАРЧУК.** — Прайшло шмат гадоў, нешта забываецца, а нешта і наўмысна замоўчваецца, гісторыя паčынае скажацца. І ў гэтых умовах важна паказаць, што мы сваю гісторыю памятаем, шануем і не забываем.

Акцыя «Марскі Сталінград» скіравана на тое, каб узгадаць пэўныя гістарычныя моманты і подзвігі. Узяць хаця б подзвіг нашых дэсантнікаў у горадзе Новарасійску, у вызваленні якога ўдзельнічаў ураджэнец Баранавічаў Георгій Нікіціч Халасцякоў. Пазней ён стаў Героем Савецкага Саюза. На Кубані нашага земляка памятаюць і любяць: ён — ганаровы грамадзянін Новарасійска і Геленджыка, яго іменем названы вуліцы гэтых гарадоў.

— У пытаннях памяці мы адзін народ: Беларусь і Расія былі адзінымі ў барацьбе з ворагам, адзіныя яны і ў памяці аб Вялікай Перамозе, — перакананы **начальнік аддзела Расваенцэнтра пры ўрадзе РФ Аляксей ГАРДЗІЕНКА.** — Праект «Марскі Сталінград», які ажыццяўляецца на тэрыторыі дзвюх дзяржаў, прысвечаны 70-годдзю вызвалення Новарасійска і Таманскага паўвострава ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэта была адна з найцяжэйшых аперацый Вялікай Айчыннай вайны. І нягледзячы на тое, што яна мела стратэгічны і тактычны поспех ваенных рашэнняў, што былі прыняты савецкім камандаваннем, усё-такі тая ахвярнасць, якая была прынесена на алтар Перамогі ў гэтых баях, вядома ва ўсёй сусветнай марской гісторыі. Таму, перш за ўсё, мы аддаём даніну памяці загінулым — а гэта некалькі тысяч маракоў.

Так склалася, што вызваленне Новарасійска і Таманскага паўвострава ад гітлераўцаў супала з адраджэннем марской пяхоты. Няма такога роду войск, які б так моцна пацярпеў у гады Другой сусветнай вайны. У 1949 годзе гэты род войск быў папросту ліквідаваны. І толькі ў 1963 годзе было прынята рашэнне аб яго аднаўленні. І служба многіх беларусаў потым праходзіла ў часцях марской пяхоты на ўсіх чатырох флатах.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота аўтара.**

# ВОЎЧЫН І ЯГО ВАКОЛІЦЫ


Такім быў касцёл у 2008 годзе.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У 90-я гады касцёл быў унесены ў спіс гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі. Паколькі грошай на аднаўленне помніка не знайшлося, напрыканцы 2007 года ён быў перададзены ва ўласнасць Пінскай епархіі Рымска-каталіцкай Царквы. Налета пачалася рэстаўрацыя будынка.

Калі вясной 2008-га вакол пачарнелых сцен касцёла мы хадзілі з руплівіцай мясцовай гісторыі, вялікай энтузіясткай стварэння музея Галінай Качаноўскай, плакаць хацелася ад убачанага. З цяжкасцю верылася, што муры некалі набудуць годнае аблічча. Але касцёлу пашанцавала, што за справу яго адраджэння ўзяўся польскі рэстаўратар Віктар Вільк. У Беларусі ён аднаўляў мінскі кафедральны касцёл Прасвятой Дзевы Марыі — галоўнай каталіцкай святыні краіны, а таксама рэстаўраваў касцёл Успення Дзевы Марыі ў Пінску і манастыр францысканцаў, дзе цяпер месціцца Міжепархіяльная вышэйшая духоўная семінарыя імя святога Тамаша Аквінскага.

Паступова над воўчынскім касцёлам з'явіўся новы дах, заняла сваё ранейшае месца вежа з гадзіннікам. Гадзіннік тут быў асаблівы: яго цыферблаты, арыентаваныя па чатырох баках свету, паказвалі час, адкуль бы ты ні паглядзеў на храм. Пад заваламі знайшлі фрагмент аднаго з цыферблатаў са стрэлкай, што дазволіла аднавіць не толькі аблічча гадзінніка, але і яго параметры. Цяперашні гадзіннік стаў дакладнай копіяй таго, які некалі стаяў тут і які яшчэ памятаюць старэйшыя вяскоўцы. Дыяметр цыферблата складае 1,42 метра. А механізм уманціраваны самы сучасны, ім кіруе складаная электроніка. Гадзіннік адбівае кожную гадзіну і яе палову з 6 раніцы да 22-х.


Так выглядае касцёл сёння.

А літаральна гэтым летам наверх узнялі скульптуру евангеліста Іаана. Раней тут было чатыры скульптуры евангелістаў. Нейкім цудам ацалела адна з іх, іншыя тры — Марк, Мацвей і Лука — даўно пападалі і паразбіваліся. Аднавіў Іаана беларускі скульптар Мікалай Андрэеў. Работу па рэстаўрацыі вядуць у асноўным польскія майстры з майстэрні пана Вілька. Так павольна, крок за крокам, набывае касцёл свае старыя-новыя рысы.

## Кароль

У гэты касцёл 15 чэрвеня 1938 года прывезлі алавяную дамавіну з прахам караля Станіслава. Кароль вярнуўся на радзіму. Але спакой яго быў нядоўгім.

Асобу апошняга караля Рэчы Паспалітай гісторыкі звычайна называюць трагічнай. У многім ён быў перадавым чалавекам свайго часу — апекуном, фундатарам, аматарам мастацтва і навук. Засталіся сведчанні аб тым, што кароль наведваў прэм'еры балета ў Ружанскім палацы. Ён застаўся ў памяці сучаснікаў як кароль-рэфарматар. Пры ім была прынятая Канстытуцыя 1791 года, першы падобны дакумент у Еўропе. Але ракавым для яго заўсёды быў расійскі прастол. Не без падтрымкі Кацярыны ІІ Станіслаў стаў каралём Аўгустам ІІ. Па яе волі адбыліся тры падзелы Рэчы Паспалітай, пад яе прымусам са слязамі на вачах ён адракаўся ад свайго прастола ў 1795 годзе. Праз два з паловай гады пасля адрачэння былы кароль памёр. Пахаваны быў у Санкт-Пецярбургу ў касцёле св. Кацярыны. На каменнай пліце, пад якой змяшчалася крыпта, планавалі паставіць помнік. Але гэтага не зрабілі. І спакой аказаўся не вечным. У 30-х гадах савецкія ўлады прапанавалі вярнуць Польшчы труну з астанкамі Панятоўскага. І як ужо гаварылася, яе прывезлі ў Воўчын.

**Раней паміж гэтымі каналамі знаходзіліся аранжарэі, у якіх раслі мандарыны, апельсіны, іншыя паўднёвыя дрэвы. А перад маёнткам быў незвычайны вадаём. Дно штучнага возера выклалі шклом, а ў вадзе плавалі экзатычныя рыбкі.**

Мясцовыя жыхары — з тых, хто дапамагаў на цырымоніі — расказвалі, што, акрамя труны, былі яшчэ карона, шабля, плашч, урна з забальзамаваным сэрцам. Усё гэта замуравалі ў крыпту. Але ў 1945 годзе касцёл закрылі. Яшчэ праз 43 гады знойдзеныя пад крыптай рэшткі абшыўкі труны, кавалкі плашча, іншыя прадметы былі перавезены ў Варшаву, і там правялі сімвалічнае перапахаванне.

## Легенда

А ў Воўчыне жыве легенда, што астанкі караля тайна ноччу вывез і недзе пахаваў набожны і адукаваны вясковец Антон Пратасюк: пасля закрыцця касцёла і ад'езда святароў маёмасць рабавалі, святыню апаганьвалі, вось нядаўні сакратар гміны не ўтрываў, пахаваў былога караля па-чалавечы. А пра ўчынак свой маўчаў і тайну месца пахавання забраў у магілу. Тады гаварыць на гэту тэму было небяспечна. Для сур'ёзнай навуковай экспедыцыі, казалі ў Воўчыне, знайсці тайнае пахаванне — не праблема.

Ёсць і іншая версія. Некаторыя лічаць, што астанкі былі прывезены з Ленінграда ў вельмі дрэнным стане, тамтэйшую крыпту не раз падтоплівалі воды Нявы. І ад касцей да гэтага часу ўжо практычна нічога не засталося. Таму і шукаць іх не варта. Але ж для будучага музея, згадзіцеся, чым болей легендаў, тым цікавей.

А шлях да музея, як відаць, зацягнуўся. У Галіны Качаноўскай, супрацоўніцы прадпрыемства «Усход-Камянец», дома вымалёўваецца сапраўдны яго філіял. На сценах вісяць партрэты прадстаўнікоў як Чартарыйскіх, так і Панятоўскіх. Асаблівае месца ў гэтай галерэі займае копія партрэта апошняга караля Польшчы з уласнаручным дароўным надпісам манарха. Гісторыя вандровак партрэта цягне амаль на дэтэктыў. Са Львова палатно нейкім дзіўным чынам трапіла ў Кобрын, затым у Брэст. І гэта невыпадкова, лічыць Галіна Міхайлаўна, што палатно вярнулася на радзіму яго героя. На сценах яе дома часова размясціліся копіі дакументаў з польскіх, французскіх архіваў. А ў Гродзенскім архіве яна праседжвала тыднямі, пакуль не знаходзіла патрэбныя звесткі. Цяпер усё гэта так і просіцца ў музей, месца для якога вызначана ў былой касцельнай плябаніі. Доўгі час там размяшчалася кантора калгаса. У апошнія гады сельгаспрадпрыемства ўзялося адрамантаваць будынак. Але са зменай кіраўніцтва работы прыпыніліся. Цяпер, наколькі мне стала вядома, нават вядзецца пошук пакупніка памяшкання. Думаю, што ўсё ж ён знойдзецца. Музей у Воўчыне азначаў бы пачатак прыпытку турыстаў.

## Маёнтак

Ім ёсць пра што расказаць. Тая самая плябанія стаіць на месцы былога палаца Чартарыйскіх. Маёнтак страчаны, засталіся фрагменты воднай сістэмы — вадаёмы і каналы, якія зарастаюць. Водную сістэму, лічыць Галіна Качаноўская, можна аднавіць, былі б грошы. Дастаткова прачысціць і запоўніць вадой каналы. Раней паміж гэтымі каналамі знаходзіліся аранжарэі, у якіх раслі мандарыны, апельсіны, іншыя паўднёвыя дрэвы. А перад маёнткам быў незвычайны вадаём. Дно штучнага возера выклалі шклом, а ў вадзе плавалі экзатычныя рыбкі.

Пра багацце і прыгажосць тутэйшых палацаў складалі легенды. У пачатку XVIII стагоддзя гаспадаром Воўчына стаў князь Казімір Чартарыйскі. Дачка Казіміра і яго жонкі Ізабэлы Канстанцыя выйшла замуж за Станіслава Панятоўскага, бацьку будучага караля. Станіслаў малодшы нарадзіўся ў 1732 годзе. У архіве епархіі польскага горада Драгічына над Бугам да гэтай пары ёсць запіс аб хрышчэнні будучага манарха. Вучыўся ён спачатку тут, у Воўчыне, у школе, якую арганізавала яго маці. Да гонару Панятоўскіх, нягледзячы на сваю еўрапейскую вядомасць, яны трывала асацыявалі сябе з малой радзімай. У кнізе Анатоля Федарука «Старадаўнія сядзібы Берасцейшчыны» чытаем: «Сваё паходжанне Панятоўскія выражалі вельмі лаканічна: «Мы лічым сябе радавітымі ліцвінамі, бо нарадзіліся і прынялі святое хрышчэнне ў Воўчыне, каля Брэста, а ў рыцарскім стане займалі пасаду стольніка літоўскага...»

## Гісторыя

А вось лёс маёнтка, як і лёс самога караля, аказаўся нешчаслівым. У пазамінулым стагоддзі палац разабралі па загадзе тагачаснай гаспадыні Караліны Пуслоўскай, якая задумала перанесці сваю рэзідэнцыю пад Бярозу. Да нашых часоў ад воўчынскага маёнтка засталося няшмат: невялікія руіны і рэшткі палаца і яго падсобных памяшканняў, рэшткі парку, будынак касцельнай плябаніі.

Але ж у Воўчыне на кожным кроку пакінула свае адзнакі гісторыя. Усе войны перажыў драўляны крыж, пазначаны яшчэ на карце 1762 года. Здаўна людзі верылі ў яго цудадзейную сілу і прыносілі ахвяры крыжу. Каля яго падножжа знойдзены таму сведчанні. Ходзяць да яго месцічы і цяпер, на старым крыжы шмат рознакаляровых стужачак — іх пакідаюць маладыя дзяўчаты на шчасце.

У суседняй вёсцы Грымяча захаваліся муры былога маёнтка XIX стагоддзя. Яму фатальна не шанцуе. Будынак перадавалі, прадавалі, але ніхто так і не ўзяўся за яго адраджэнне. Памятаю, як у першы мой прыезд сюды вартаўнік Ніна Руцько спытала, ці глядзела я беларуска-польскі фільм «Наталі», які здымалі менавіта тут. Фільм я не ўзгадала, але зразумела, як мясцовыя жыхары ганарацца сваёй славутай гісторыяй. А колькі легендаў і паданняў могуць расказаць у старадаўнім Воўчыне! Некаторыя месцічы лічаць, што сярод іх аднавяскоўцаў ёсць пазашлюбныя продкі Чартарыйскіх. Музей тут неабходны. Землякі «радавітых ліцвінаў» проста абавязаны прывесці ў парадак сваю гісторыю. Пра гэта падумалася яшчэ раз, калі Георгій Грыбыў, гаспадар аграсядзібы «Млыны», размешчанай у дзясятку кіламетраў адсюль, расказаў пра сваіх гасцей. Сям'я з траімі дзецьмі з Саратава вандравала па Беларусі на «жыгулях». Як толькі яны прыехалі і спыніліся на начлег у аграсядзібе, адразу пачалі распытваць гаспадара, як праехаць у Воўчын, на радзіму апошняга польскага караля. Значыць, ведаюць людзі, цікавяцца. І гэтыя мясціны мусяць годна сустракаць турыстаў. Нездарма ж у Галіны Качаноўскай цярпліва чакаюць свайго часу эскізы сувеніраў з каралеўскімі вензелямі, ёй самой распрацаваныя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**
*Камянецкі раён.*

# «ПРЫВАТНІК ПРАДАЕ ПА ТОЙ ЦАНЕ, ПА ЯКОЙ ПРАДУКЦЫЮ Ў ЯГО БЯРУЦЬ»

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Нашу даўнюю чытачку з Мінска прымусіў звярнуцца на «гарачую лінію» газеты аналіз цэн на сельскагаспадарчую прадукцыю, што назіраецца зараз на некаторых рынках. Калі канкрэтна, гаворка ў нашым выпадку ідзе пра «Заходні», побач з якім пражывае заяўніца і наведваць які, адпаведна, ёй найбольш зручна. Як падавалася раней...**

— Майму абурэнню няма межаў! Толькі падумайце, у разгар нарыхтовак сельгаспрадукцыі на «Заходнім», напрыклад, моркву прадаюць па 7 тысяч рублёў за кілаграм! Цыбулю, капусту — па 6 тысяч! Бульба і тая ляжыць па 6 тысяч! Пытаюся ў прадаўца: маўляў, чаму так дарога? Той толькі ўсміхаецца: «А што вы хочаце — усё хатняе! Я разумею, што хатняе, толькі паўтаруся: зараз сезон нарыхтовак, гэта ж не зіма яшчэ! Напрыклад, у адной з аптовых крам у той жа самы час бульбу прадавалі па 2,9 тысячы рублёў за кілаграм. Цыбулю, падкрэслю асобна, прывезеную з Украіны, — па 3,5 тысячы рублёў! Морквы ў той дзень на выязным сезонным кірмашы па гандлі сельгаспрадукцыяй не было, дык зноў жа знайшла патрэбнае ў аптовай краме — па 3 тысячы рублёў за кілаграм! Дык вось вы мне адкажыце: ці кантралюе нехта цэны на рынках у прыватнікаў? Чаму яны такія высокія? — гаварыла чытачка.

Пытанні падаліся ў пэўнай ступені слушнымі. Так, зараз праходзяць сезонныя сельскагаспадарчыя кірмашы, дзе і выбар багаты, і цэны меншыя, але не ўсе маюць звычку ствараць запасы адразу на ўсю зіму. Ды і неўзабаве гэты выязны гандаль скончыцца. У крамах побач з домам, можа, і цэны прымальныя, але асартымент часам не такі вялікі, асабліва ўзімку...

На абураны зварот мінчанкі па просьбе рэдакцыі адказала галоўны спецыяліст аддзела фінансаў галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама Людміла Зубко.

— Калі гаварыць пра фізічных асоб, якія рэалізуюць вырашчаную сельскагаспадарчую прадукцыю на рынках, дык цэны ў іх адрэгуляваць нейкім чынам немагчыма. Усё залежыць толькі ад попыту і прапановы, а таксама ад якасных характарыстык тавару. Калі, скажам, нехта прапануе экалагічна чыстую прадукцыю, вырашчаную без выкарыстання хіміі. Калі па такой цане прадукцыю бяруць, значыць, яна па ёй і будзе прадавацца. Чалавек напросту паказвае даведку, што мае, напрыклад, участак пад Мінскам ці ў Гродзенскай вобласці, што ён сваімі рукамі вырасціў ураджай. Як забараніць, калі прадавец, заплаціўшы за месца на рынку? Калі ён увогуле зрабіў вырошчванне сельскагаспадарчай прадукцыі крыніцай даходаў? — патлумачыла Людміла Сцяпанаўна.

Апроч фізічных асоб на рынках, як вядома, гандлююць і індывідуальныя прадпрымальнікі. Тут сітуацыя як быццам некалькі іншая — прынамсі, на іх «апетыты» знайсці ўправу можна. Але не зараз...

— Кожны год з 15 лістапада па 31 мая рашэннем Мінгарвыканкама на сельскагаспадарчую прадукцыю ўводзяцца гранічныя адпускныя цэны. Прытрымлівацца іх павінны і індывідуальныя прадпрымальнікі: ніхто не павінен прадаваць садавіну і гародніну па цэнах, вышэйшых за вызначаныя. Такое рашэнне будзе і сёлета. Пра канкрэтныя гранічныя адпускныя цэны гаварыць пакуль рана. Заразвядомыя толькі памеры гандлёвых надбавак да іх: 200 рублёў — на бульбу і буракі, 240 рублёў — на капусту, моркву і цыбулю, — расказала Людміла Зубко. — Але, нагадаю яшчэ раз, гранічныя адпускныя цэны будуць уведзены толькі з 15 лістапада.

Калі падвесці сухі вынік з вышэйсказанага, выходзіць, што індывідуальныя прадпрымальнікі, якія гандлююць на рынках сельгаспрадукцыяй, могуць яшчэ цэлы месяц кіравацца вядомым прынцыпам «попыту — прапановы». А фізічныя асобы маюць такое права пастаянна.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# Сямейная газета

Выпуск № 2 (2)




# УСЕ БАКІ МЕДАЛЯ

**Да з'яўлення на свет дачкі ўсе родныя лічылі, што я — чалавек вельмі спакойны, цярплівы, нават флегматычны. Вывесці мяне з раўнавагі і прымусіць павысіць голас не маглі ні сваркі малодшых сясцёр, ні дзіўныя музычныя схільнасці суседзяў, ні бытавыя аварыі і іншыя непрыемнасці. Але цяпер, каб захоўваць раўнавагу, даводзіцца ці не штодня нагадваць сабе голасам Карлсана: «Спакой, толькі спакой!». Выхавацелька ў дзіцячым садку жартуе: «А вы ўяўляеце, які балаган робіцца, калі трыццаць малых гамоняць, чагосьці тэрмінова хочуць і капрызяць?» Не ўяўляю. Шчыра — не ўяўляю. І час ад часу недаверліва ўдакладняю ў сваёй мамы: «Мам, як у цябе на нас траіх хапіла цярпення?». Мама толькі загадкава ўсміхаецца: «І ў цябе хопіць!»**

...Сёлета ў нашай краіне ордэнам Маці ўзнагароджаны 86 жанчын. А ўсяго з 1995 года, калі была заснавана гэтая дзяржаўная ўзнагарода, падобны знак найвышэйшай пашаны атрымалі 7219 беларусак. Гэта значыць, звыш сямі тысяч жанчын нарадзілі і выхавалі 5 і больш дзяцей.

У Савецкім Саюзе, які я ўжо дрэнна памятаю, з 1944 года існаваў ордэн «Маці-гераіня». Тады, праўда, крытэрыі былі іншымі: прэтэндаваць на падобную ўзнагароду і званне маці-гераіні маглі жанчыны, якія нарадзілі і выхавалі 10 і больш дзяцей! Ва ўладальніцы ордэна №1 Ганны Аляксахінай было наогул 12 дзяцей — праўда, 4 сыны загінулі на фронце... Нашы мамы і бабулі сцвярджаюць, што на той час вялікія сем'і былі нормай. Але агульная колькасць узнагароджаных у маштабах СССР не настолькі вялікая, як можна было чакаць — за амаль 50 гадоў гэты ордэн атрымалі каля 431 тысячы жанчын.

І ўсё ж. Удумайцеся толькі: кожная з гэтых жанчын не толькі нарадзіла або ўсынавіла, але яшчэ вырасціла і выхавала 10 і больш дзяцей. Гэта значыць — не адзін год недасыпалі, бо ў кагосьці з дзяцей абавязкова балелі зубкі, жывоцік, вуха... Не адзін год прачыналіся на досвітку, каб накарміць і выправіць у садок-школу-вучылішча-інстытут усю сваю грамаду. Сотні разоў выслухоўвалі разнастайныя нараканні суседзяў і заўвагі настаўнікаў. Неверагодную колькасць часу правялі ў дзіцячых паліклініках і крамах. Лячылі падраныя калені і разбітыя лбы, разнімалі нежартоўныя бойкі. Чырванелі — ад сораму і ад гонару. Выпускалі — аднаго за адным — у самастойнае жыццё. Цярпелі, прыкрыквалі, падладжваліся, супакойвалі, дзяліліся жыццёвай мудрасцю. І, магчыма, як і мая прапрабабуля, памерлі проста на градах, збіраючы дарослым ужо дзецям «свойскі» няхітры пачастунак...

Цяпер быць матуляй у нейкіх аспектах прасцей: сучасная медыцына, тэхніка, шырокі выбар адукацыйных праграм, зноў жа, 3-гадовы водпуск па доглядзе дзіцяці. «Хіба гэта нейкі подзвіг — нарадзіць дзіця!» — паблажліва крывяцца многія. А аказваецца — подзвіг. Стаць маці-адзіночкай або шматдзетнай мамай, прыняць рашэнне нараджаць і выхоўваць «асаблівае» дзіця або нарадзіць, нягледзячы на ўласныя фізічныя абмежаванні — такія выпрабаванні пройдзе далёка не кожная жанчына. І ў пэўным сэнсе, як бы пафасна ні гучала, кожная з гэтых мам — гераіня. Незаўважная. Штодзённая. Вартая бясконцай удзячнасці, бескарыслівай дапамогі і глыбокай павагі не толькі ў святочныя дні. Так што не шукайце нагоды сказаць маме, як вы яе любіце, — кажыце часцей проста так. Пакуль ёсць каму казаць.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Быць разам

Тамара ЛІСІЦКАЯ і Глеб МАРОЗАЎ:

# «НА НАШЫМ ВЯСЕЛЛІ ВЫКРАДАЛІ ЖАНІХА І ВЯЛІ ТРАНСЛЯЦЫЮ ВЫКРАДАННЯ!»

**Яны ўжо амаль дзесяць гадоў — сям'я. Творчая, моцная, а з пэўнага часу яшчэ і шматдзетная. Пісьменніца, тэлевядучая і, па прызнанні многіх слухачоў, самы спакуслівы голас айчыннага эфіру Тамара Лісіцкая і радыёзавадатар, вядучы тэлепраграм, канцэртаў, КВЗ ды іншых забаўляльных мерапрыемстваў Глеб Марозаў (творчы псеўданім «пашпартнага» Віталя Ялфімава) лепш за каго іншага абвяргаюць распаўсюджаныя меркаванні, што прафесійная паспяховасць і сям'я несумяшчальныя, што нельга паспець усё і абавязкова трэба чымсьці ахвяраваць. Яны — не ахвяруюць. Проста жывуць, выхоўваюць траіх дзяцей, рэалізуюцца ў творчасці, спалучаючы «свецкае» ды зямное. І пры гэтым дзіўным чынам умудраюцца быць навідавоку, але не напаказ, аберагаючы сваё асабістае жыццё ад празмерна цікаўных вачэй.**



10 гадоў таму...

Таму ці дзіўна, што менавіта Тамара і Глеб сталі першымі героямі нашай новай рубрыкі «Быць разам», у якой мы паспрабуем вывесці сакрэтныя рэцэпты сямейнага шчасця. І хоць з-за вельмі шчыльнай занятасці галоўных дзеючых асоб зладжваць гэтае інтэрв'ю давялося некалькі тыдняў, асабіста я ні на хвіліну аб гэтым не пашкадавала.

## «ЖАНІЦЦА НЕ БУДУ, КАЛІ НЕ ДАДУЦЬ ПРАЕХАЦЬ У ЛІМУЗІНЕ»

**— Давайце ўзгадаем, з чаго ўвогуле пачыналася ваша сям'я: хто каго першы заўважыў на «Альфа Радыё», чым зачапіў, хто зрабіў першы крок?**

***Глеб:*** Я даўно пра яе ведаў, аднойчы нават у інтэрнэце фота знайшоў, паглядзеў. Але ніколі не думаў, што мы будзем разам. Занадта далёка яна была.

***Тома:*** Я пачула незнаёмы голас у эфіры, які дагэтуль ведала «ўздоўж і ўпоперак», і стала цікава, што там за новенькі. Чакала сходу, каб убачыць яго — значыць, настройкі ўжо былі правільныя. А потым яго прадставілі камандзе — а Глеб умее рабіць уражанне — і мне стала яшчэ цікавей. Высокі брунет з ямінкай на падбародку... Ну, як тут устаяць? А потым яго «прысцягнулі» да мяне «стажыравацца»...

***Глеб:*** Атрымліваецца, першы крок мы зрабілі разам. Адначасова. Так бывае, калі нейкая сітуацыя наспявае і павінна здарыцца. Вы ж ведаеце, што радыё адначасова вынайшлі Марконі і Папоў?

**— Ваша вяселле праходзіла, мякка кажучы, нетрадыцыйна: з тэлетрансляцыяй, актыўнай цяжарнай нявестай і выкраданнем... жаніха. Клуба «Ямайка», праўда, даўно ўжо няма, і многія ўдзельнікі падзей жывуць за межамі краіны. І ўсё ж такі, якія моманты дагэтуль прыемна ўзгадваць?**

***Тома:*** Я ўсё памятаю, я была цвярозая нявеста. Сапраўды — на восьмым месяцы, з вялізным жыватом. І кралі ў нас жаніха, і вялі рэпартаж з трансляцыяй выкрадання... Ой, было здорава... Ледзьве не спазніліся ў ЗАГС з-за Глеба, ехалі ў таксі... А пасля ЗАГСа паехалі на «Альфу», дзе прысягнулі ў вернасці адно аднаму пад партрэтам Сяргея Кузіна, а сам Кузін блаславіў нашу творчую сям'ю. Потым ужо кавалькадай у лімузінах (Глеб сказаў, што жаніцца не будзе, калі яму не дадуць праехаць у лімузіне) — у клуб... Нашы дарослыя сваякі спачатку крыху саромеліся, здзіўленыя такім фарматам: у нас быў фуршэт, адна танцзала плюс канцэртная зона, увесь час нехта спяваў ці выступаў.

***(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)***

■ Нагода

# ЖАНЧЫНА — АЗНАЧАЕ ЖЫЦЦЁ

## Матуль ушанавалі ў храме

**Мінулы тыдзень у Беларусі быў прэлюдыяй да Дня маці, які 14 кастрычніка адзначылі мільёны беларускіх жанчын. А кульмінацыяй святкавання стала рэспубліканскае ўрачыстае мерапрыемства «Галоўнае слова ў нашым лёсе — маці». 250 жанчын з усёй Беларусі з'ехаліся ў храм-помнік у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню Айчыны нашай.**

— Вось ужо сямнаццаць гадоў беларускія маці маюць сваё ўласнае свята. Але сэнс у яго куды больш глыбокі, чым гэта падаецца на першы погляд, — мяркуе старшыня Беларускага саюза жанчын, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Надзея Ермакова. — Бо 14 кастрычніка адзначаецца вялікае царкоўнае свята — Пакровы Прасвятой Багародзіцы. А Ісуса Хрыста таксама нарадзіла маці... Менавіта таму мы імкнёмся праводзіць Дзень маці ў храмах. Сюды мы запрасілі мацярок, якія нарадзілі сёлета дзяцей, нягледзячы на пэўныя фізічныя абмежаванні. Без перабольшвання можна сказаць, што яны здзейснілі подзвіг.

Аднак роля жанчыны ў нашым грамадстве ўсё больш нівеліруецца. Цяжка сказаць, што гэта — даніна модзе ці непазбежная гістарычная заканамернасць. Калі яшчэ сто гадоў таму ролі бацькі і маці ў сям'і былі дакладна акрэслены і разведзены, то цяпер яны ўсё больш збліжаюцца. Для кагосьці гэта навацыі, мабыць, і добрыя, але яны не зусім стасуюцца з традыцыйным укладам сям'і.

— Жанчына ў беларусаў заўсёды была ўвасабленнем самага высокага, чыстага, светлага і святога, — лічыць протаіерэй Фёдар Поўны, настаяцель Усіхсвяцкага прыхода горада Мінска. — Становіцца не проста страшна, становіцца трывожна за будучыню чалавечага роду... Ёсць жа такое выказванне: «Слова «жанчына» — замежнага паходжання і ў перакладзе азначае «жыццё». А нашы — адны з самых прыгожых у свеце. Мне згадваецца выпадак, калі я быў у Германіі і вырашыў звярнуцца да адной жанчыны па-нямецку. Аказалася, што яна... з Беларусі.

Дарэчы, менавіта 14 кастрычніка 1996 года ў фундамент храма была закладзена памятная грамата-капсула з пасланнем нашчадкам.

— Гэты храм-помнік яшчэ афіцыйна не ўведзены ў эксплуатацыю. Ён належыць пакуль Міністэрству юстыцыі. Але па-чалавечы мы разумеем, што храм павінен выконваць свае функцыі ўжо цяпер. Міласцю Боскай мы яшчэ не маем даведзенае да канца будаўніцтва царквы, аднак тут ужо цепліцца літургічнае жыццё, — кажа Фёдар Поўны.

Часта да царквы па маральную падтрымку звяртаюцца маці з абмежаванымі магчымасцямі, якім часам даволі цяжка прыстасавацца да навакольнага свету. Аднак, як адзначае сустаршыня Беларускага саюза жанчын Антаніна Морава, іх не трэба называць інвалідамі. Яны такія ж людзі, проста могуць крыху менш. Але таксама радуюцца жыццю, выхоўваюць дзяцей. І робяць гэта, нягледзячы на ўсе натуральныя і штучныя перашкоды. Таму яны, як ніхто, заслугоўваюць пашаны і цёплых слоў — і не толькі ў Дзень маці...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК**

■ Пачын

# РЭАЛЬНЫ ШЛЯХ ДАДОМУ — ПРАЗ ІНТЭРНЭТ

**Паводле статыстыкі, каля 40% беларускіх сем'яў маюць доступ да інтэрнэту з дамашняга камп'ютара. Таму запрашаем усіх неабыякавых наведаць новы адрас у сеціве — www.dadomu.by. «Дарога дадому» — пад такім дэвізам 14 кастрычніка пачаў працаваць новы беларускі інфармацыйны партал. Створаны ён для таго, каб палегчыць пошукі новых сем'яў для дзяцей, якія ўсё яшчэ жывуць у дамах-інтэрнатах ці часовых сем'ях, а таксама дапамагчы людзям, зацікаўленым ва ўсынаўленні ці прыёме дзіцяці пад апеку.**

Адметнасць дабрачыннага праекта ў тым, што гэта некамерцыйная і прыватная ініцыятыва, падтрыманая дзяржаўнымі ўстановамі. Летась падпісанае больш як 500 беларусамі просьба аб стварэнні інтэрнэт-рэсурсу, які змяшчаў бы дадатковую інфармацыю пра дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, паступіла ў Нацыянальны цэнтр усынаўлення Міністэрства адукацыі Беларусі. Ідэя знайшла актыўную падтрымку ў кіраўніцтва цэнтра, Беларускага саюза жанчын, Нацыянальнага банка Беларусі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, Міністэрства аховы здароўя. Усю неабходную тэхнічную працу па запуску парталу бязвыплатна выканала таварыства з абмежаванай адказнасцю «Лайт Вел Арганізэйшн».

Афіцыйным лагатыпам праекта абрана кветачка канюшыны з 4 пялёсткамі, кожны з якіх сімвалізуе пэўную форму прыёму дзяцей на выхаванне: усынаўленне (удачарэнне), апякунства, прафесійны сямейны клопат (прыёмная сям'я, дзіцячы дом сямейнага тыпу), патранат (для тых, хто хоча стаць дзіцяці сябрам, праводзіць з ім выхадныя, запрашаць у госці дадому і г.д.).

Падобныя інтэрнэт-парталы ўжо некалькі гадоў паспяхова працуюць у Расіі, Латвіі, на Украіне. У Беларусі ж да нядаўняга часу ўся інфармацыя была сабрана ў створаным у 1997 годзе Рэспубліканскім банку звестак пра дзяцей, якія падлягаюць усынаўленню. Але звесткі ў ім прадстаўлены ў выглядзе папяровых анкет і даступныя для азнаямлення толькі ў офісах Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення і толькі кандыдатам ва ўсынавіцелі — гэта значыць, тым, хто ўжо атрымаў дазвол органа апекі на ўсынаўленне.

Цяпер апекуны малога, якому патрэбная сям'я, змогуць змяшчаць на партале фота дзіцяці, сціслую інфармацыю аб ім і розных формах магчымага ўладкавання ў сямі. Потым прадстаўнік апекуна — прызначаная загадам службовая асоба — будзе прымаць званкі ад зацікаўленых людзей і кансультаваць іх па пытаннях сямейнага ўладкавання. Стваральнікі партала спадзяюцца, што высілкамі розных людзей атрымаецца дапамагчы кожнаму дзіцяці, якое расце без пастаяннай сям'і, знайсці сваю дарогу — дарогу дадому...

**Даведка «СГ»**

***У нашай краіне клопат аб дзецях, якія засталіся без апекі бацькоў, ускладзены на тры ведамствы:***

***— Міністэрства аховы здароўя сочыць за выхаваннем у дамах дзіцяці малых, у якіх няма сям'і, ва ўзросце ад нараджэння да 3-4 гадоў;***

***— Міністэрства адукацыі адказвае за выхаванне і дабрабыт дзяцей (ад 3-4 гадоў да паўналецця), якія жывуць у дзіцячых дамах, часова знаходзяцца ў прытулках, выхоўваюцца ў дамах-інтэрнатах і часовых прафесійных замяшчальных сем'ях;***

***— Міністэрства працы і сацыяльнай абароны курыруе выхаванне ў спецыялізаваных дамах-інтэрнатах дзяцей рознага ўзросту, якія маюць асаблівасці ў стане здароўя.***

**Ірына КАСЦЮКЕВІЧ**

■ Нататкі прагматыка

# СЯМ'Я ШУКАЕ КВАТЭРУ. ЯКІЯ ШАНЦЫ?



**Гэта толькі на першы погляд здаецца, што любыя жыллёвыя пытанні лёгка вырашаюцца з дапамогай пэўнай колькасці грошай. Калі не жадае, напрыклад, дарослы сын ці дачка жыць разам з бацькамі — праблем няма, збірай грошы і жыві на здымнай кватэры.**

Маладыя сем'і звычайна так і робяць. Аднак апошнім часам асобным сем'ям становіцца праблематычна адшукаць здымнае жыллё.

Аўтар гэтых радкоў сам больш як 10 гадоў жыў з сям'ёй на здымных кватэрах. Першы раз аператыўна шукаць новае жыллё давялося, калі маёй дачцэ споўнілася ўсяго 7 месяцаў. Тады гаспадар аднапакаёўкі, як толькі ўбачыў вільготныя пялюшкі, што сохлі на кухні, амаль адразу і аб'явіў, што яму тэрмінова самому трэба жыць у гэтым памяшканні. Сур'ёзна спрачацца з уладальнікам жылых метраў было немагчыма, бо здымаў я тады кватэру без афіцыйнага афармлення...

## Без дзяцей, але са штампам

Цяпер прыватная арэнда сур'ёзна падаражэла, здымных кватэр катастрафічна не хапае, а ўласнікі «здымных метраў» пачалі ўжо скрупулёзна выбіраць сабе будучых кватарантаў. Прычым падобныя тэндэнцыі назіраюцца не толькі ў сталіцы і абласных цэнтрах, а ў любым больш-менш буйным горадзе.

Амаль усе кватэраздатчыкі пры выбары патэнцыяльных кватарантаў пачалі выкарыстоўваць своеасаблівы дрэс-код. Сёння для іх **найлепшым кліентам лічыцца маладая сям'я без малых дзяцей і хатніх жывёл.** Лепш без дзяцей наогул. Другім па значнасці патрабаваннем з'яўляецца афіцыйная рэгістрацыя шлюбу, пажадана «інтэлігентная» прафесія кватаранта. А вось работнікам сезонных рынкаў могуць і адмовіць. Апошняй экстравагантнай «фішкай» з'яўляецца патрабаванне прад'явіць даведку з пастаяннага месца працы кліента аб сярэднім узроўні заробкаў за апошні год. Бываюць выпадкі, калі ўласніку жылля не падабаецца, што кватарант гучна



размаўляе, занадта вясёлы ці ў сям'і нехта курыць. Праўда, з любога правіла ёсць выключэнні, бо не ўсе гаспадары такія «ворагі».

## Без дагавора ты — кузурка

Існуе некалькі ўніверсальных правілаў для будучых жыхароў здымнага жылля. Кватаранту неабходна пільна прыглядзецца да гаспадароў. Лепш, каб гэта была поўная сям'я без сур'ёзных матэрыяльных ці іншых праблем. Ідэальна, калі ў вашага кватэраздатчыка не будуць «блішчаць» грошы ў вачах, а наадварот, ён разгледзіць вас менавіта як добрага чалавека.

Аднак, бадай, самае галоўнае тут залежыць ад вас. **Неабходна абавязкова рэгістраваць дагавор арэнды ў структуры жыллёва-камунальнай службы.** Менавіта ў гэтым выпадку сям'я будзе ўпэўнена, што кватэру ім законна здае гаспадар жылля. Цяпер заключэнне такога дагавора стала яшчэ больш актуальным, бо існуе забарона на здачу тых кватэр, што былі пабудаваны з выкарыстаннем ільготных крэдытаў, дагэтуль не пагашаных. Няцяжка ўявіць, што будзе з кватарантамі, якія «ўцёмную» жывуць у гэтым жыллі, а апошнім канкрэтна зацікавяцца кампетэнтныя органы.

Пасля заключэння дагавора, неабходна дакладна высветліць «грашовае» пытанне на перспектыву. Каб не было непаразуменняў, удакладніце, праз які тэрмін часу і як моцна можа павялічвацца ці памяншацца арэндная плата. **Нялішне дамовіцца і аб тым, у якіх выпадках і як часта гаспадар можа наведвацца з інспекцыяй у здымную кватэру.** Што трэба рабіць у выпадку аварый камунікацый, калі кватарант затопіць суседнюю кватэру ці яго «зальюць» самога — усе гэтыя моманты лепш таксама прапісаць ужо ў прыватным дагаворы.

Дадзім некалькі парад і гаспадарам арэнднага жылля. Калі жылое памяшканне здаецца зусім маладой сям'і, то добра будзе пазнаёміцца з бацькамі маладых. Іх кантактныя тэлефоны стануць пэўнай гарантыяй вашага спакою. Будзе не лішнім час ад часу звязвацца па тэлефоне ці праз інтэрнэт з суседзямі. Пэўны кантроль павінен быць абавязковы. Але галоўнае — каб вашы дзевяні не перашкаджалі людзям спакойна і камфортна жыць. Добрых кватарантаў таксама ўдзень са свечкаю не знойдзеш!



**Так бывае**

## Арэнда плюс

На якую б суму вы ні дамовіліся з гаспадаром кватэры, хутчэй за ўсё, плаціць у выніку будзеце больш. Першы пункт у спісе дадатковых выдаткаў — «плюс камуналка». Да таго ж гаспадар з задавальненнем «павесіць» на вас яшчэ і адзіны падатак за здачу кватэры ў арэнду. Пэўныя праблемы могуць узнікнуць і з «камуналкай»: плацяжы істотна павялічацца, калі ў кватэры прапісана недастатковая колькасць жыхароў ці калі там не зарэгістраваны ніхто.

## «Дзеці? Дзякуй, не»

Тыповы выпадак: сталічная сям'я вырашыла пабудаваць вялікую новую кватэру, а старую маленькую прадалі. Усё было добра, пакуль гаспадары здымнай двухпакаёўкі не ўбачылі цудоўную інтэлігентную сям'ю ў поўным складзе. Трое малых дзетак спужалі дарослую цётку амаль да заікання. «Вы што, звар'яцелі? Мінчане, з вышэйшай адукацыяй і такое... Яно вядома, дзеткі — кветкі, аднак не для нас», — катэгарычна сказала кабета. Шматдзетная сям'я больш за два тыдні шукала гаспадароў без «забабонаў».

## Самасёлам тут не месца

Аднойчы раніцай першага студзеня ў суседнім пад'ездзе я назіраў сумную карціну. З двума вялікімі торбамі каля дарогі стаяла зусім яшчэ юная дзяўчына, а на лаўцы сіратліва ляжаў посуд з навагодняй вячэрай... Студэнтку з палове дзявятай выставілі на вуліцу. Рэч у тым, што яна, па дамоўленасці з гаспадаром, жыла ў кватэры з сяброўкай. Суседка на святы з'ехала, а ў кватэры з'явіўся каханы...

**Сяргей КУРКАЧ**




**Ці варта рэгістраваць шлюб? Або можна выдатна жыць і без штампа ў пашпарце? Калі і дзе нараджаць дзіця, як яго выхоўваць? Маладой сям'і лепш жыць з бацькамі ці асобна? Мужчынскі і жаночы погляды на многія прынцыпова важныя пытанні часта бываюць дыяметральна супрацьлеглымі. Хто мае рацыю? Ісціна, як звычайна, недзе пасярэдзіне. А першае пытанне, якое мы прапануем да абмеркавання, гучыць так:**

# ЦІ ПАТРЭБНЫ ДЗІЦЯЦІ САДОК?

## Павел МАЗУРКЕВІЧ, прадпрымальнік, бацька дваіх дзяцей:

— Маё стаўленне да садкоў неадназначнае. З аднаго боку, я прыхільнік таго, што дзіця павінна вучыцца сацыяльнаму ўзаемадзеянню, а садок для гэтага — найлепшае месца. З другога ж, садкі ў нашай краіне, як і ўся адукацыя, працуюць па методыках мінулага стагоддзя (каб зразумець, што я маю на ўвазе, дастаткова проста крыху прачытаць пра скандынаўскія ці ізраільскія дашкольныя ўстановы). Пра кваліфікацыю выхавальнікаў наогул гаварыць не хочацца: такое адчуванне, што цяпер бяруць усіх ахвотных — абы хоць сярэдняя адукацыя была. А ранняе дзяцінства — гэта самы важны этап у развіцці чалавека. І тут кожны з бацькоў выкручваецца па-свойму. Мы, напрыклад, стараемся самі даплачваць выхавацелькам, каб утрымаць іх на працоўных месцах (яны больш-менш задавальняюць усіх бацькоў) плюс максімальна «загрузіць» дзіця гурткамі. На жаль, садок — гэта ў большасці выпадкаў вымушаная мера, а не свядомы выбар бацькоў.

## Алена ТАПАРКОВА, эканаміст, маці дзвюх дачок:

— Я адназначна «за»! Гляджу на сваіх малых: яны вучацца кантактаваць з аднагодкамі, вучацца правілам паводзін з незнаёмымі і маланаёмымі дарослымі, а галоўнае — увесь час даведваюцца пра нешта новае і адно ад аднаго, і ад выхавальнікаў. Можна доўга разважаць, добрыя ці дрэнныя методыкі прымяняюцца ў дзіцячых садках, але ў любым выпадку з дзецьмі там займаюцца, даюць новыя веды і замацоўваюць ужо засвоеныя...

Сваіх дзяўчат я аддала ў садок нават крыху раней, чым у мяне скончыўся дэкрэт. Не таму, што трэба было тэрмінова выходзіць на працу ці мне асабіста захацелася «адпачыць» ад дзяцей, а з той прычыны, што ўбачыла: толькі з мамай дзяўчатам ужо сумна, яны «даспелі» да таго, каб сацыяльна адаптавацца, кантактаваць з іншымі дзецьмі і дарослымі. Аб сваім рашэнні не пашкадавала ні разу. Цяпер, дарэчы, дзеці ходзяць і ў садок, і ў развіваючы цэнтр, і, па маіх назіраннях, адно другому не замінае. Гэтыя заняткі дзеці ўспрымаюць па-рознаму: у садку яны праводзяць увесь дзень — ядуць, спяць, гуляюць, танцуюць, малююць, сварацца і мірацца з іншымі дзецьмі, — фактычна жывуць; а ў цэнтр мы прыходзім на некалькі гадзін, як на дадатковыя заняткі ў гурток.

# «НА НАШЫМ ВЯСЕЛЛІ ВЫКРАДАЛІ ЖАНІХА...»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Але потым і яны ўцягнуліся, і ўжо напрыканцы вечара быў адзін суцэльны «казантып»... Вялі сваё вяселле мы самі. І справа не ў тым, што жадалі неяк сарыгінальнічаць... Проста мы столькі пабачылі і правялі стандартных, правільных вяселляў, што прыстойна сесці за сталы ў сваё свята не маглі ніяк. Хацелі зрабіць, як нам хочацца, а не як загадвае традыцыя. Уваходзілі ў залу пад «Too Funky» Джорджа Майкла, і ў канцы вечарынкі ўсіх гасцей запрасілі ў боўлінг, а самі... паехалі рыхтавацца да заўтрашняга эфіру. Мы ж ні ў якія водпускі не сыходзілі — ні ў «мядовыя», ні ў «цяжарныя». Асабіста я напярэдадні вяселля да адзінаццатай вечара яшчэ сцэнарый нейкі пісала... пакуль Глеб быў на «хлапечніку».

**Нічога дзіўнага і страшнага ў сумесных родах няма. Не ведаю, чаму там некаторыя страчваюць прытомнасць... Я не страчваў. Затое мог пракантраляваць усе этапы.**

*Глеб:* Тома ўжо ўсё расказала. А «хлапечнік» у мяне быў, гэта праўда. Але я яго не помню...

**— Дарэчы, зусім хутка ў вас прыгожая дата — 10-годдзе, яно ж ружовае вяселле. Ці плануеце неяк адзначыць?**

*Тома:* Глеб, плануем?

*Глеб:* А як жа... Я, праўда, буду ў камандзіроўцы.

**— У кожнай сям'і здараюцца крызісы — а ў творчай, напэўна, яшчэ і сутыкаюцца амбіцыі. У вас ці находзіў «цюк на крук»? Хто першы саступае, калі раптам пасварыліся?**

*Тома:* Зараз у нас няма сумесных праектаў, а яшчэ паўгода таму, калі разам працавалі на «Радыусе», — сварыліся пастаянна. І менавіта па рабочых пытаннях. Наогул, мы абое тэмпераментныя людзі, заводзімся з паўабарота...

*Глеб:* Не, у нас ёсць сумесны праект — сям'я. Я спрабую цвяроза ацаніць, што ж мы маем пасля 10 гадоў сумеснага жыцця. Трое дзяцей, машыны-кватэры, некалькі моцных тэле- і радыёпраектаў, прафесійныя ўзнагароды, спрэчкі-прымірэнні, кот, хамяк. Па-мойму, няблага папрацавалі.

**— Калі не сакрэт, якія рысы характару адно ў адным вы па-ранейшаму пяшчотна любіце, а з якімі складана прымірыцца?**

*Тома:* Я па-ранейшаму люблю яго драйвовасць і талент. З ім нясумна і цікава. Калі муж страляе ў цiры — то трапіць у «яблычак», калі вырашыць навучыцца гуляць у боўлінг — то стане чэмпіёнам, калі раптам пагодзіцца паклеіць шпалеры — паклеіць ідэальна, а калі пойдзе разбірацца ў ЖЭС — вернецца з перамогай. А не падабаецца, як і раней, яго скарпіёнская жорсткасць. За дзень Глебу абавязкова трэба вынішчыць,ператварыць у попел аднаго-двух-трох чалавек. Часта гэта бываем мы.

*Глеб:* Мне ў ёй усё падабаецца... Акрамя кансерватыўнасці. Я паўгода ўгаворваў яе набыць пасудамыечную машыну. Яна ж баіцца любой тэхнікі. І тут супраціўлялася да апошняга, а цяпер без пасудамыйкі жыцця не ўяўляе. Тое ж з усім — ноўтбук, тэлефон... Да апошняга ўпіраецца, пакуль апарат ужо не ламаецца. Машыну дагэтуль не водзіць, хоць і правы, і машына ёсць. І самалётам лятаць баіцца. Словам, жонка ў мяне зануда і баязліўка.

*Тома:* А ў мяне муж — тыран і дэспат.

*Глеб:* Я цябе таксама кахаю...

## «Я ЗААХВОЧВАЮ І ПЕШЧУ, ГЛЕБ — КАНТРАЛЮЕ І ПРЫМЯНЯЕ САНКЦЫІ»

Сёння ў сям'і Ялфімавых трое дзяцей: Мацвей, Каця і малодшы, 5-гадовы Гоша. Тамара Лісіцкая не ўтойвае, але і не падкрэслівае, што старэйшы сын — ад першага шлюбу, які не вытрымаў выпрабаванне крызісам 1998 года.

**— Адна справа — заваяваць каханую жанчыну, і зусім іншая — заваяваць давер яе дзіцяці. Як складваюцца адносіны Глеба з Мацвеем?**

*Тома:* Нялёгка, але Глеб, у прынцыпе, не сентыментальны хлопец... Мацвей — інтуіт, аматар паразважаць, крыху лянівы і летуценны. А Глеб — сэнсорык, жорсткі, прынцыповы, патрабавальны. Натуральна, пры такім раскладзе будзе іскрыць. Потым, Мацвею зараз 14 — складаны ўзрост. Словам, я як перамоўнік-міратворац заўжды напагатове. Разумею, што абое рабое, але і разумею, што абодва маюць рацыю. Мацвей мае права на свой стыль жыцця і на дзяцінства, а Глеб мае права (і нават абавязаны) навучыць яго быць мужчынам.


2012 год. Мацвей і Каця з татам кормяць галубоў у Барселоне.

*Глеб:* У мяне ў гэтым сэнсе таксама было не ідэальнае дзяцінства. Мяне навучылі быць мужчынам у арміі, а да таго выхоўвала маці. Я не хачу, каб Мацвей сутыкнуўся з тым жа, з чым я ў свой час. Няхай ён лепш ад мяне пачуе ўсё непрыемнае і навучыцца абараняцца.

**— Наколькі я ведаю, дваіх малодшых дзяцей вы нараджалі разам. З'ява ў нашым грамадстве ўсё яшчэ нязвыклая, многія мужчыны на гэта не асмельваюцца. У вашым выпадку рашэнне было агульным? Як адбіўся гэты вопыт на ўзаемаадносінах?**

*Тома:* Я ўсім жанчынам рэкамендую нараджаць з мужам. Плюсоў значна больш, чым мінусаў. У рэшце рэшт, удваіх нараджаць лягчэй і бяспечней. Глеб быў маім сувязным паміж сусветамі. Кацю я пачала нараджаць яшчэ ў палаце, праз 20 хвілін пасля амніятаміі, амаль без схватак, нават медсястра не адразу паверыла. Калі б не Глеб, які пабег, знайшоў і прывёў з «лятучкі» дактароў, — не ведаю, што было б... І масіраваў мяне, і выслухоўваў...

*Глеб:* Нічога дзіўнага і страшнага ў сумесных родах няма. Не ведаю, чаму там некаторыя страчваюць прытомнасць... Я не страчваў. Затое мог пракантраляваць усе этапы.

**— У сэнсе выхавання дзяцей — у вас у сям'і дэмакратыя альбо манархія?**

*Тома:* Манархічны дуалізм. (*Усміхаецца.*) Я прытрымліваюся ямайска-скандынаўскіх прынцыпаў, а Глеб — нямецкі кайзер. Я сябрую, заахвочваю і пешчу, Глеб — кантралюе, патрабуе і прымяняе санкцыі. Зразумела, што пры такім раскладзе яму цяжэй, але...

*Глеб:* Я хачу навучыць іх адказваць за свае словы. Спатрэбіцца.

*Тома:* Стараемся браць дзяцей з сабой на працу, на мерапрыемствы, якія ладзім: няхай бачаць усё жыўцом, шмат чаго словамі не растлумачыць.

**На карысць мацярынства я вярнулася з Масквы ў Мінск, пакінуўшы працу на расійскім канале. Усе тры разы падчас цяжарнасці і кармлення грудзьмі адмаўлялася ад «доўгайграючых» праектаў.**

**— Хто з вас ходзіць на бацькоўскія сходы, у дзіцячую паліклініку? І якім чынам вырашаеце, на якія секцыі і гурткі запісаць дзяцей?**

*Глеб:* На бацькоўскія сходы ходзім па чарзе — ідзе той, хто вольны. Сходы ж звычайна праводзяць а шостай вечара, а ў нас праца ненармаваная. Часам я іду на адзін сход, а Тома на другі — яны ж бываюць ва ўсіх класаў у адзін дзень.

*Тома:* Гурткамі і дзіцячым вольным часам займаюся я. Але Глеб кожныя выхадныя возіць самага малодшага, Ігарка, у развіваючую школу. Што да занятасці — у Мацвея цяпер дадатковая англійская, маляванне і наша з ім агульная трэнажорная зала; у Каці — трэці клас музычнай школы і ансамбль (яна там ліха барабаніць) плюс маляванне; у Гошыка — развіваючая школа і лагапед.


2009 год. Са старэйшымі дзецьмі ў Вялікабрытаніі.

**— Дарэчы, хто-небудзь з дзяцей выказваў жаданне пайсці па бацькоўскім шляху? Можа, Каця з мамінай дапамогай піша казкі, а Мацвей марыць пра кар'еру тэлевядучага?**

*Глеб:* Не навязваем.

*Тома:* Яны ведаюць, як гэта — быць тэлевядучым, стаяць на сцэне. Ведаюць, як пішуцца кнігі. Акрамя інфармацыі і генаў, у іх ёсць і пэўны вопыт. А далей няхай самі выбіраюць.

## «НЕ ПЕРАШКАДЖАЦЬ АДНО АДНАМУ РАЗУМНЫМІ ПАРАДАМІ»

**— Акрамя прафесійнай занятасці ў розных сферах, ва ўсіх бацькоў ёсць яшчэ паўсядзённыя справы: праверка школьных «дамашак», забеспячэнне побыту, пабочная «грамадская нагрузка»... Сям'я Ялфімавых бліскуча з усім гэтым спраўляецца — нездарма ж летась вы сталі адной з лепшых шматдзетных сем'яў Мінска. Лагічна, што не адну мяне цікавіць пытанне: як вы ўсё паспяваеце?**

*Тома:* Гэта цяжка. Кожны дзень жывём з максімальнай нагрузкай і такой жа максімальнай аддачай. Я стараюся паралельна некалькі спраў рабіць, тады хоць нешта паспяваеш... Гатую і ўрокі правяраю, альбо пішу сцэнарый, а Гоша побач у гэты час кветкі і літары мне малюе для ўзняцця настрою.

*Глеб:* А я правільна планую час. Трэба займацца чымсьці адным.

*Тома:* Вось таму паспяваю я, а Глеб займаецца чымсьці адным.

*Глеб:* Калі мы абое будзем мітусіцца, тады і будзе тлум.

*Тома:* Насамрэч мы абодва — універсальныя рабочыя механізмы, кожны са сваім алгарытмам працы. Глеб працуе па максімуме ў адным рэжыме, я — у іншым. І змешваць гэтыя стылі небяспечна. У выніку мы разам паспяваем вельмі многае. Галоўнае — не перашкаджаць адно адному разумнымі парадамі.

**— Тамара Лісіцкая вядомая не толькі як беларуская пісьменніца, сцэнарыст і абаяльная тэлерадыёвядучая, але і як актыўны ўдзельнік дабрачынных праектаў. Гэта ініцыятыва — асабістая? Ці ў ёй таксама задзейнічана ўся сям'я?**

*Тома:* Гэта традыцыя. Мая мама ўвесь час дапамагала камусьці, ездзіла ў бальніцы даглядаць нейкіх знаёмых, якіх больш нікто наведаць не мог. Гэта было нармальна. Цяпер гэта норма і для Каці, Мацвея і Гошы. Гоша гэтым летам ездзіў са мной у сацыяльны прытулак, падрыхтаваўшы асабісты падарунак — цацкі для дзетак.

**Што мы маем пасля 10 гадоў сумеснага жыцця? Трое дзяцей, машыны-кватэры, некалькі моцных тэле- і радыёпраектаў, прафесійныя ўзнагароды, спрэчкі-прымірэнні, кот, хамяк... Па-мойму, няблага папрацавалі.**

**— Пры такім напружаным графіку, як у вас, ці часта ўдаецца адпачыць усім разам? Ёсць любімыя маршруты ў Беларусі і за межамі?**

*Глеб:* Мы якраз адпачываем толькі разам. Аднойчы за дзесяць гадоў выбраліся без дзяцей на тыдзень у Германію, і тое ў камандзіроўку. У астатні час, калі едзем, то як мінімум са старэйшымі.

*Тома:* Падарожжы — наш фан. Чатыры гады запар ездзілі з палаткамі па Еўропе. Дзеці ўжо бачылі Стоўнхэндж, Эйфелеву і Пізанскую вежы, Везувій, Атлантычны акіян, Венецыю, іспанскія пячоры, швейцарскія азёры, бельгійскія манастыры. Мы ў горы падымаліся з імі, на веласіпедах каталіся па Памплоне, пасля забегу быкоў, на карабліках пільнавалі Лох-Нескую пачвару ў Шатландыі... Не ездзілі толькі сёлета, бо было шмат працы ў Мінску. Затое паспелі гэтым летам з імі сплавіцца на байдарках па Іслачы...


Лета 2013. Сям'я Ялфімавых у поўным складзе сплавілася па Іслачы.

**— Неяк у інтэрв'ю Тамара сказала, што галоўны яе праект — мацярынства, сям'я і дзеці. Ці даводзілася выбіраць паміж сям'ёй і працай?**

*Тома:* Даводзілася. На карысць мацярынства я вярнулася з Масквы ў Мінск, пакінуўшы працу на расійскім канале. Усе тры разы падчас цяжарнасці і кармлення грудзьмі адмаўлялася ад «доўгайграючых» праектаў. А цяпер з-за працы, на жаль, нешта ўпускаю ў мацярынстве. Бываюць дні, калі трэба здаць, напрыклад, важны сцэнарый, і я з-за стала ўвесь дзень не ўстаю. Дзеці падыходзяць ціхенька, уздыхаюць і адыходзяць... Сэрца пераварочваецца. А што рабіць?

**— На вашу думку, шчаслівая сям'я — гэта...**

*Глеб:* Ну, вось наша.

Гутарыла **Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

**Фота з асабістага архіва герояў.**

■ Пытанне псіхолагу



**На пытанні чытачоў адказвае кіраўнік аддзела прыкладной педагагічнай псіхалогіі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, псіхолаг з 16-гадовым досведам кансультавання Алена ОСІПАВА.**

## З НАЙЛЕПШЫХ ПАМКНЕННЯЎ

*«Сын з нявесткай і ўнучкай жывуць з намі. Вядзём агульную гаспадарку, кватэру аплачваем усе разам; але маладых стараемся фінансава не нагружаць: разумеем, што на сваю кватэру збіраюць. Я хоць і пенсіянерка, але падпрацоўваю, так што магу і дзецям у скарбонку тое-сёе падкінуць, і ўнучку часам парадаваць гасцінцамі. Але апошнім часам стала заўважаць, што да маіх падарункаў усе прызвычаіліся, а бывае, і ўнучка незадаволена спытаецца: «Бабуля, а чаму ты мне цукерак не купіла — ты што, мяне больш не любіш?». Думаю, наўрад ці дзіця само такое выдумае. Але на ўсе мае спробы даведацца, адкуль вецер дзьме, нявестка толькі робіць вялікія вочы: «Марыя Антонаўна, мы вам так удзячныя за дапамогу, вы нас вельмі выручаеце, бо ў нас з Лёшам зарплаты невялікія». І цяпер я ў разгубленасці: ці то сама сабе напрыдумляла, што бабулін клопат успрымаюць як абавязак, быццам так і павінна быць, ці то сапраўды маладых разбэсціла?*

**Марыя КУЗЬМІЧ,** *г. Віцебск.*

Марыя, вы, напэўна, вельмі хочаце, каб ваш сын быў шчаслівы ў сваёй маладой сям'і. А каб гэта адбылося, яны мусяць навучыцца жыць, як жывуць сем'і, у тым ліку весці ўласную гаспадарку, зарабляць самім на жыццё, размяркоўваць бюджэт і ведаць цану заробленым грашам.

Чым сённяшняе жыццё членаў сям'і вашага сына адрозніваецца ад жыцця дзяцей у сям'і? Мяркуючы па вашым лісце, складваецца ўражанне, што ў вас з прыходам у дом нявесткі і з'яўленнем унучкі проста павялічылася колькасць дзяцей. І яны ў дачыненні да вас паводзяць сябе як дзеці, успрымаючы як належнае ўсё, што вы для іх робіце, і нават па-дзіцячы спаборнічаюць адзін з адным за вашу любоў.

Маладая сям'я павінна мець максімальную аўтаномнасць, якая толькі магчыма на вашай тэрыторыі, і гэта будзе спрыяць іх станаўленню як сям'і. Занадта вялікая колькасць бацькоўскай дапамогі ў любой яе форме хутчэй нашкодзіць маладым, нават калі яны ў гэтай дапамозе маюць патрэбу. Сын і нявестка мусяць навучыцца самастойна спраўляцца з цяжкасцямі, несці асноўную адказнасць за выхаванне і догляд дзіцяці. І тады ўнучка будзе разумець, што вы — яе бабуля і не абавязаны яе забяспечваць цукеркамі, а песціце толькі тады, калі ў вас ёсць такая магчымасць.

Мне здаецца, вам цяпер трэба вызначыцца, у якім выглядзе ці аб'ёме ваша дапамога маладой сям'і не будзе перашкаджаць развіццю іх самастойнасці, фарміраванню роляў мужа, жонкі, бацькі і маці.

ооо

***Паважаныя чытачы, калі ў вашай сям'і ўзнікла складаная сітуацыя, канфлікт, у якім не ўдаецца разабрацца самастойна — калі ласка, спытайце парады ў спецыяліста. Чакаем вашых лістоў на паштовы адрас рэдакцыі альбо электронную скрынку info@zvyazda.minsk.by з паметкай: «Сямейная газета. Пытанне псіхолагу».***

■ Вопытны ўчастак

# ЯК НАКАРМІЦЬ КАПРЫЗУЛЮ?

**Для многіх бацькоў, не ўзгадваючы ўжо бабуль, апетыт дзіцяці — ці не прамое сведчанне яго здароўя. І калі дзіця іншым разам адмаўляецца ад ежы, гэта ператвараецца ў суцэльную катастрофу для бацькоўскіх нерваў, у паходы па ўрачах, угаворы, прымусы і «танцы з бубнам» на кухні. Між тым, педыятры і дзіцячыя псіхолагі раяць бацькам менш хвалявацца з гэтай нагоды ды прытрымлівацца шэрагу нескладаных правілаў.**



### НЕ ПРЫМУШАЙЦЕ

Гэта першы і, бадай, самы галоўны прынцып. Харчовы гвалт — прымус есці і тым больш пакаранне дзіцяці за недаедзенае — можа прывесці да псіхалагічных праблем, разладу страўніка і нават парушэння абмену рэчываў. Калі дзіця адмаўляецца нават ад самай смачнай стравы — значыць, яно проста не галоднае.

### НЕ ЎГАВОРВАЙЦЕ

«Лыжачку за тату, лыжачку за маму, за кошку, за мышку»... Гэты правераны пакаленнямі метад — таксама далёка не лепшае рашэнне. Дзіця хутка прызвычайваецца да ўгавораў, капрызіць і пастаянна «пераключаецца» на штосьці іншае. Угаворы (прычым абавязкова ў ненавязлівай форме) дапушчальныя ў рэдкіх выпадках: напрыклад, калі трэба даць горкія лекі альбо піць шмат вадкасці падчас хваробы.

### НЕ АБЯЦАЙЦЕ

«З'ясі абед — куплю марозіва». Падобныя абяцанні могуць стаць яшчэ больш небяспечнымі за ўгаворы. Падкупляць дзіця нельга, інакш у хуткім часе вы атрымаеце маленькага шантажыста, які нават снедаць будзе толькі ў абмен на штосьці.

### НЕ СПЯШАЙЦЕСЯ

Безумоўна, раздражнее, калі дзіця доўга корпаецца ў талерцы і нібыта засынае з чарговай лыжкай кашы ў роце. Але, па-першае, можа так яно і быць (і тут вам вырашаць, аддаць перавагу сну ці абеду), а па-другое, у кожнага дзіцяці свой тэмп харчавання. Спаборніцтвы «хто хутчэй» тут не пройдуць: малыя, асабліва ва ўзросце, калі быць першымі для іх вельмі важна, могуць проста падавіцца. Дый для стрававання больш карысці прынясе старанна пережаваная ежа, чым спехам праглынутыя кавалкі. Калі вы сапраўды спяшаецеся, выберыце штосьці адно: альбо справа пачакае, альбо сняданак, абед ці вячэра няхай застануцца недаедзенымі.



### НІЯКІХ ПАБОЧНЫХ РАЗДРАЖНЯЛЬНІКАЎ

Кніжкі, цацкі, фарбы і ўсё астатняе не павінны адцягваць увагу дзіцяці ад абеду. На стале — толькі талерка. І, зразумела, ніякай ежы з уключаным тэлевізарам, калі не хочаце выпрацаваць у дзіцяці шкодную звычку! Аднак калі яно ўсё адно круціцца за сталом і імкнецца збегчы да лялек ці машынак — значыць, яшчэ не прагаладалася. Не прымушайце (гл. пункт 1).

### НЕ ХВАЛЮЙЦЕСЯ

Для многіх гэта «не» найбольш складанае ў выкананні. Аднак, паверце, ад бясконцых роспытаў: «Што ты сёння еў? А колькі?» — ні дзіцяці, ні вам лягчэй не будзе. Калі дзіця галоднае, яно абавязкова, прычым гучна, аб гэтым паведаміць.

Паставіўшы талерку перад дзіцем, не стойце ў яго над душой. Не з'есць — прыбірайце талерку без журботных каментарыяў і да наступнага прыёму ежы ніякіх «цукерачных» перакусаў.

Педыятры запэўніваюць, што дзецям да 5 гадоў трэба не так шмат ежы, як падаецца бацькам. Бліжэй да 7 гадоў добры апетыт усталёўваецца, і ў школьным узросце скаргаў на тое, што дзіця дрэнна есць, паступае значна менш.

**Каб праблем з харчаваннем было значна менш, урачы і выхавацелі дзіцячых садкоў раяць:**

— навучыце дзіця «харчовым забаронам»: нельга есці тое, што ўпала на падлогу, няхмытую садавіну і гародніну, адны цукеркі;

— сачыце не за колькасцю, а за якасцю ежы: яна павінна быць разнастайнай, збалансаванай, прывабна афармленай; і не палохайце дзіця вялікімі порцыямі;

— набудзьце дзіцяці асобны набор посуду — прыгожы і невялікі па памеры. Калі на дне талеркі ёсць малюнак — гэта дадатковы стымул даядаць да канца;

— прытрымлівайцеся рэжыму харчавання, снедаючы, абедаючы і вячэраючы прыкладна ў адзін і той жа час;

— не карміце адразу пасля прагулкі, вяртання з дзіцячага садка — дайце крыху часу адпачыць, «астыць» ад уражанняў;

— не давайце дзве і больш стравы адначасова. Хто ж будзе есці суп, калі побач — любімая «макарошка»?

■ Наш рэйтынг

# КНІГІ, ЯКІЯ ВАРТА ПРАЧЫТАЦЬ БАЦЬКАМ І ДЗЕЦЯМ:

**Святлана МАНГАСАРАВА, начальнік аддзела абслугоўвання і дакументазахоўвання Рэспубліканскай навукова-педагагічнай бібліятэкі:**

**1. «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава.** Уласна, наконт выбару гэтага твора можна нічога больш не тлумачыць: я глыбока перакананая, што яго хоць бы раз у жыцці павінен прачытаць кожны выхаваны і культурны чалавек. Менавіта прачытаць цалкам, а не паглядзець экранізацыю ці пазнаёміцца з выбранымі часткамі ў хрэстаматыі.

**2. «Закон вечнасці» Надара Думбадзэ.** На мой погляд, выдатны ўзор савецкай грузінскай літаратуры. Адна з тых кніг, якія лечаць душу і нагадваюць, што, нягледзячы ні на якую мярзоту, у свеце ёсць добрыя, светлыя людзі, якімі рухае любоў. Дарэчы, памятаеце пранізлівы фільм «Кукарача»? Дык вось, ён зняты таксама паводле аповесці Думбадзэ.

**3. «Плаха» Чынгіза Айтматава.** Раман са школьнай праграмы, многімі падлеткамі толькі з гэтай прычыны не ацэнены як след. Кніга, па вялікім рахунку, не пра ваўкоў і не пра наркагандляроў, а пра тое, што кожнаму ў жыцці даецца свой шлях і свой крыж...

**4. «Ладдзя роспачы» Уладзіміра Караткевіча.** З усіх класікаў беларускай літаратуры ён, мне падаецца, найбольш блізкі і зразумелы сучаснікам. «Рабі нечаканае, рабі, як не бывае, рабі, як не робіць ніхто, — і тады пераможаш». Дзеля ўсведамлення гэтай мудрасці раю пазнаёміць дзяцей не толькі з гэтай навелай, а ўвогуле з творчасцю Уладзіміра Сямёнавіча.

**5. «Паліяна» Элінор Портэр.** Гэтай кнізе амерыканскай пісьменніцы ўжо больш як 100 гадоў, а яна актуальная і сёння. Такая немудрагелістая і складаная адначасова гісторыя пра маленькую сірату, якая, насуперак жыццёвым абставінам, ва ўсім бачыла светлы бок і незвычайнай «гульнёй у радасць» дапамагла многім людзям зразумець, што яны лепшыя, чым самі лічаць. Для дзяцей, а больш нават для дарослых — «практычны дапаможнік па ўменні радавацца жыццю і ўсведамленню, што безвыхадных сітуацый не бывае».

**Увага: конкурс!**

**Паважаныя чытачы, нагадваем, што наш творчы конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Дасылайце, калі ласка, свае фатаграфіі і звязаныя з імі сямейныя гісторыі на рэдакцыйную пошту альбо на электронную паштовую скрынку: info@zvyazda.minsk.by. Аўтар найлепшага фота з гісторыяй будзе адзначаны каштоўным прызам.**

**Да ўдзелу ў конкурсе НЕ ПРЫМАЮЦЦА вясельныя фотасесіі, леташнія здымкі з курорта і сучасныя фота дзяцей. Дасланыя фота АБАВЯЗКОВА будуць вяртацца ўладальнікам!**

# МЕСЦЫ, ЯКІЯ ТРЭБА НАВЕДАЦЬ СЯМ'ЁЙ

**Юрый МАКСІМОВІЧ, перакладчык:**

**1. Мора.** У прынцыпе, любое, акрамя Мінскага — але мы, недагрэўшыся, звычайна выбіраем, дзе пацяплей. Я ўпэўнены, што пры недахваце ёду ў беларусаў кожны павінен выязджаць на мора хоць бы раз на год. Не кажучы ўжо аб тым, што гэта карысць для нервовай сістэмы і проста выдатны адпачынак!

**2. Цырк.** Дзецям, як правіла, прадстаўленні падабаюцца, дарослым — каму як. Але, па-першае, каб зразумець, любіш ты цырк альбо не, трэба хоць раз яго наведаць, а па-другое, дзеля шчаслівых дзіцячых вачэй можна і «пацярпець» прадстаўленне. Нам з пляменнікам спадабалася.

**3. Заапарк.** Месца таксама, шчыра кажучы, спрэчнае і асабіста ў мяне выклікае негатыў. Давялося пабываць у віцебскім і мінскім заапарках — і там, і там умовы далёкія ад ідэальных. Але сучасным гарадскім дзеткам, якім не дазваляюць трымаць дома сабаку ці кошку, ды яшчэ пры адсутнасці бабулі ў вёсцы, браку кантактаў з жывой прыродай. Часта для іх гэта адзіная магчымасць «пазнаёміцца» з казой, авечкай, убачыць мядзведзя, дзікоў, зайцоў і г.д.

**4. Музей архітэктуры і побыту ў Строчыцах.** Месца, цікавае для ўсіх пакаленняў. Наогул, на маю думку, звязаныя з нашай культурай і гісторыяй музеі трэба наведваць як мага часцей, прычым не са школьнай экскурсіяй альбо з калегамі па працы, а менавіта сям'ёй, каб нетаропка ўсё разгледзець, патлумачыць незразумелае, ну і памацаць, што можна...

**5. Хатынь.** Без варыянтаў. Сваю гісторыю трэба вучыць не толькі па падручніках.

*У народзе кажуць: «ЯК БАБА ДА ДЗЕДА — ТАК І ДЗЕД ДА БАБЫ».*

**Адказная за выпуск Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

■ Культурная правінцыя

# БЯЛЫНІЧЫ НА «КАЛОНЕ СЛАВЫ»

*У раённым цэнтры працуе выстава вядомага беларускага мастака Віктара Альшэўскага*

**Культура мае вытокі, і для творчых людзей яна пачынаецца з малой радзімы. Віктар Альшэўскі нарадзіўся ў вёсцы Вугольшчына на Бялынiччыне, і свой творчы шлях пачаў з малюнка рыцара на сцяне хаты. Сёння ён — прафесар, кіраўнік Цэнтра сучасных мастацтваў, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аднак са сталіцы мастак часта вяртаецца ў родныя мясціны, каб падзяліцца творчымі здабыткамі і натхніцца на новыя.**



— Культура заўсёды пачынаецца з правінцыі, — упэўнены Альшэўскі. — Вялікія гарады, якія выраслі, часам разбураюць нейкі такі філасофскі настрой. Той, пра які мы гаворым — ад зямлі.

Бялыніцкі раённы мастацкі музей імя Вітольда Бялыніцкага-Бірулі прадставіў творы земляка, аб'яднаныя пад назвай «Калона славы». Выстава прысвечана 60-годдзю Віктара Альшэўскага.

— Мастакі вяртаюцца дадому, да роднага парога, каб паказаць вынікі сваёй працы, — сказаў на адкрыцці **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**. — Карціны Альшэўскага нібыта пракладваюць масток паміж мінулым і будучыняй, і будучыня гэтая прыемная.

На выставе ў Бялынічах — больш за два дзясяткі мастацкіх палотнаў. На «Калону славы» пастаўлены нацыянальныя і культурныя каштоўнасці краіны. Творы маюць свой пазнавальны стыль: новыя формы падкрэсліваюць сутнасць. Тут ёсць і карціны, якія Віктар Альшэўскі падарыў раённаму музею: напрыклад, «Канверт для Бялыніч» з выявай Вітольда Бялыніцкага-Бірулі, якога мастак называе «святлом, за якім заўсёды ішоў».

— Бялынічы і мая радзіма заўсёды знаходзяцца на калоне славы: яны натхняюць мяне і даюць магчымасць для стварэння новых твораў, — сказаў мастак. — А ўвогуле, кожны з нас павінен на гэтую калону славы ствараць нешта новае, сваё адметнае, што будзе з'яўляцца часткай нашай культуры.

Юбіляра ў Бялынічах віншавалі, рабілі падарункі. Вылучыліся дары Цяхцінскага сельсавета, дзе месціцца родная вёска Віктара Альшэўскага: кошык чырвоных спелых яблыкаў і журавіны з мясцовага лесу. А народны ансамбль «Журавінка» выканаў вясёлыя прыпеўкі пра земляка. У тым ліку і пра самога мастака. Мастак выказаў удзячнасць землякам і ўсёй Магілёўшчыне, таму што лічыць яе «самым прыгожым і самым шчырым краем».

— Калі ў мяне негатыўны настрой, я знаходжу ў карцінах Альшэўскага пазітыў, гэта самае галоўнае. І калі ён прывозіць свае работы, то ў іх ён нясе сваю цеплыню, — прызнаўся **начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ**.

Урэшце Віктар Альшэўскі загасіў свечкі на імянінным торце і... адразу ўсім расказаў пра сваё вялікае жаданне:

— Я загадаў, каб у Бялынічах стварылі вялікі музей, які ён і павінен быць на радзіме такога мастака, як Бялыніцкі-Біруля, — сказаў юбіляр. — І каб сабралі там самыя лепшыя творы мастакоў, якія нарадзіліся на Бялыніччыне.

Няхай спраўдзіцца такое добрае жаданне!

**Ілона ІВАНОВА. Фота аўтара.** *Бялынічы.*

■ З адкрытай душой

# МУЗЫКА ЯК ЦУД



**Лепшы скрыпач свету на найвыдатнейшым інструменце іграў у Мінску дабрачынны канцэрт**

**На закрыцці фестывалю Юрыя Башмета выступаў скрыпач Максім Венгераў. І гэта сапраўды цуд! Асабліва, калі чуеш, як у руках майстра жыве інструмент, распавядае гісторыі жыцця іншых і дорыць жыццё.**

Дорыць жыццё нават літаральна. Таму што ў адзін са сваіх вольных вечароў у Мінску скрыпач даў дабрачынны канцэрт у падтрымку дзяўчынкі, якая пакутуе на анкалогію.

13-гадовая Марына Ласкутова прыехала на лячэнне ў Беларусь з Украіны: юная гімнастка знайшла разуменне і жаданне дапамагчы ў сваіх калег з іншай краіны (чаго не было на радзіме). Яна лячылася ў Кіеве, але не вельмі паспяхова, працяг лячэння ад раку параілі праходзіць у анкалагічным цэнтры ў Беларусі. Сям'я Марыны звярнулася па падтрымку да Ірыны Ляпарскай і беларускай Федэрацыі мастацкай гімнастыкі. Нашы гімнасткі адгукнуліся на крык аб дапамозе: кожная з секцый па мастацкай гімнастыцы пастаралася зрабіць свой унёсак, і нават біятланістка Дар'я Домрачава падтрымала. І калі ўзнікла магчымасць звярнуцца да людзей праз мастацтва, яе скарысталі найлепшым і цудоўным чынам, зладзіўшы асобны дабрачынны канцэрт напрыканцы фестывалю Юрыя Башмета.

> *Гімнастка Любоў ЧАРКАШЫНА:*
> *— Для мяне музыка — гэта лекі для душы. Але ж мы можам не толькі душу вылечыць музыкай, а маем магчымасць дапамагчы чалавеку — гэта вялікая справа. У свеце шмат цудаў. І тое, што цудоўны чалавек, музыкант вырашыў патраціць свой вольны час — гэта чарговы цуд свету. Хацелася б, каб Марына адчула, якія цуды адбываюцца дзеля яе выратавання.*

Гэта было вельмі кранальна: вялікі музыкант Максім Венгераў, які адгукнуўся на прапанову, звяртаўся са сцэны менавіта да Марыны і яе мамы, якія са шпіталя прыехалі на канцэрт. Насамрэч Венгерава чакалі на фестывалі Башмета некалькі гадоў, і толькі сёлета музыкант знайшоў акенца ў сваім шчыльным графіку — не, нават шукаў знарок. Відаць, гэта быў лёс, які яго прывёў сюды дзеля нейкай вышэйшай мэты.

Максім Венгераў іграў вельмі прыгожую і рамантычную музыку, за якой адчувалася надзея:

— Я вельмі шчаслівы быць у Беларусі, у Мінску. У свядомым узросце я першы раз наведваю сталіцу Беларусі, але бываў тут дзіцем 9-10 гадоў. У мяне былі толькі добрыя ўспаміны пра гэты цудоўны горад. Цяпер я яго адкрыў наноў. Рады ўдзельнічаць у 8-м міжнародным фестывалі Юрыя Башмета. Для мяне вельмі хвалюючы момант, што я меў магчымасць дапамагчы дзяўчынцы Марыне Ласкутовай. Гэта наш сціплы ўнёсак у адно жыццё. Сапраўды, музыка здольная дапамагаць. І кожны раз, калі мы дапамагаем некаму, мы дапамагаем у першую чаргу сабе, сваёй душы.

**— Ці бывалі яшчэ такія сітуацыі, калі вам «з колаў» даводзілася прымаць рашэнне аб канцэрце дзеля добрай справы?**

— Я іграю пэўную колькасць канцэртаў на карысць дабрачыннасці для шматлікіх арганізацый. У мяне ёсць устаноўка жыццёвая і чалавечая: аддай дзесяціну. Калі Бог табе дае — аддай нешта з таго іншым. Мне вельмі пашчасціла, што я стаў музыкантам: увесь час судакранаюся з цудамі. Музыка — гэта цуд, чараўніцтва. Музыка ўвесь час дае мне шмат магчымасцяў сустракацца з людзьмі, знаёміцца, давядвацца пра іх. Таксама я з'яўляюся пасламі добрай волі «ЮНІСЕФ». Гэтая пасада дазваляе мне ездзіць па ўсім свеце і іграць для дарослых і дзяцей не толькі ў цывілізаваных краінах, але і там, дзе класічную музыку, можа быць, ніколі не чулі: у Тайландзе, адразу пасля вайны ў Босніі і Герцагавіне, ва Угандзе, у Судане. Мая місія — іграць для дзяцей. І тое, што ў Мінску ёсць магчымасць дапамагчы адной дзяўчынцы — насамрэч працяг маёй жыццёвай устаноўкі. Мая мама 20 гадоў была дырэктарам дзіцячага дома. У дзіцячым доме яна арганізавала музычную школу, любоў да дзяцей перадалася мне. Я захоўваю нашы сямейныя традыцыі. Хачу ў гэтым свеце зрабіць свой сціплы ўнёсак. І вельмі шмат іграў дабрачынных канцэртаў. Аднойчы мы таксама збіралі на аперацыю канкрэтнаму чалавеку, спартсмену ў Славеніі. Вельмі важна разумець: адна душа — гэта Сусвет. Спадзяюся, што Марына Ласкутова стане вельмі шчаслівай дзяўчынкай. І калі вырасце, то проста забудзе, што з ёй адбылося.

**— Для скрыпача важна, з якім інструментам ён суіснуе. Як вы шукалі сваю скрыпку?**

— Кажуць, што смычок — гэта працяг правай рукі, скрыпка — натуральны працяг і частка душы скрыпача, тут павінна быць гармонія. Часам інструмент цудоўны і музыкант таксама выдатны, але разам яны не могуць суіснаваць. Такое бывае. Я іграў на шмат якіх інструментах — і першакласных, і геніяльных: Страдывары, Гварнеры і іншых. Але па-сапраўднаму зрадніўся з інструментам, які належаў легендарнаму французскаму скрыпачу Рудольфу Крэйцару. На ім планавалася выкананне «Крэйцаравай санаты». Гэта легендарны інструмент. Мне вельмі пашчасціла, што ў 1998 годзе я набыў яго на аўкцыёне «Крысціс» у Лондане. І хоць у мяне ёсць іншыя інструменты, але з таго часу на інструменце Страдывары я іграю большую частку сваіх канцэртаў. Што самае цікавае, як класічны музыкант я маю шчаслівую магчымасць не толькі прыносіць у залы мастацтва і выконваць музыку, якая была створана 2, 3 ці 4 стагоддзі таму, але і прыношу інструмент-легенду. Гэта падзея ў першую чаргу для мяне, і думаю, што і для публікі таксама.

**— Вас тры гады запрашалі ў Мінск на фестываль, толькі сёлета дачакаліся. Але куды накіроўваецеся пасля?**

— Мяне чакае сям'я — дочкі, жонка. Далей канцэрт у Ізраілі, а потым вялікае турнэ па Еўропе з польскім камерным аркестрам, у асноўным у Германіі, таксама будуць Лондан, Парыж, Брусель, Антверпен.

**— Вы захоўваеце свой графік — 150 канцэртаў за год?**

— 150 канцэртаў няма. Пажыць жа таксама хочацца...

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

> *Пасля прамянёвай тэрапіі Марыне спатрэбіцца вельмі дарагое лячэнне. Для дабрачынных ахвяраванняў адкрыты рахунак: «АСБ Беларусбанк», філіял № 614/ 143, рахунак дазапатрабавання № 01022400, атрымальнік Ласкутоў Анатоль Анатольевіч.*

■ Святлафор

## ТРЫ РАЗЫ ЗА РУЛЁМ «ПАД МУХАЙ»

**Маладога вадзіцеля, які любіў ездзіць у нецвярозым стане, урэшце арыштавалі.**

— Гэты 23-гадовы хлопец першы штраф — 27 базавых велічынь — за кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення атрымаў у лютым. У красавіку зноў папаўся супрацоўнікам ДАІ падчас язды ў нецвярозым стане. Яму дадаткова быў прызначаны штраф — ужо 70 базавых велічынь, а таксама на пяць гадоў яго пазбавілі права кіравання аўтамабілем, — расказала **Святлана РАМАНОЎСКАЯ, намеснік пракурора Мёрскага раёна**.

Але і на гэты раз грамадзянін правільных зыходаў не зрабіў. Выпіўшы дома піва, хлопец вырашыў пракаціцца. І непагашаная судзімасць не спыніла. Рэцыдывісту прызначылі ў якасці пакарання арышт на тры месяцы і яшчэ на пяць гадоў пазбавілі права садзіцца за руль транспартнага сродку.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ЗА РУЛЬ ПАСЛЯ ВЯСЕЛЛЯ

Жыхар Іванава гуляў на вяселлі ў іншым горадзе з усёй сям'ёй. І як высветлілася, ні ў чым сабе не адмаўляў. Затым ён пасадзіў у машыну чатырох непаўналетніх дзяцей, сеў за руль і паехаў. На дарозе пад Кобрынам яго спынілі супрацоўнікі ДАІ, абследаванне паказала 2,4 праміле алкаголю ў крыві. Ці навучаць чаму адміністрацыйныя захады грамадзяніна, для якога бяспека ўласных дзяцей нічога не значыць, невядома.

**Яна СВЕТАВА.**

## СУТЫКНУЛІСЯ АЎТОБУС І «КАМАЗ»

**Ранкам на 51-м кіламетры МКАД, як мяркуецца, грузавы аўтамабіль стаў прычынай дарожна-транспартнага здарэння: ён сутыкнуўся з пасажырскім «МАЗам».**

У салоне аўтобуса маршрута «ДС «Карбышава» — «ДС «Паўночныя могілкі» ў гэты час знаходзіліся 10 чалавек. Падчас аварыі пацярпеў адзін з іх — 61-гадовы мужчына. Яго шпіталізавалі з чэрапна-мазгавой траўмай лёгкай ступені. А вось 33-гадовы кіроўца грузавога аўтамабіля атрымаў такую ж траўму цяжкай ступені, да таго ж яго давялося даставаць з салона выратавальнікам — пры сутыкненні мужчыну заціснула.

## ПАЦЯРПЕЎ АД РАЗРЫВУ БЕНЗАБАКА

У Мінску пры рамонце бензабака грузавога аўтамабіля пацярпеў зваршчык.

Здарэнне адбылося на тэрыторыі прыватнага прадпрыемства па рамонце вялікагрузных аўтамабіляў бліжэй да абеду. Мужчына быў траўміраваны падчас правядзення зварачных работ паліўнага бака аб'ёмам 800 літраў. Апошні, зняты з грузавога аўтамабіля, у гэты час разарваўся. У выніку 51-гадовы работнік атрымаў чэрапна-мазгавую траўму і пералом правага пляча. У бальніцу мужчыну даставілі ў цяжкім стане.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■ Сучасны разлік

## «Белкарт» можна расплачвацца ў інтэрнэце

**Магчымасць аплачваць пакупкі ў інтэрнэце ў трымальнікаў «Белкарт» Беларусбанка з'явілася ў кастрычніку, а першая анлайн-аперацыя па гэтай картцы была здзейснена ў інтэрнэт-краме shop.mts.by, паведамілі ў прэс-службе кампаніі МТС.**

Між іншым, залічэнне сродкаў адбываецца без збірання камісіі. Дадаткову бяспеку інтэрнэт-плацяжоў «Белкарт» забяспечвае тэхналогія «Інтэрнэт Пароль Белкарт». Ідэнтыфікацыя трымальніка праводзіцца пры ўводзе рэквізітаў карткі і пароля. Зарэгістраваць яго можна з дапамогай сэрвісаў дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання «М-банкінг» і «Інтэрнэт-банкінг». Сёння ў абарачэнне ўжо выпушчана звыш 5 мільёнаў картак аплатнай сістэмы «Белкарт». Штомесяц на долю «Белкарт» прыпадае больш за 35% безнаяўных плацяжоў, якія здзяйсняюцца абанентамі ў касах МТС.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**


**Ганарымся Вамі, Любоў Мікалаеўна!**

Віншуем былога дырэктара клуба прадпрыемства «Дываны Брэста» (1989—2007), а цяпер намесніка старшыні абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Любоў Мікалаеўну Красеўскую з юбілеем. Зычым Вам, шаноўная Любоў Мікалаеўна, ураджэнцы вёскі Маісееўка Краснаярскага краю, і ў будучыні гэтак жа актыўна працаваць на карысць яднання беларускага і расійскага народаў, а таксама на карысць актывізацыі літаратурнага працэсу ў берасцейскім краі, у тым ліку і праз правядзенне фестываляў рускай паэзіі ў Брэсце.



Няхай трывалае здароўе, ранейшае імкненне шмат падарожнічаць і ўдзельнічаць у шматлікіх міжнародных конкурсах, а таксама натхненне ніколі не пакідаюць Вас, хай радуюць чытачоў новыя паэтычныя зборнікі. Будзем рады бачыць і слухаць Вас і вашых калег па пяры ў нас на прадпрыемстве. Любоў Мікалаеўна, ганарымся Вамі!

**Адміністрацыя і камітэт прафсаюза ААТ «Дываны Брэста».**

УНП 200303805

■ Падзея

# «ВІЦЕБСКІЯ СТАРАЖЫТНАСЦІ»

**У Віцебску праходзіць юбілейная, пятая па ліку, навуковая канферэнцыя «Віцебскія старажытнасці». Сёлета яна прысвечана 150-й гадавіне з дня нараджэння вядомага педагога, гісторыка, музейнага работніка Уладзіміра Гаўрылавіча Краснянскага.**

Краязнаўчую дзейнасць ён пачаў з раскопак курганоў у Барысаўскім павеце. Краснянскі — аўтар прац аб падзеях вайны 1812 года, гісторыі Мсціслава, Мінскай гімназіі, старажытнай архітэктуры Віцебска і Беларусі, адзін з арганізатараў музейнай справы ў Віцебску.

— Ідэя аб правядзенні штогадовай навуковай канферэнцыі, прысвечанай гісторыі Віцебска, узнікла пяць гадоў таму, пасля правядзення канферэнцыі, прымеркаванай да 90-й гадавіны абласнога краязнаўчага музея. Праз год адбылася канферэнцыя, прысвечаная 50-годдзю знаходжання ў Віцебску берасцянай граматы і 150-й гадавіны з дня нараджэння першага дырэктара музея, калекцыянера Антона Рафаілавіча Брадоўскага, — паведамілі ў музейнай установе.

У будынку ратушы таксама адкрылася выстава, прысвечаная У.Г. Краснянскаму. У 1886 годзе ён скончыў Санкт-Пецярбургскі гісторыка-філалагічны інстытут. Пасля чаго дзесяць гадоў выкладаў рускую мову ў Беластоцкім рэальным вучылішчы, а з 1896 па 1903 гады — гісторыю і геаграфію ў Мінскай гімназіі. Потым працаваў памочнікам архіварыуса Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актаў, быў кіраўніком канцылярыі Віленскай навучальнай акругі. У Віцебску займаў пасаду дырэктара рэальнага вучылішча — да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. Потым быў лектарам і выкладчыкам у навучальных установах, навуковым супрацоўнікам і намеснікам дырэктара гістарычнага музея. У 1919-1924 гады з'яўляўся членам камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва... Краязнаўца пайшоў з жыцця ў маі 1930 года.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки»** (организатор аукциона) по поручению **ООО «Активагроконтакт»** (продавец) ***проводит открытый аукцион по продаже объектов недвижимости,*** **расположенных по адресу: Минская область, Борисовский район, г. Борисов, ул. Сенная, д. 7,**

В СОСТАВЕ:
- **деревообделочный цех,** инвентарный номер 610/С-37056, об. пл. 406 кв.м;
- **здание конторы,** инвентарный номер 610/С-37066, об. пл. 223 кв.м;
- **здание гаража,** инвентарный номер 610/С-37045, об. пл. 234 кв.м;
- **здание кузницы,** инвентарный номер 610/С-37055, об. пл. 21 кв.м;
- **здание столярного участка,** инвентарный номер 610/С-37050, об. пл. 111 кв.м.

**Начальная цена с НДС – 300 000 долларов США.**

Площадь земельного участка – **2,4153 га** (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования). Обременения – частичная аренда.

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в ЦБУ № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится резидентами РБ в белорусских рублях по курсу Нацбанка РБ на дату платежа; нерезидентами РБ в белорусских рублях, либо в иностранной валюте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа, в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

Аукцион состоится **20.11.2013** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **19.11.2013** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029 183 69 71.**



## *ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ДЛЯ ИНДИВИДУАЛЬНОГО ЖИЛИЩНОГО СТРОИТЕЛЬСТВА.*

## Продавец — Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области

| Лот | Наименование предмета аукциона | Характеристика предмета аукциона | Начальная цена предмета аукциона, рублей | Сумма задатка, рублей | Затраты на подготовку участка к аукциону |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Земельный участок в агрогородке Раков, переулок Пионерский, 12 площадью 0,1500 гектара** | Кадастровый номер участка 622085715608000010. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Подъездные пути, электричество, природный газ | 50 000 000 | 5 000 000 | 3 290 630 |
| 2 | **Земельный участок в деревне Лесковка, уч. 24 площадью 0,1500 гектара** | Кадастровый номер участка 622085709601000027. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеются подъездные пути, электричество. Расстояние от аг. Раков 8 километров. | 17 000 000 | 1 700 000 | 4 172 800 |
| 3 | **Земельный участок в деревне Бузуны, уч. 102 площадью 0,1170 гектара** | Кадастровый номер участка 622085702101000278. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Участок расположен на хуторе, есть подъездные пути, электричество. Удаленность от аг. Раков 5 километров. | 20 000 000 | 2 000 000 | 4 673 950 |
| 4 | **Земельный участок в деревне Михалово, 60а площадью 0,1203 гектара** | Кадастровый номер участка 622085711601000289. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Участок расположен в новом районе застройки. Ведется проектирование инфраструктуры. | 15 000 000 | 1 500 000 | 4 462 700 |

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь или приравненных к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

**Аукцион состоится 21 ноября 2013 года (четверг) в 10.00 по адресу: агрогородок Раков, площадь Свободы, д. 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются до 16 ноября 2013 года (включительно) до 16.00 по адресу: аг. Раков, площадь Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.**

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

**Контактные телефоны: (8 01772) 30 305; 8029 140 54 37.**



# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**Информация о застройщике:**

«Приорбанк» Открытое акционерное общество, юридический адрес и местонахождение: 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31-А. Зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 12.07.1991 г., регистрационный № 12. УНП 100220190.

**Режим работы:** понедельник–четверг с $8^{30}$ до $17^{30}$, пятница с $8^{30}$ до $16^{15}$, обед с $12^{30}$ до $13^{15}$, выходные дни – суббота, воскресенье, государственные праздники и праздничные дни.

**Застройщиком получены:**

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права на него от 28.03.2013 № 500/1109-4607; от 28.03.2013 № 500/1109-4608; от 28.03.2013 № 500/1109-4609; от 28.03.2013 № 500/1109-4610; от 01.04.2013 № 500/1109-4622;
- решение Мингорисполкома от 31.01.2013 № 147 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и внесении изменений в решения Мингорисполкома»;
- решение Мингорисполкома от 14.02.2013 № 341 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства и о внесении изменений в решения Мингорисполкома»;
- решение Мингорисполкома от 28.02.2013 № 457 «Об изъятии, предоставлении земельных участков, разрешении строительства»;
- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «Госстройэкспертиза по г.Минску» от 16.11.2009 № 1762-5/09 и от 02.03.2012 № 55-15/12;
- приказ «Приорбанк» ОАО об утверждении проектно-сметной документации от 03.05.2012 № 114;
- разрешение на организацию строительно-монтажных работ от 13.06.2013 № 2-207Ж-014/13, выданное инспекцией департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску;
- договор строительного подряда № 107 от 28.03.2013.

**Информация о проекте:**

**Наименование проекта**: строительство группы жилых домов не повышенной комфортности в квартале улиц Корш – Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной». Дом № 2 по генплану (I очередь строительства).

**Местонахождение объекта**: объект находится в Советском районе города Минска в квартале улиц Корш – Саблина – Л. Беды – Белинского – Восточной.

**Цель проекта строительства:** строительство двадцатиэтажного жилого дома.

**Характеристика объекта**:

Жилой дом № 2 по генплану – односекционное 20-этажное здание. Наружные стены из ячеистых блоков толщиной 400 мм, внутренние несущие монолитные стены толщиной 160 мм и монолитные плоские перекрытия толщиной 200 мм. Внутриквартирные перегородки из стеновых блоков ячеистого бетона толщиной 100 мм.

На первом этаже располагаются помещение товарищества собственников, комнаты консьержа, кладовая уборочного инвентаря, электрощитовая, помещение для локальной вычислительной сети и кабельного телевидения.

Общее число квартир 118, в том числе:
- однокомнатные – 39 шт.;
- двухкомнатные – 40 шт.;
- трехкомнатные – 38 шт.;
- четырехкомнатная – 1 шт.

Общая площадь квартир:
Однокомнатных от 52.36 до 61.72 м кв.;
Двухкомнатных от 67.52 до 79.30 м кв.;
Трехкомнатных от 87.01 до 90.96 м кв.;
Четырехкомнатной 125.85 м кв.

Дом оборудован лифтами, мусоропроводом. Кровля плоская с внутренним водостоком. Окна – из ПВХ профиля с двухкамерными стеклопакетами. Остекление лоджий – из алюминиевого профиля со стеклом.

В жилом доме предусмотрена установка пожарных автономных извещателей.

Вентиляция – естественная.

Электроснабжение – поквартирная разводка электропроводки с установкой электросчетчиков.

Холодное и горячее водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза, выводы для кухни и ванны.

Отопление – двухтрубная система отопления с установкой радиаторов и счетчиков учета тепла для каждой квартиры.

Телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная разводка.

Внутренняя отделка только мест общего пользования (общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы).

Внутренняя отделка жилых помещений:
стены, потолки, полы – без чистовой отделки.

Дверные блоки:
наружные – металлические;
межквартирные деревянные;
межкомнатные - не устанавливаются.

После завершения строительно-монтажных работ на прилегающей территории будет выполнено благоустройство и озеленение.

**Сроки строительства:**

Начало – 15 апреля 2013 г.
Окончание – 31 декабря 2014 г.

**Заключение договоров долевого строительства:**

Договора долевого строительства заключаются на следующие квартиры:

| Квартира | Количество |
|---|---|
| Однокомнатные | 5 |
| Двухкомнатные | 5 |
| Трехкомнатные | 1 |

Прием заявлений на участие в долевом строительстве будет осуществляться через 7 календарных дней после опубликования проектной декларации по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 41, пом. 204, ЧРУП «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс». Прием заявлений осуществляется до момента набора их необходимого количества. Если претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве утрачивает силу и «Приорбанк» ОАО вправе заключить договор с другим претендентом.

**Цена объектов долевого строительства:**

Формирование стоимости метра квадратного производится на основании сводного сметного расчета с учетом затрат застройщика.

Стоимость строительства квартиры составляет 1 550 (одна тысяча пятьсот пятьдесят) долларов США за один метр квадратный.

Изменение цены объекта долевого строительства производится в одностороннем порядке по инициативе Застройщика в связи с определением фактической площади объекта долевого строительства по результатам технической инвентаризации РУП "Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру».

**Условия заключения договоров долевого строительства:**

1. При заключении договора участник долевого строительства вправе выбрать квартиру соответствующей площади из имеющихся свободных квартир, предложенных застройщиком для заключения договоров на момент заключения договора.

2. Первоначальный взнос для всех категорий участников долевого строительства составляет не менее 20% от стоимости квартиры (цены договора) и должен быть внесен не позднее 1 месяца с момента заключения договора долевого строительства.

3. Скидки для всех категорий граждан, заключающих договоры долевого строительства, составляют:

- при единовременном внесении 100% стоимости квартиры (цены договора) в течение 1 месяца с момента заключения договора для всех категорий участников долевого строительства стоимость 1 квадратного метра составляет – 1 450 долларов США;
- при единовременном внесении 50% стоимости квартиры (цены договора) в течение 1 месяца с момента заключения договора для всех категорий участников долевого строительства стоимость 1 квадратного метра составляет – 1 500 долларов США.

**Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме**

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после его ввода в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые и вентиляционные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие конструкции, сантехническое, электрическое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их деятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в собственность Дольщиков, если финансирование этих объектов осуществлялось Дольщиками и передаются Застройщиком товариществу собственников.

Срок действия декларации – до опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованной ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в ЧУП «АН «Риэлт-Экспресс», по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 41, пом. 204, ЧРУП «Агентство недвижимости «Риэлт-Экспресс» или по телефону: (017) 292 42 19.**

# «РЭПЕТЫТАРСТВА — НЕ ТАКІ ЛЁГКІ ХЛЕБ, ЯК ЗДАЕЦЦА»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Памер заробкаў педагогаў, даплаты за кваліфікацыйныя катэгорыі, дэфіцыт кадраў у дашкольных установах, павелічэнне колькасці гадзін на стаўку, вялікі аб'ём работ, які настаўнікам не аплачваецца, платныя адукацыйныя паслугі ў школах, «цэннікі» на навучанне ў дзяржаўных і прыватных ВНУ — усе гэтыя пытанні ўзнімаліся чытачамі падчас правядзення ў «Звяздзе» «прамой лініі» з міністрам адукацыі Сяргеем Маскевічам. А пазней сталі прадметам абмеркавання ў інтэрнэт-прасторы. Друкуем на старонках газеты найбольш цікавыя меркаванні:**

@

**Crycry:**

Сапраўды, выхавальнікі, выкладчыкі атрымліваюць мала. ОК, якія вашы прапановы? Вы думаеце, так проста — узяць і павысіць стаўку ці аклад? І за кошт каго і чаго? У двух словах намалюйце...

@

**Bear:**

Зрабіць усю адукацыю платнай!!!

Пакінуць абавязковымі 9 класаў, а аплату прывязаць да паспяховасці: чым лепш вучышся, тым менш плаціш.

І тэсты — аўтаматызаваныя — па выніках кожнай чвэрці, каб ніхто не гаварыў аб прадузятасці або карупцыі.

@

**Mygoodbox:**

Насамрэч многія настаўнікі прыбядняюцца. У сферы адукацыі можна вельмі шмат зарабляць рэпетытарам. Але для таго, каб людзі да цябе ішлі за 15 у.а. за гадзіну, трэба быць добрым педагогам і зрабіць сабе імя (дзеці — прызёры алімпіяд, высокія балы на ЦТ).

Калегі шукалі нядаўна нянечку. Ад 600 у.а. плюс харчаванне, у Мінску. Можа, трэба ў гэты бок паглядзець?

@

**KLEPA:**

Пра тое, як шмат зарабляе настаўнік, можа разважаць толькі старонні назіральнік — «асабліва шмат» зарабляюць на рэпетытарстве настаўнікі геаграфіі, гісторыі, працы, фізкультуры, музыкі, а настаўнікі малодшых класаў дык і ўвогуле проста «зарэпетыраваліся».

Мая маці адпрацавала педагогам 25 гадоў і пайшла на пенсію (хоць і прасілі застацца) з гэтай работы, маючы і імя, і прызёраў, і добрыя балы ў вучняў на ЦТ, і рэпетытарствам займалася і г.д. Дык вось яе ў школу і сілком не зацягнуць, асабліва пасля таго, як яна папрацавала ў іншай арганізацыі (па-за сістэмай адукацыі) і зразумела, што можна працаваць спакойна і зарабляць больш, не знішчаючы сваё здароўе. А рэпетытарствам займацца пасля цэлага дня, праведзенага ў школе, не кожны зможа.

Я — за падзел школ на платныя і сацыяльныя, але пры ўмове, што ўзровень адукацыі, якая «даецца» ў платнай школе, будзе не горшым, чым у сацыяльнай! А так у нашай краіне можа быць, таму што ў платнай школе ўсе дзеці — добрыя, а асабліва іх бацькі, якія плацяць настаўніку зарплату, таму рэальны ўзровень ведаў вучняў па ацэнках вызначыць будзе немагчыма.

@

**Sergik_bsu:**

У мяне сястра працуе ў адукацыі, і я вам скажу, што чарга да яе, вядома, выстройваецца, але спачатку трэба «адбарабаніць» на асноўнай рабоце, а потым гадзінамі сядзець і займацца з іншымі дзецьмі (сур'ёзна займацца) пасля таго, як кіраўнікі школы задураць галаву сваімі планамі, паперамі, паказчыкамі, прэзентацыямі. Гэты хлеб не такі лёгкі, як падаецца. Вядома, калі з раніцы распачынаць і гадзін да 18 вечара па 15 у.а. за гадзіну... Але насамрэч з 8.00 да 16.00 і нават да 19.00 ты на адной рабоце, а потым яшчэ да 21.00 з іншымі дзецьмі. Свае ж дзеці раўнуюць: у іх няма маці, бо яна заўсёды працуе і занятая з іншымі дзецьмі.

@

**Estbyright:**

Рэформа адукацыі: школа дзесяцца на 7 гадоў (базавая адукацыя) плюс 4 гады (інтэлектуальная адукацыя).

а) Базавая адукацыя:
- ✓родная мова, англійская мова;
- ✓матэматыка;
- ✓фізіка;
- ✓хімія;
- ✓фізкультура.

б) Інтэлектуальная адукацыя:
- ✓вышэйшая матэматыка, матаналіз і геаметрыя;
- ✓англійская мова плюс другая замежная мова;
- ✓алгарытмізацыя і сістэмнае праграмаванне;
- ✓эканоміка і фінансы, маркетынг альбо гісторыя і сучаснае мастацтва

Пераход у інтэлектуальную школу толькі пры сярэднім бале 8,5, а калі бал менш чым 5,5, прымусова на 2 гады на завод з правам навучання ў ПТВ па запатрабаванай спецыяльнасці. Гэтая рэформа дазволіць скараціць колькасць педагогаў на трэць, плюс адсеяць людзей, якія не жадаюць навучацца на першым этапе.

@

**YUREVNA:**

Многія блытаюць настаўніка і выхавальніка. За мізэрны заробак выхавальнік абавязаны накарміць, напаіць, апрануць, навучыць... Хачу нагадаць, дарагія бацькі, што аплата ў дашкольных установах бярэцца толькі за харчаванне (і тое не стапрацэнтна), а не для асабістага абагачэння золатавалютных рэзерваў мільянераў-выхавальнікаў і памочнікаў выхавальнікаў. А можа, прыйшоў час уводзіць адэкватную плату за дзіцячыя садкі (і ніякіх ільгот), каб з'явіліся сродкі для зарплаты людзям?

@

**Serjikbel:**

Мая жонка — педагог, чырвоны дыплом філфака БДУ. Выкладае беларускую мову. Добры, адказны спецыяліст. Першая катэгорыя, стаж больш як 15 гадоў. Працуе ў дзвюх школах. «Чыстымі» на рукі атрымлівае не больш як 3 мільёны. Рэпетытарствам не займаецца — беларуская мова, на жаль, не так запатрабавана як фізіка ці англійская мова. Так што казкі пра 1000 долараў — усяго толькі казкі, і настаўнікі зарабляюць да непрыстойнасці мала. Самыя прадпрымальныя дзяруць па 15-25 у.а. за дзве акадэмічныя гадзіны, а больш адданыя школе — атрымліваюць голы заробак. Таму прыходзяць у школу або пенсіянеры, або выпускнікі, якія паступалі ў педагагічныя ВНУ з вельмі нізкімі баламі ЦТ. Пакіну за рамкамі пытанні з забюракратызаванасцю школьнага працэсу...

@

**H13:**

Знаёмая пакуль навучалася ў педагагічным, падпрацоўвала ў магазіне прадаўцом па выкладцы тавараў за 4-4,5 мільёна рублёў. Зараз скончыла вучобу і пайшла ў школу — за 2,5 мільёна. Каментарыі залішнія...

@

**TheFallen:**

Прадавец без адукацыі — заробак ад 5 мільёнаў, настаўнік з універсітэтам за спінай — 3 мільёны. Хм, і праўда, што ж выбраць?

@

**Andyal:**

Скончыла педагагічны (праўда, я — псіхолаг), але тым не менш. Працую ў Мінску, у дыспансеры, зарплата — 1,8-2 мільёны. І вось што думаю: трэба першапачаткова праводзіць у педагагічным універсітэце гутарку па тэме «А ці гатовы выпускнікі выжываць на такі заробак?» Мы, да слова, медыцынскія псіхолагі, і ў Мінску — адзінкавыя спецыялісты, аднак за гэту даволі складаную работу ніхто не плаціць.

@

**Оля4ка:**

Сама — настаўнік, і мяне жах бярэ. У педінстытуты паступаюць пераважна тыя, каму абы толькі атрымаць дыплом аб вышэйшай адукацыі, і, пажадана, не напружваючыся. Пагаварыце з выкладчыкамі пра ўзровень адукаванасці іх студэнтаў: не адлічваюць толькі таму, што 70% давядзецца адлічваць, вось і выходзяць гора-настаўнікі... 50% па спецыяльнасці не працуюць і не збіраліся, па сутнасці, лічаныя адзінкі могуць і жадаюць працаваць з усёй аддачай гэтай прафесіі... Але і гэтыя сыходзяць з адукацыі: маленькія заробкі, пастаянныя праверкі, шмат пісаніны, з-за якой не бачыш сям'ю і ў якой не бачыш сэнсу. Толькі ад дзяржавы залежыць павышэнне ўзроўню адукацыі. Мае прапановы:

1. Прадастаўленне маладым спецыялістам жылля (няхай і службовага на першым часе).

2. Павышэнне заробкаў, якое адпавядала б нагрузцы (не забывайцеся пра эмацыянальную і псіхалагічную нагрузку).

Можна чакаць, што пасля гэтага на педагагічныя спецыяльнасці пойдуць мэтанакіраваныя людзі, а не невукі. Вось тады і павышайце прахадны бал і патрабаванні да навучання ў ВНУ. А пакуль што настаўнік — гэта «хлопчык для біцця» для кантралюючых асоб і бацькоў вучняў, а для дзяцей — аб'ект насмешак.

@

**Святлана Васільеўна:**

Шаноўны міністр сцвярджае, што ўсе грошы ад аказання ў школе платных паслуг ідуць на аплату працы педагога. Але ж гэта зусім не так. Педагог атрымлівае толькі 33% ад той сумы, што плацяць бацькі. А куды, цікава, ідуць астатнія 67%? Бо школа іх не атрымлівае...

@

**Святлана:**

Зарабляе школа ці не на платных факультатывах — яшчэ вялікае пытанне. Летась за адзін факультатыў мы плацілі толькі каля 70 тысяч рублёў у месяц, а ў гэтым годзе — амаль удвая больш. Бясплатных факультатываў па англійскай мове ў нашай школе няма, значыць, даводзіцца настаўніку плаціць. У верасні дзіця пайшло ў студыю выяўленчага мастацтва, дзе заняткі павінны былі быць бясплатныя, але праз два тыдні нас паставілі перад фактам: гурток карыстаецца павышаным попытам, таму ён пераводзіцца ў разрад платных. І цяпер трэба думаць: а ці гатовы мы плаціць 200 тысяч рублёў у месяц?

@

**evelina_rasputina:**

Раздутыя штаты заклалі ў цану навучання. У Італіі самае дарагое навучанне (урачоў) не перавышае 1 тысячы еўра пры сярэднім заробку 1,5 тысячы еўра. А ў нас усё наадварот. Трэба прыводзіць у адпаведнасць і штаты, і іншыя выдаткі.

@

**nat-tis:**

У нашым універсітэце скарачаюць бібліятэку як самую непатрэбную структуру. Замест трох чытальных залаў, разбітых па тэматыцы (тэхнічная, гуманітарная, прававая), у нас цяпер агульная чытальная зала і... дзве канферэнц-залы. А паколькі наш універсітэт размешчаны адразу ў двух гарадах (частка факультэтаў у адным, а частка — у іншым), то для зручнасці студэнтаў калісьці быў адкрыты філіял асноўнай бібліятэкі. Цяпер ён таксама пад пагрозай скарачэння. Правільна, а навошта?

@

**Shi-zhi:**

Калі мае сваякі і знаёмыя ламалі ногі і рукі, хварэлі — іх паспяхова аперыравалі і лячылі ўрачы з нашых ВНУ. Прэтэнзій па якасці лячэння — ніякіх. Таксама няма прэтэнзій да настаўнікаў і выкладчыкаў: усе, хто хацеў атрымліваць веды, атрымлівалі, аж да перамог на міжнародных алімпіядах. І гэты пералік можна працягваць. Адзінае, што мяне асабіста абурае, — гэтыя спецыялісты вымушаны працаваць за капейкі на агульным фоне заробкаў. Але да якасці адукацыі прэтэнзій няма — хто хоча навучыцца, той навучыцца...

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА**

# «АМЕРЫКАНСКІ ПРАРЫЎ» БДУІР

**Першыя 10 амерыканскіх студэнтаў распачалі дыстанцыйнае навучанне ў філіяле кафедры праектавання інфармацыйна-камп'ютарных сістэм БДУІР у Чыкага.**

Філіял кафедры адкрыўся на базе чыкагскага Computer System Institute (CSI), які ўзначальвае выпускніца БДУІР 1970 года Эла Зібіцкер.

— Сёння знамянальны дзень у жыцці універсітэта: мы падышлі да рэалізацыі задумана намі год таму праекта па прадастаўленні адукацыйных паслуг замежным грамадзянам, — заявіў падчас тэлемоста «Мінск — Чыкага» рэктар БДУІР Міхаіл Батура.

Ацаніўшы перспектыўнасць тых ці іншых спецыяльнасцяў для амерыканскай эканомікі, кіраўніцтва БДУІР спынілася на спецыяльнасці «Праектаванне мабільных сістэм». Дзякуючы дастаткова апаратыўным дзеянням бакоў былі ўзгоднены стандарты для гэтай спецыяльнасці, якія адпавядаюць патрабаванням да ўладальніка дыплома аб вышэйшай адукацыі дзвюх краін. Пасля заканчэння навучання амерыканскія студэнты атрымаюць не толькі дыплом БДУІР, але і прафесійныя сертыфікаты. Праграму і электронныя вучэбна-метадычныя комплексы распрацавалі беларускія выкладчыкі. Студэнтаў будуць рыхтаваць па ўзроўнях «бакалаўр», «спецыяліст» і «магістр». Выкладанне будзе весціся на англійскай мове.

Летам дакументы на навучанне ў Чыкагскім філіяле падалі 57 чалавек. Першая група была сфарміравана з 10 жыхароў штата, якія падрыхтавалі ўсе неабходныя дакументы і прайшлі тэсціраванне па матэматыцы, фізіцы, англійскай мове, а таксама індывідуальную гутарку з дэканам факультэта камп'ютарнага праектавання Сяргеем Дзіком. Залічаныя студэнты — выхадцы з Філіпін, Манголіі, Румыніі, Малдовы, Казахстана, Кыргызстана, Нігерыі і іншых краін. Залічэнне навасспечаных студэнтаў адбудзецца таксама ў студзені, красавіку і ліпені наступнага года.

— Я ўпэўнены, што гэта толькі пачатак. Працэс будзе рухацца імклівымі тэмпамі: да 2015 года мы плануем адкрыць яшчэ некалькі запатрабаваных у ЗША спецыяльнасцяў і давесці колькасць студэнтаў да тысячы чалавек, — падкрэсліў Міхаіл Батура.

Падчас тэлемоста адбылося віртуальнае знаёмства рэктара ВНУ і выкладчыкаў з іх амерыканскімі першакурснікамі. Па кожнай дысцыпліне першага года навучання за амерыканскімі студэнтамі замацаваны выкладчыкі, якія дасканала валодаюць англійскай мовай. А для аператыўнай сувязі са студэнтамі выкладчыкам былі выдадзены планшэты. Такім чынам у амерыканскіх студэнтаў будзе магчымасць рэгулярна атрымліваць кансультацыі ў беларускіх выкладчыкаў.

Для даведкі: насельніцтва Чыкага складае 10 мільёнаў чалавек, з іх 500 тысяч — гэта імігранты, у тым ліку і імігранты з краін былога Савецкага Саюза.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 420/С-4690 (назначение – здание административно-хозяйственное) общей площадью 1003,8 кв.м. Составные части и принадлежности:<br>- забор – металлическая сетка с воротами 76 м;<br>- площадка асфальтобетонная 866 кв.м;<br>- борт дорожный 205 м.п;<br>- борт тротуарный 595 м.п;<br>- водопроводная сеть 168,58 м;<br>- канализационная ливневая сеть L-4, 74 м;<br>- канализационная внутридворовая ливневая сеть 44, 66 м;<br>- подземная кабельная линия 36, 72 м;<br>- сеть фекальной канализации 323, 42 м;<br>- тепловая сеть 113,44 м (трубы стальные) |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская область, Лидский р-н, Третьяковский с/с, р-н д. Островля |
| **Земельный участок** | Кадастровый № 423685400030000038, площадью 0,7723 га (назначение – земельный участок для обслуживания объектов промышленности) |
| **Обременения** | Сдано в аренду помещение площадью 12,5 кв.м под офис до 31.12.2013 г. |
| **Начальная цена продажи** | 1 935 667 098 (один миллиард девятьсот тридцать пять миллионов шестьсот шестьдесят семь тысяч девяноста восемь) белорусских рублей **без учета НДС** |
| **Сумма задатка** | 193 566 710 (сто девяносто три миллиона пятьсот шестьдесят шесть тысяч семьсот десять) белорусских рублей |
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | Капитальное строение, инв. № 420/С-4684 (назначение – здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей, в т.ч. заправочные и газонаполнительные станции), общей площадью 1307,2 кв.м. Составные части и принадлежности:<br>- забор – металлическая сетка с воротами 144 м;<br>- площадка бетонная 1428 кв.м;<br>- борт дорожный 348 м.п;<br>- водопроводная сеть 83 м;<br>- канализационная внутридворовая ливневая сеть 134,22 м;<br>- подземная кабельная линия 82 м;<br>- сеть фекальной канализации 162,34 м;<br>- тепловая сеть 25,16 м (трубы стальные) |
| **Местонахождение объекта** | Гродненская область, Лидский р-н, Третьяковский с/с, 38 |
| **Земельный участок** | Кадастровый № 423685400030000055, площадью 0,6161 га (назначение – земельный участок для обслуживания объектов промышленности) |
| **Обременения** | Сдано в аренду до 05.09.2014 г. |
| **Начальная цена продажи** | 3 756 201 962 (три миллиарда семьсот пятьдесят шесть миллионов двести одна тысяча девятьсот шестьдесят два) белорусских рубля **без учета НДС** |
| **Сумма задатка** | 375 620 196 (триста семьдесят пять миллионов шестьсот двадцать тысяч сто девяносто шесть) белорусских рублей |
| **Продавец** | ОАО «Лида-агротехсервис» 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 17, тел. 8 0154 54 27 52 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34 |
| **Условия аукциона** | Без условий |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 25 октября 2013 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Лида, ул. Фурманова, 17, актовый зал**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Извещение о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 07.09.2013 г.**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 21 октября 2013 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки».**

## УРИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ГОМЕЛЬСКОГО РАЙОНА

### 20 ноября 2013 года в 15.00 проводит открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилого дома

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Инженерная инфраструктура | Расходы по подготовке | Начальная цена земельного участка (руб.) | Задаток (руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Урицкий с/с, аг. Урицкое, ул. Рабочая, участок № 45** | 321089602105000036 | 0,1500 га | Электроснабжение, водопровод | и расходы за опубликование в СМИ | 42 480 000 | 4 248 000 |

**Аукцион состоится по адресу: Гомельский район, аг. Урицкое, ул. Ятченко, д. 3, зал заседаний Урицкого сельисполкома 20.11.2013 в 15.00.**

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток в размере, порядке и срок, определенные в извещении.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (на расчетный счет с отметкой банка).

3. Гражданином — копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1. Представителем гражданина — нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан — документ, удостоверяющий личность.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5%).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона или единственным участником аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протоколов о результатах аукциона.

Задаток за участие в аукционе перечисляется на расчетный счет № 3600414230241 Урицкого сельского исполнительного комитета, ЦБУ № 305 филиала 302 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Гомель, ул. Барыкина, 94, МФО 151501664, УНП 400178472, код платежа 04901.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Урицкое, ул. Ятченко, 3, Урицкий сельский исполнительный комитет с даты опубликования извещения по 15 ноября 2013 года с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.30. Все желающие могут ознакомиться с документацией в Урицком сельском исполнительном комитете.

**Контактные телефоны: (8 0232) 988 291, 988 293.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 22 ноября 2013 г. АУКЦИОНА по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Знаменском сельском Совете Брестского района Брестской области

| № лота | Местоположение и кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, регистрацию земельного участка, руб. | Целевое назначение земельного участка |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | аг. Знаменка, ул. Приозерная, 17, 121280803101000708 | 0,1597 | 10 592 300 | 1 059 200 | 4 408 300 (возмещение расходов на объявления по акту выполненных работ) | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома |

Земельный участок, расположенный в аг. Знаменка, ул. Приозерная, 17. Ограничений в использовании земель не установлено. Подъезд к участку осуществляется по существующей дороге, расстояние от асфальтированной дороги до участка 150 м, есть возможность подключения к газу.

**Аукцион будет проводиться 22 ноября 2013 г. в 11.00 по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (в здании сельисполкома).**

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Знаменского сельисполкома № 3600 21303 0031 в ф-ле 100 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 150501246, УНП 200036617, код платежа 4901, суммы задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (в здании сельисполкома) с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений 18.11.2013 г. до 17.00.**

**Контактные телефоны: (8 0162) 95 51 35, 95 51 36, 95 51 37.**

## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в населенных пунктах дер. Переездная, дер. Сосновая, дер. Ляды, дер. Прилепы Озерицко-Слободского сельсовета Смолевичского района Минской области

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2 | **Дата, время и место проведения аукциона** | **19 ноября 2013 года, в 11.00, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27, Озерицко-Слободской сельисполком, зал заседаний** |
| 3 | **Продавец и его адрес** | Озерицко-Слободской сельисполком, аг. Слобода, ул. Красногвардейская, 27 |
| 4 | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | Лот № 1 — площадь 0,1346 га (по генплану № 4), № 624883008101000114, дер. Переездная.<br>Лот № 2 — площадь 0,1383 га (по генплану № 5), № 624883008101000113, дер. Переездная.<br>Лот № 3 — площадь 0,1448 га (по генплану № 9), № 624883008101000108, дер. Переездная.<br>Лот № 4 — площадь 0,1175 га (по генплану № 5), № 624883010101000388, дер. Сосновая (ограничение в использовании — охранная зона линии электропередачи).<br>Лот № 5 — площадь 0,1000 га, № 624885003601000014, д. Ляды.<br>Лот № 6 — площадь 0,1510 га, № 624885004601000321, д. Прилепы |
| 5 | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6 | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания жилого дома |
| 7 | **Начальная (стартовая) цена продажи** | **Лот № 1** — 100 000 000 рублей. **Лот № 2** — 100 000 000 рублей.<br>**Лот № 3** — 100 000 000 рублей. **Лот № 4** — 100 000 000 рублей.<br>**Лот № 5** — 50 000 000 рублей. **Лот № 6** — 150 000 000 рублей |
| 8 | **Условия аукциона** | А) продажа по цене не ниже начальной;<br>Б) участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь |
| 9 | **Наличие инженерной инфраструктуры** | дер. Переездная — подъездные дороги, электричество;<br>дер. Сосновая — подъездные дороги;<br>дер. Ляды — подъездные дороги, электричество;<br>дер. Прилепы — подъездные дороги |
| 10 | **Условия оплаты** | За безналичный расчет в течение 10-ти рабочих дней после подписания протокола по результатам проведения аукциона |
| 11 | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной (стартовой) цены земельного участка, р/с 3641000000058 ЦБУ 621 г. Смолевичи филиал 616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, код 812, назначение платежа 04002 (с пометкой «задаток за земельный участок»). УНП 600046563 (МФО 153001812) |
| 12 | **Порядок предв. ознаком. в натуре с земельными участками** | Среда в 11.00 |
| 13 | **Прием документов** | В рабочие дни: понедельник, вторник, среда, четверг, пятница с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |
| 13 | **Окончательный срок приема документов** | 13 ноября 2013 года в 17.00 |
| 14 | **Контактные телефоны** | 8 01776 44 636, 68 030 |

Расходы по организации и проведению аукциона, затраты на публикацию информационного сообщения, подлежат возмещению победителем аукциона.

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков).

3. Физическим лицам — документ, удостоверяющий личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица, доверенность, заверенную нотариально (в случае, если интересы покупателя представляет это лицо).

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27. № 31 (489)

# ЯГАДНЫЯ КУСТЫ НА ШТАМБЕ

**Пры разрастанні кустоў агрэста, чырвоных і чорных парэчак галіны іх часта кладуцца на зямлю. Каб пазбегнуць такой сітуацыі, ягадныя кусты вырошчваюць ў выглядзе маленькага дрэўца — у штамбавай і паўштамбавай форме. Вышыня штамбіка складае 60-110 см, паўштамбіка — 40—60 см. Штамбавая форма зручная ва ўмовах невялікага ўчастка. Крона лепш праветрываецца і асвятляецца, яе зручна рэгулярна абразаць. Куст менш пашкоджваецца грыбнымі хваробамі, ягады буйнейшыя, ярчэйшыя, смачнейшыя. Збор ягад з такога дрэўца — адна любата. І яшчэ адзін козыр: штамбавыя ягадныя расліны вельмі дэкаратыўныя, упрыгожаць любы ўчастак.**

Гэты спосаб гадоўлі ягаднікаў даўно і шырока ўжываюць у Заходняй Еўропе, а ў нас яго сталі выкарыстоўваць толькі асобныя садоўнікі-аматары.

У сярэдняй паласе, нягледзячы на дастатковую зімаўстойлівасць штамбавых раслін, іх лепш размяшчаць у абароненых участках саду. Нядрэнна прадугледзець выкарыстанне простых схованак на зіму. Можна выкарыстоўваць і прыгінанне такіх раслін да зямлі позняй восенню, як гэта практыкуюць для штамбавых руж.

## Агрэст на штамбах

У штамбавай форме агрэст вырошчваюць шляхам прышчэпкі ці на ўласных каранях. У якасці прышчэпы выкарыстоўваюць парэчкі залацістую ці саджанцы агрэсту. Прышчэпы парэчак залацістых вырошчваюць 1-2 гады з тронкаў, якія ўкаранелі, ці адводкаў. Калі парэчкі размнажваюць вясновым пасевам насення, іх папярэдне стратыфікуюць на працягу 2-4 месяцаў у халадзільніку.

Вырашчаныя прышчэпы саджаюць у канцы верасня — другой дэкадзе кастрычніка, але можна гэта зрабіць і ўвесну. Саджаюць расліны на 5-8 см глыбей, чым яны раслі дагэтуль. Пасля пасадкі добра паліваюць, мульчыруюць торфам ці перагноем. Пасля высадкі саджанца парэчак залацістых з 2-3 галінак пакідаюць адну — найбольш моцную і прамарослую. Пакінутая галінка да восені павінна некалькі перавышаць вызначаную вышыню штамба. Бакавыя парасткі, якія з'яўляюцца на ёй улетку, прышчыпваюць, што спрыяе патаўшчэнню стволіка.

## Прышчэпка

Прышчапляць агрэст можна ўлетку, узімку ці ўвесну. Улетку — у трэцяй дэкадзе ліпеня ці на пачатку жніўня спосабам бакавой прышчэпкі за кару. У нарыхтаваных добра выспелых парасткаў сякатарам выдаляюць шыпы і лісце, пакідаючы ўкарачаныя хвосцікі. Чаранок з 3-5 пупышкамі ніжнім касым зрэзам даўжынёй 3-4 см устаўляюць у Т-падобны разрэз кары прышчэпы. Для зімовай прышчэпкі прышчэпы выкопваюць увосень і захоўваюць іх у склепе ў скрынях з вільготным торфам, пілавіннем ці пяском пры тэмпературы, блізкай да 0°С. З восені нарыхтоўваюць і ў такіх жа ўмовах захоўваюць чаранкі агрэсту. Зімовую прышчэпку праводзяць у канцы лютага — пачатку сакавіка ў памяшканні, седзячы за сталом. Прышчэпленыя кампаненты для зрастання ўкладваюць у скрыні, запоўненыя сумессю пяску і торфу (1:1), і два тыдні ўтрымліваюць пры тэмпературы 18-20 °С. Пасля гэтага скрыні зноў пераносяць у халодны склеп, дзе захоўваюць да пасадкі. З пачаткам пасадачных работ прышчэпленыя высадкі саджаюць на сталае месца. Увесну прышчэпку праводзяць пры пачатку сакаруху. Можна да адной прышчэпы прышчапіць некалькі гатункаў агрэсту з рознай афарбоўкай — атрымаецца асабліва арыгінальная і прыбраная расліна.



## Фарміроўка

Атрымаць прыгожую сферычную крону дапаможа правільнае абразанне. Да канца першага ці другога года пасля пасадкі закладваюць 4-6 асноўных галін: адна — цэнтральная, астатнія — раўнамерна размешчаныя па крузе. Цэнтральную галіну кароцяць мінімальна (на 1/4—1/8 гадавога прыросту), астатнія кароцяць некалькі больш, імкнучыся надаць кроне круглявую форму. У наступныя гады на кожнай галіне пакідаюць па 4 бакавыя разгалінаванні, якія кожны год кароцяць пры дасягненні даўжыні каля 20 см. Да 4-5 гадоў крона дасягае вызначанай формы.

Штамбавы агрэст ва ўзросце 7-8 і нават 10 гадоў дае добрыя ўраджаі, але па меры старэння і падмярзання галін іх даводзіцца замяняць маладзейшымі. Штамбавы агрэст абавязкова павінен быць падвязаны да кала, які ўсталёўваюць пры пасадцы. У штамбавай форме можна вырошчваць любы гатунак, але галоўнай умовай павінна быць высокая зімаўстойлівасць галін і кветкавых пупышак.

## На сваіх каранях

Пры вырошчванні штамбавага агрэсту без прышчэпкі (на ўласных каранях) у пасаджанага на сталае



месца першагатунковага саджанца пакідаюць адзін, найбольш магутны, прамарослы аднагадовы парастак, астатнія выразаюць каля паверхні глебы. Пры пасадцы ў пасадачную яму адразу забіваюць кол патрэбнай вышыні і да яго падвязваюць пакінуты пасля абразання парастак. На наступны год на ім выдаляюць усе бакавыя разгалінаванні да вышыні 60-110 см, а на самым версе пакідаюць 4-6 парасткаў. У далейшым на кожных пакінутых парастках захоўваюць 4 бакавыя разгалінаванні. Круглявую крону фарміруюць таксама, як у прышчэпленых раслін.

## Парэчкі змяняе форму

Чырвоныя парэчкі часцей за чорныя выкарыстоўваецца для вырошчвання раслін у штамбавай форме. У яе таксама могуць быць штамбавыя і паўштамбавыя формы; у першым выпадку вышыня штамба 60—110 см, у другім — 40—60 см. Такія расліны атрымліваюць, выкарыстоўваючы прышчэпкі на парэчкі залацістыя, ці фарміруюць штамбавыя формы са звычайных саджанцаў, як для раслін агрэсту. Іншы цікавы спосаб — на аднасцябловы саджанец перад пасадкай, каб не выдаляць пупышак на штамбе, трэба надзець «футарал» — святлонепранікальную поліэтыленавую трубку дыяметрам каля 3 см. Верхні яе канец пакажа вышыню штамба сталай расліны. Высаджваючы на сталае месца расліну, трубку заглыбляюць у глебу на 8-10 см. Чорныя парэчкі таксама можна выгадоўваць у штамбавай форме. Прычым пры пасадцы зручнейшыя аднагадовыя саджанцы, выгадаваныя з аднапупышкавых чаранкоў, бо пры далейшым росце куст не ўтворыць нулявых парасткаў. Праз 5 гадоў таўшчыня штамба дасягае 4-5 см, шкілетныя галіны пачынаюць старэць, і іх паступова выразаюць, пакідаючы адну-дзве пупышкі, дзякуючы чаму крона зноў абнаўляецца галінамі.

## З аглядкай на зіму

На штамбаўтваральнік робіцца прышчэпка чаранка патрэбнага гатунку ў праваднік на вышыні 1-1,2 м ад зямлі, што дазваляе вынесці крону малазімастойкага гатунку ў зону больш спрыяльнага мікраклімату.

Аднак, нягледзячы на ўсе довады на карысць штамбавага дрэўца ягаднікаў, неабходна праверка нязвыклага спосабу фарміравання. У першыя часы для засваення навінкі досыць папрактыкавацца на 1-2 кустах. Ва ўсякім разе «страхавы фонд» са звычайных кустоў, якія зімуюць пад снегам, трэба мець заўсёды!

## Незвычайная гародніна і садавіна

# ЖОЎТЫ КАВУН

З выгляду гэта звычайны паласаты кавун, толькі ўсярэдзіне ён ярка-жоўты. Але ў дадатак да нязвыклай афарбоўкі ў гэтага кавуна вельмі мала, у параўнанні са звычайным, костачак. Такі кавун з'явіўся на свет у выніку скрыжавання дзікага кавуна, які якраз жоўтага колеру (праўда, есці яго немагчыма), са звычайным. І зараз



круглыя жоўтыя кавуны вырошчваюць улетку ў Іспаніі, а авальныя — узімку ў Тайландзе. Дарэчы, там жоўтыя кавуны асабліва паважаюць, бо, паводле тайскіх павер'яў, жоўты колер прыцягвае грошы. Кавун гэты далікатны і салодкі — праўда, не такі салодкі, як чырвоны. Ёсць жоўты кавун і ў Расіі, называецца «Месяцовы». Расійскі гатунак вельмі салодкі і з экзатычным прысмакам, з нагоды якога меркаванні разыходзяцца: ці то гэта лімон, ці то манга, ці то гарбуз. Украінскім селекцыянерам пашанцавала менш, чым расійскім. У выніку скрыжавання яны атрымалі гібрыд пад назвай «кавбуз», які ўзяў ад кавуна толькі водар, а ўсім астатнім пайшоў у гарбуз. Яго лепш за ўсё выкарыстоўваць для прыгатавання кашы.

■ Інфарм-укол

# ПАДАГРА: ШТО РАБІЦЬ, ЧАГО НЕ РАБІЦЬ

**Некалі думалі, што ад гэтага захворвання пакутуюць багатыя людзі, якія ўжываюць вялікую колькасць мяса, тлустай рыбы ды спіртных напояў. Аднак час абверг гэта меркаванне. Сёння ад падагры церпяць людзі рознага дастатку. Мужчыны — часцей за жанчын. Пік захваральнасці прыпадае на 40-50 гадоў у мужчын і пасля 60-ці — у жанчын.**

Падагра звязана з парушэннем абмену рэчываў, тлумачыць **урач-рэўматолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Алена СІДАРОВІЧ.** Павышэнне мачавой кіслаты ў крыві, адкладанне ўратаў у тканках суставаў і вакол іх выклікае запаленне. Вялікая колькасць мачавой кіслаты ў арганізме можа быць па дзвюх прычынах: калі гэту незвычайна вялікую колькасць мачавой кіслаты здаровыя ныркі не паспяваюць выводзіць або калі мачавая кіслата выпрацоўваецца ў нармальнай колькасці, аднак ныркі аказваюцца не ў стане вывесці яе.

**СЯРОД СПАДАРОЖНЫХ ФАКТАРАЎ МОГУЦЬ БЫЦЬ ТАКІЯ:**

- схільнасць да ўжывання мяса, алкаголю, асабліва піва і віна;
- сталы ўзрост;
- фізічныя перагрузкі, у тым ліку і статычныя (цесны абутак);
- пераахалоджванне;
- прыём прэпаратаў: аспірыну, дыўрэтыкаў, высокія дозы вітаміну $B_{12}$, гепарын (унутрывенна);
- свінцовая інтаксікацыя.

У вострага прыступу падагры вельмі характэрныя сімптомы. Раптоўна, часцей ноччу, з'яўляецца рэзкі боль у суставе вялікага пальца адной са ступняў. Хутка сустаў прыпухае, скура над ім чырванее, становіцца сінявата-барвовай, гарачай, бліскучай, напружанай. Гэта дасягае максімуму за некалькі гадзін і суправаджаецца гарачкай (часам тэмпература павышаецца да 40 градусаў), лейкацытозам, павелічэннем такога паказчыку, як хуткасць асядання эрытрацытаў. Боль досыць пакутны, узмацняецца нават пры судакранання хворага сустава з коўдрай. Праз 5-6 дзён прыкметы запалення паступова заціхаюць.

Прыступы падагрычнага артрыту могуць паўтарацца праз розныя прамежкі часу — некалькі месяцаў ці нават гадоў. Паміж прыступамі хворы звычайна адчувае сябе добра і не прад'яўляе скаргаў. З цягам часу перыяды паміж прыступамі становяцца ўсё карацейшымі. З'яўляюцца дэфармацыі, тугарухавасць суставаў, развіваецца другасны астэаартроз.

Характэрнае для падагры адкладанне ўратаў пад скурай, з'яўленне шчыльных падагрычных вузлоў (тофусаў). Яны развіваюцца ў сярэднім праз 6 гадоў пасля першага прыступу, але ў некаторых выпадках і раней. Памеры іх бываюць рознымі — да памеру невялікага яблыка. Размяшчаюцца тофусы на вушных ракавінах, вакол суставаў, часцей за ўсё локцевых, а таксама каленных, на стопах (вялікі палец, тыл стапы, пятка), кісцях — вакол дробных суставаў і на мякацы пальцаў.

**ПАМЯТКА**

**1.** Асноўнае правіла — ужыванне прэпаратаў, якія зніжаюць узровень мачавой кіслаты, і перыядычны яе лабараторны кантроль.

**2.** Ніколі самастойна не спыняйце прыём лекаў. Рэзкая адмена прэпарата можа прывесці да абвастрэння падагры.

**3.** Вытрымлівайце дыету. Важна не пераядаць, але і не галадаць. Пры неабходнасці рабіце разгрузачныя дні раз на тыдні (гароднінныя, фруктовыя).

**4.** Беражыце суставы ад траўмаў. Не насіце вузкі абутак, які можа справакаваць прыступ.

**5.** Пазбягайце пераахалоджання і прастуды.

**6.** Кантралюйце артэрыяльны ціск. Калі ў дадатак да падагры ў хворага высокі артэрыяльны ціск, ён падвяргаецца двайной рызыцы.

**ЧАС АД ЧАСУ АБВАСТРЭННЮ ПАДАГРЫ БУДУЦЬ СПРЫЯЦЬ:** ужыванне алкаголю і тлустай ежы, фізічныя нагрузкі, траўмы, хірургічныя ўмяшанні, кровацячэнні, розныя вострыя захворванні, уключаючы інфекцыйныя, прыём некаторых лекаў, прамянёвая тэрапія.

Дыягностыка ажыццяўляецца на падставе клінічных сімптомаў або паталагічных праяў захворвання. Падчас абследавання неабходна здаць агульны аналіз крыві, агульны аналіз мачы, біяхімічны аналіз крыві (наяўнасць мачавой кіслаты), рэнтгенаграфія хворага сустава, даследаванне сінавіяльнай вадкасці.

Лячэнне, як правіла, пажыццёвае. Прымяняецца медыкаментознае і немедыкаментознае лячэнне. Шырока распаўсюджана фізіялячэнне. У некаторых выпадках звяртаюцца і да хірургічнага ўмяшання.

Падчас вострага прыступу рэкамендуецца ложкавы рэжым, холад на сустаў, а пры заціханні болю — сагравальны кампрэс, ужыванне дастатковай колькасці вадкасці: да 2,5 л у дзень вады, фруктовых сокаў, мінеральнай вады (есентукі, нарзан, баржомі, смірноўская).

Пры адсутнасці прыступу — актыўны лад жыцця, прагулкі, лячэбная фізкультура, фізіятэрапія, масаж. Харчаванне павінна быць досыць умераным, з адмовай ад спіртнога. З ежы варта выдаліць вэнджанае, каўбасы, закусачныя кансервы, печань, ныркі, мазгі, смажанае мяса і рыбу, шчаўе, шпінат, радыску, гарох, бабы, фасолю, булёны і мясныя супы. Ежа хворага павінна быць пераважна малочная, з гароднінай (акрамя пералічанай вышэй) і фруктамі. Два разы на тыдні дазваляецца варанае мяса і рыба.

Нясвоечасовы пачатак лячэння або яго перарыванне пагражае ўскладненнямі: паражэннем нырак, парушэннем функцыі нырак, развіццём мочакаменнай хваробы.

Святлана БАРЫСЕНКА




Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Астанкіна. Амяла. Ружа. Ястык. Рубка. Ананд. Рака. Палацёр. Аполак. Каса. Балык. Выбары. Шадр. Дон. Агурок. Салата. Лава. Гума. Аск. Літара. Морыд. Апад. Жаба. Халат. Жукаў. Стараста. **Па вертыкалі:** Місісіпі. Квас. Мурэй. Волга. Шулер. Луара. Янцзы. Довад. Каркас. Тар. Ахун. Камарын. Абак. Указ. Палас. Ніл. Аўт. Абардаж. Салдат. Лыка. Аброк. Лот. Каларада. Бакас. Ротар. Акарына. Арбіта.

■ На слыху

# КІШЭННІКА ЗАТРЫМАЛІ НА ВЫХАДЗЕ З МЕТРО

**Ім аказаўся раней судзімы за крадзяжы 25-гадовы жыхар Брэста, які падазраецца ў здзяйсненні кішэнных крадзяжоў у грамадскім транспарце.**

Паводле інфармацыі Цэнтральнага РУУС г. Мінска, напачатку малады чалавек украў кашалёк у пасажыра тралейбуса і хутка пакінуў салон. «Здабыча» аказалася невялікай, таму зламыснік вырашыў спусціцца ў метро. Ён выбраў у поездзе самы запоўнены — першы — вагон і пакінуў яго на наступнай станцыі з кашальком, які выцягнуў з сумкі жанчыны. Пры выхадзе міліцыянеры затрымалі падазраванага. Цікава, што пра крадзеж кашалька пацярпелая даведалася ад міліцыянераў. А ў ім, дарэчы, акрамя салідной сумы грошай, былі яшчэ залатыя ўпрыгажэнні, банкаўскія карткі і дакументы. Зараз затрыманага правяраюць на дачыненне да іншых аналагічных злачынстваў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## УСМІХНЕМСЯ

**З любога халасцяка праз пару гадоў атрымліваецца выдатны пельменны крытык.**

— Ты на шпагат можаш сесці?
— Я на дыету не магу сесці, а ты кажаш — «на шпагат»...

**Хацеў адкрыць таямніцу свайго прозвішча, цяпер хачу адкрыць таямніцу мінус 100000 рублёў на тэлефоне.**

Жонка, збіраючыся ў камандзіроўку, навучае мужа:
— Глядзі, каб на кухні парадак быў, а то куча посуду зноў будзе!
— Добра!
— Пыласось хоць раз на тыдзень!
— Зразумеў.
— І каб з бабамі не гуляў!
— Як скажаш.
— А то бруду назбіраеш ўсякага!
— Дык у яе душ...

**У сучасным рускім тэатры галоўным і самым цяжкім жанрам з'яўляецца не камедыя, трагедыя або драма, а рамонт.**



caricatura.ru

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.41 | 18.08 | 10.27 |
| Віцебск — | 7.33 | 17.55 | 10.22 |
| Магілёў — | 7.31 | 17.58 | 10.27 |
| Гомель — | 7.25 | 17.57 | 10.32 |
| Гродна — | 7.56 | 18.23 | 10.27 |
| Брэст — | 7.54 | 18.26 | 10.32 |

**Месяц**

*Поўня ў 14.13.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

**Імяніны**

**Пр.** *Архіпа, Давыда, Дзмітрыя, Івана, Канстанціна, Кірылы, Міхаіла, Усевалада.*
**К.** *Канстанцыі, Эміліі, Леапольда, Тодара, Януара.*

# ЗАЎТРА






Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Даты | Падзеі | Людзі

**1908** год — нарадзіўся (вёска Старынцы, цяпер Полацкі раён) Павел Емяльянавіч Купрыянаў, першы беларус, які ўдастоены звання Героя Савецкага Саюза (1936). З 1929 года — у Чырвонай Арміі, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. З кастрычніка 1936-га — удзельнік грамадзянскай вайны 1936-1939 гадоў у Іспаніі на баку рэспубліканцаў, камандзір танка. Вызначыўся пад Мадрыдам, знішчыўшы са сваім экіпажам два варожыя танкі, восем гармат, некалькі дзясяткаў салдат праціўніка. Загінуў у баі ў 1936 годзе.

**1917** год — расійскі імператар Мікалай II выпусціў маніфест «Аб удасканаленні дзяржаўнага парадку». Дакумент, які быў падрыхтаваны графам Сяргеем Віто і ўвайшоў у гісторыю як маніфест 17 кастрычніка, меў велізарнае значэнне для Расіі. Пад ціскам рэвалюцыйнай сітуацыі, якая ўжо склалася на той момант, Мікалай II дэклараваў падданым імперыі палітычныя і грамадзянскія правы, адмяняў цэнзуру ў сродках масавай інфармацыі, дазволіў прафсаюзы, шматпартыйнасць. Згодна з гэтым маніфестам, у Расіі была склікана Дзяржаўная Дума — першы вопыт расійскага парламентарызму.




**1947** год — нарадзіўся (вёска Мілейкі Івацэвіцкага раёна) Анатоль Сяргеевіч Пархута, заслужаны архітэктар Беларусі (1999). Сярод работ: генпланы гарадоў Ліда, Смаргонь, Навагрудак, праекты рэгенерацыі гістарычнага цэнтра Гродна, Лядовага палаца ў Гродне. Адзін з аўтараў інтэр'ераў Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, чыгуначнага вакзала, кінатэатра «Кастрычнік», гасцініцы «Амега» ў Гродне. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998).

Было сказана

**Арцём ВЯРЫГА-ДАРЭЎСКІ, паэт, драматург, публіцыст:**

*«Дзейнічай, працуй, аб'ядноўвай вузлом любові, вучы славіць Бога, любіць суайчыннікаў і маці-радзіму».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (першы намеснік дырэктара—галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 23.185. Індэкс 63850. Зак. № 4528.

Нумар падпісаны ў 19.30 16 кастрычніка 2013 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12